№ 35 (393) 24 верасьня 2004 www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

УСЁ ПРА ВЫБАРЫ

Хто дзе ідзе

Інтарэсы ўладных кланаў сутыкнуліся. — Буш выбраў кандыдатаў ад дэмакратаў. — Беспрацоўны Канаплёў. — Самая дэмакратычная акруга. — Ці будзе дэпутат ад пратэстантаў? — Сацыялістка супраць сьпікера. — Як рэзалі Ганчарыка. — Ад вэртыкалі і ад ЛДПБ на адцяжку. — Ня кожны бізнэсовец можа кіраваць дзяржавай. — Незарэгістраваны Ўсевалад Янчэўскі. **Старонкі 3—6.**

2001-ы не паўторыцца

Гутарка зь Вінцуком Вячоркам.

старонка 4

Слоўнік скептыка

Новая рубрыка «НН».

старонка 15

Рэфэрэндум у Сеціве

выйграў Вольскі.

старонка 15

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Вуліца 17 Кастрычніка

«Калі прайграю — сумленна падзякую народу і пайду», — паабяцаў Аляксандар Лукашэнка ў Ваўкавыску на «Дажынках». А.Лукашэнка ня проста ўпершыню ў сваім жыцьці прайграе, а прайграе разгромна. Падтрымліваюць скасаваньне «правіла двух тэрмінаў» 23% выбарцаў, супраць адмены абмежаваньня выступаюць 52,8%. Гэтыя апошнія з наяўных незалежных сацыялягічных зьвестак (Балтыйская сацыялягічная служба), праўда, адносяцца да жніўня. Верасьнёўскіх зьвестак пакуль няма. Але А.Лукашэнка ня хоча прайграць прыгожа, ён працягвае змагацца за тых, хто ня вызначыўся, мабілізуе паліттэхнолягаў, рыхтуе адмінрэсурс. **Старонка 5.**

СПОРТ

Паралімпіяда: прыклад для кожнага

17 верасьня ў Атэнах стартавалі XII летнія Паралімпійскія гульні. Удзел у іх бяруць больш за 4000 спартоўцаў з 136 краін, якія разыграюць 519 узнагарод. **Старонка 6.**

АЛЕНА АДАМЧЫКА

Беларускае хараство

Беларускі славяцца прыгажосьцю. Аднак хараство безабароннае перад ахвотнымі скарыстацца ім. Невыпадкова фінал сёлетняга конкурсу прыгажосьці прыпадае на рэфэрэндумную кампанію, разам з «Дажынкамі» і вайсковымі манэўрамі. Міс Беларусі коштам 550 даляраў — старонка 8. **Тайная і яўная ўлада** — старонка 9. **Беларускі тыпаж хараства** — старонка 10. **«Беларускі», новая кніга Алены Адамчык** — старонка 2.

НЕ КАЖЫ «ТАК»

Навіна ў нумар

Сёньня прэзыдэнт Беларусі падпісаў указ аб тым, што кіраўніком дзяржавы можа стаць толькі той чалавек, які мае досьвед працы на гэтай пасадзе. (Жарт.)

Зьміцер Панкавец, Барысаў

Пра рэфэрэндум — **старонка 13.**

З УСІХ СТАРОН

Што зь Юшчанкам

Стан лідэра ўкраінскае апазыцыі Віктара Юшчанкі, атручанага 9 верасьня, застаецца няпэўным. Штаб кандыдата два тыдні хаваў інфармацыю пра ягонае здароўе, каб не зрываць выбарчай кампаніі, пакуль В.Юшчанка знаходзіўся ў шпіталі ў Вене. 18 верасьня прэтэндэнт на пасаду прэзыдэнта перарваў лячэньне, каб выступіць у Кіеве на 70-тысячным мітынгу, але трымаўся ён блага: тваравы нэрв застаецца паралізаваны, самаадчуваньне кепскае — як вынік крывацечных эрозій у страўніку, паражэньняў тоўстае кішкі і скуры.

Аўстрыйскія мэдыкі, якія апекаваліся лідэрам «Нашай Украіны», назвалі магчымую прычыну дзіўнае сымптаматыкі — атручваньне малой дозай рыцыну, рэчыва, якім у 1978 г. быў забіты адзін з баўгарскіх дысыдэнтаў. У «Нашай Украіне» кажуць, што ведаюць, «хто атруціў В.Юшчанку, дзе і калі», але канкрэтных імёнаў пакуль не называюць.

В.Юшчанка застаецца ўпэўненым лідэрам рэйтынгаў.

МБ

Да 25 верасьня

падоўжаная падпіска на чацьверты квартал. «Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.

СЬМЕХ

СЯРГЕЙ ХАРЭЙСКІ

...І раз!.. І два!..

І ў фізпадрыхтоўцы вэртыкаль

«Ва Ўзброеных Сілах фармуецца новая сыстэма фізпадрыхтоўкі», — заявіў Леанід Мальцаў. «Рэформа ўключае ў сябе стварэньне «вэртыкалі» кіраўніцтва фізпадрыхтоўкай — ад старшыні армейскага спорткамітэту да інструктара асобнага батальёну. Да 1 сьнежня 2005 г. даручана распрацаваць новае настаўленьне па фізпадрыхтоўцы ваеннаслужачых. У ім будуць, у прыватнасьці, перагледжаны разьдзелы, прысьвечаныя падрыхтоўцы афіцэраў старэйшых узроставых груп».

ГАСПАДАРКА

ПДВ у краіну прызначэньня: каму карысьць

PHOTO.BYMEDIA.NET

Калі Расея пры гандлі зь Беларусяй пагодзіцца на спагнаньне ўскосных падаткаў па краіне прызначэньня без выключэньня ў дачыненьні да энэрганосьбітаў, наша краіна выйграе. Адпаведную ўгоду падпісалі ў Астане прэм'еры **Сідорскі (на здымку)** і Фрадкоў. Сальда нашага гандлю з усходнім суседам стабільна адмоўнае. Такі дысбалянс абумоўлены вялікай доляй энэрганосьбітаў у імпарце расейскіх тавараў. ПДВ з розьніцы паміж імпартам і экспартам — $300 млн — застанецца ў беларускім бюджэце.

Яўген Лагоўскі

АКЦЭНТ

Рок без свабоды

Акцыя «Рок за свабоду» 17 верасьня на плошчы Бангалор ставіла на мэце прыцягнуць увагу да лёсу беларускіх музыкаў, якіх забаранілі на ТВ і радыё. Плюс лічба «17» прымушала задумацца. Але ўся ўвага гледачоў была скіраваная на расейскую рок-зорку **Вячаслава Бутусава (на здымку)**, які ані слова не сказаў пра свабоду, пра беларускіх музыкаў. Словаў падтрымкі таксама не было чуваць.

За некалькі хвілін да пачатку канцэрту мікрааўтобус з Бутусавым пад аховай амапаўцаў пад'ехаў да сцэны, на якой якраз у гэты час «тоўпіліся» некалькі «забароненых» беларускіх музыкаў (Вольскі, Памідораў, Філ з «Drum Xtc», Белякоў з «Палацу»). Іхняе агульнае пасланьне наконт таго, што беларускую песьню ня зломіш, наўрад ці дайшло да асноўнай часткі глядацкай аўдыторыі, бо тая клікала на сцэну экс-«Наутилуса». І вось загучаў вядомы хіт «Гібралтар-Лабрадор» з блякбастэру «Брат». Беларуская песьня ў гэты момант была забытая. Нашы музыкі пасьля прамовы рушылі ў бок д/с Кульман, і больш іх не было відаць. Затое беларускіх палітыкаў на акцыі быў сьвет: Лябедзька, Калякін, Сіўчык вымушаны былі слухаць, як Бутусаў млява сьпявае пра маторнае каханьне.

Празь дзьве гадзіны ўсе разышліся зь песьняй на вуснах. Праўда, песьня тая была ня наша.

Сяргей Будкін

БІБЛІЯТЭКА

Кніга лёсаў



Алена Адамчык. Беларускі. — Менск: «Сучасны літаратар», 2004. — 168 с.

Пытаньне «што нам у гэтых жанчынах?» ня ставіцца ў прынцыпе. Падгледзець за чужым жыцьцём заўжды цікава. Асабліва калі інструмэнт вуаерызму — аб'ектыў самага стылёвага жаночага фатографа краіны. Расповед у маналёгах і фатаздымках пра жыцьцё дванаццаці пасьпяховых кабетаў наўпрост ні да чога не абавязвае, але па меры прагляданьня поўніць сьветлай энэргіяй, жаданьнем дзейнічаць, рэалізаваць сябе празь сям'ю, творчасьць, працу. У жанок — з пачуцьця здаровай спартовай зайздрасьці, у мужчыны — дзеля ўсьведамленьня ўласнае паўнавартаснасьці.

У гераінях — нуль правінцыялізму. Нуль жлобскае мары пра тое, як вось «я такая» вярнуся ў родны задрыпінск, прадэфілюю па вуліцы. У сьвеце, створаным **Аленай Адамчыхай (на фота)**, у гэтым кактэйлі зь сьвецкасьці, багемнасьці, глямуру, эротыкі аж да лёгкага сада-маза — месца для задрыпінску няма. Культывуецца значнасьць кожнае дэталі, аксэсуару, ценю. Ляндшафтныя загадкі (дзе здымалася — у Сёмкаве або ў Кейптаўне? у Ратамцы або ў Квазулу-Наталі?) падкрэсьліваюць правілы гульні нашага часу: беларускі жывуць ва ўнівэрсалізаванай прасторы сусьвету. Дзе можна дасягнуць усяго. Дзе дзёрзкасьць і выклік шэрай «стабільнасьці» ўзнагароджваецца посьпехам. Дзе спазнаваньне новых краінаў (а ўсе гераіні кнігі жывуць цяпер за мяжою) ня ёсьць адрачэньнем.

Адзіная дыктатура, якая ў той прасторы існуе, — фотамастацкая. Каб падкрэсьліць поўную свабоду сваіх гераінь, аўтарцы часам даводзіцца каторую і зьвязаць. Затое ў маналёгах (адзіная крыніца зьвестак пра лёс кожнай) беларускі вольныя прэзэнтаваць сябе так, як ім падабаецца, — абы пазытыўна і ад душы. Толькі 13-я гераіня — сама фотамастачка — прэзэнтаваная праз эсэ мужа, Адама Глёбуса.

Андрэй Скурко

Антычнасьць Пружаніі

Рэстаўратар Уладзімер Ракіцкі, вядомы як вяртальнік фрэсак XII ст. у полацкай Спасаўскай царкве, зноў пацешыў прыхільнікаў сваёй творчасьці. 17 верасьня ў полацкай Мастацкай галерэі адкрылася выстава «Рысункі з Грэцыі, Італіі і Пружаніі». Малюнкі, выкананыя пераважна алоўкам і тушшу, аўтар скампанаваў такім чынам, што побач з хрэстаматыўнымі грэцкімі і італьянскімі выявамі аказаліся партрэты сваякоў і аднавяскоўцаў мастака.

На пачатку 90-х Ракіцкі вывучаў вопыт рэстаўратараў з краін — калысак эўрапейскай цывілізацыі. З сабой ён усюды насіў блякнот, у які заносіў накіды. Часам гэта былі алоўкавыя вэрсіі карцін славутых маўстроў пэндзля, выкананыя непасрэдна ў музэйных залях. Такім чынам, сваёй чарговай выставай Ракіцкі паспрабаваў адшукаць у родных Парасьлянах беларускую антычнасьць — у тыпажах аднавяскоўцаў, у іх лёсе, памяці, марах і надзеях.

Васіль Кроква, Полацак

Іншыя паведамленьні з усёй краіны — **на старонцы 7.**

Уладзімер Ракіцкі «Беларуская готыка».

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

Лаві, Амэрыка!

24—26 верасьня ў амэрыканскім Чарльстоне (Паўднёвая Караліна) — паўфінал Кубку Дэвіса між зборнымі ЗША й Беларусі. Жывыя трансьляцыі з матчу 24 верасьня а 20.30, 25 верасьня а 22.00, 26 верасьня а 20.00 на АНТ.

«Кубак піва»

25—26 верасьня ў спартовым комплексе «Лагойск» — сьвята восеньскага піва, якое ладзяць сем беларускіх броваряў. Конкурсы, музыка ад «Крамбамбулі» й «Ляпісаў», паветра. Праезд ад аўтавакзалу «Маскоўскі» аўтобусамі Менск—Лагойск ці маршруткамі.

Вечарына бардаўскай песьні

29 верасьня ў 18.30 у Доме літаратара адбудзецца вечарына бардаўскай песьні, прымеркаваная да 15-годзьдзя Таварыства беларускай мовы. Удзел бяруць Кася Камоцкая, Алесь Камоцкі, Эдуард Акулін, Лера Сом, Галіна і Барыс Вайханскія. Уваход вольны.

500 «Беларусаў»

Віншуем калегаў з выхадам 500-га нумару газэты «Беларус» (Нью-Ёрк) — голасу раскіданых па сьвеце суродзічаў.

ЦЫТАТА

У абліччы наіўнага спадзяваньня заходніх эўрапейцаў на мэтамарфозу лукашэнкаўскага рэжыму ўдзельнікаўцы зробяць больш, чым байкотаўцы. Бо ў байкотаўцаў — толькі слова, тым часам як у ўдзельнікаўцаў — канкрэтныя факты.

Д-р Янка Запруднік у газэце «Беларус»

IN MEMORIAM

У ціхамірны восеньскі дзень

АРХІЎ ЛЕАНІДА ГАЛУБОВІЧА

Зь Міколам Купрэевым мяне пазнаёміў Пятро Кошаль у сярэдзіне 80-х на літарацкай тусоўцы ў Доме літаратара. «Знаёмся, сапраўды беларускі паэт, Мікола Купрэеў!» — сказаў ён мне мэнтарскім, добра нецьвярозым голасам. Тады яшчэ ў Беларусі не забыліся на імя ягонага цесьця, першага сакратара ЦК КПБ Сьлюнькова, таму сп.Пётра паводзіў сябе па-мэцэнацку, нават па-байранску. Ён так і сказаў — «паэт», а не «пісьменьнік». «Паэт» на Беларусі заўсёды было найвышэйшым літаратурным званьнем (Лукашэнка ня проста так абмовіўся, назваўшы Быкава паэтам). Хоць для мяне асабіста Купрэеў найперш празаік — у адным шэрагу з Быкавым…

Кошаль так і ня здолеў нічым дапамагчы. Другі зборнічак Купрэева «Правінцыйныя фантазіі» выйшаў толькі ў 1995-м (дэбютная «Непазьбежнасьць» убачыла сьвет у далёкім 1967-м). Кнігі ж прозы сп.Мікола так і не дачакаўся. І ўжо не дачакаецца: 20 верасьня Паэта пахавалі ў яго родных Міхневічах на ўскрайку Івацэвіч.

Адыходзяць у іншы сьвет «праклятыя» паэты мінулага веку. Іх кнігі ў сэрыі «Клясыка ХХ стагодзьдзя» выйдуць толькі ў дэмакратычнай Беларусі.

Пасьля першага знаёмства было некалькі імклівых выпадковых сустрэч у Менску. Побач з Паэтам знаходзіліся іншыя людзі — Мікола Папека, Леанід Галубовіч, Алесь Каско. Дзякуючы іх клопату бадзяга-паэт, гэткі беларускі Кнульп, на схіле жыцьця атрымаў уласны куткватэру ў Пружанах. Хтосьці клапаціўся пра яго быт, хтосьці — пра лёс рукапісаў (прынамсі, аповесьці Купрэева пэрыядычна зьяўляліся ў «Крыніцы» за часамі Няклява — Разанава).

Бяз клопату блізкіх да Купрэева людзей наша літаратура шмат страціла б. У гісторыі сусьветнай культуры багата прыкладаў, калі побач з геніямі ў апошнія гадыдні жыцьця не было аніводнай душы.

Ён таксама імкнуўся клапаціцца пра блізкіх. Ён быў удзячны. Ён верыў у Беларусь!

У купрэеўскім вершы «Споведзь зь віном» ёсьць такія радкі: «Крыж над магілай ня стаўце: я награшыў». Але наўрад ці нашчадкі прыслухаюцца да гэтага тэстамэнту.

Алесь Аркуш

Гірш Рэлес

СЯРГЕЙ ШАПРАН

Летась яму споўнілася 90. Стары з рэдкім прозьвішчам жыў на цяністай менскай вуліцы Чарнышэўскага за сябе і за сваіх рэпрэсаваных сяброў — Ізі Харыка, Зэліка Аксельрода, Уры Фінкеля. Пабеларуску Гірш будзе «Рыгор», так яго часьцей за ўсё і называлі. Цёзка Барадулін пераклаў на беларускую багата Рэлесавых вершаў. Яшчэ месяц таму Рэлес з аптымізмам зьбіраўся ў Вільню, на штогадовы ідышысцкі сэмінар. Зьезьдзіў, прэзэнтаваў сваю новую кніжку — і трапіў у шпіталь. Сэрца ня вытрымала перагрузкі.

Такіх пісьменьнікаў, як Рэлес, больш ня будзе. Не таму, што ніхто ў сучаснай Беларусі ня піша вершаў на ідыш. Атмасфэру даваеннага мястэчка захоўваў толькі ён, ураджэнец Чашнікаў. І ў сталінскім «Вожыку» працаваў таксама толькі ён. Ад таго часу Рэлес захоўваў нянавісьць да Сталіна ды ягонага рэжыму. Цаніў кожную іскрынку свабоды, друкаваўся ў свабодных пэрыёдыках. Спрабаваў дапамагчы ўсім, каго крыўдзілі. Мне асабліва дарагое яго заступніцтва ў гісторыі зь дзялкамі, што марылі праз суд «утылізаваць» мой часопіс.

Зіхрано леврaха — няхай блаславёна будзе памяць аб праведніку.

Вольф

Марак Карп

Марак Карп… Помніцца ён на прыступках Менскае Опэры падчас нейкага мітынгу, год 93-і ці 94-ы. Цікава ім, палякам, было зразумець, што насамрэч адбываецца ў гэтай малазразумелай Беларусі. Яны гатовы бясконца распытваць, пісаць нашы палкія прамовы на свае дыктафоны.

А ў Марака да таго ж цікавасьць спэцыфічная: ён навуковец, гісторык, і, хаця ў Варшаўскім унівэрсытэце спэцыялізаваўся па сярэдняВеччы, сапраўдным ягоным захапленьнем стала Ўсходняя Эўропа, перадусім Літва, Беларусь. Захапленьне пачыналася са старонак нелегальных выданьняў часоў «Салідарнасьці», а калі завіравалі падзеі ў Літве і Беларусі, Марак, здаецца, жыў у сваім аўто, у якім матляўся паміж Варшавай, Вільняй і Менскам. О, яму хацелася, каб тут пайшло на лад, каб Літва і Беларусь сталі сапраўднымі паплечнікамі новай Польшчы!

Ён разумеў, што новая сытуацыя патрабуе новых, больш дакладных падыходаў, і пераконваў новую дэмакратычную польскую ўладу ў неабходнасьці стварэння Цэнтру ўсходніх дасьледаваньняў (Ośrodek Studiów Wschodnich), быў яго першым і шматгадовым дырэктарам. Цэнтар — сапраўднае яго дзіця, якое ён песьціў, якім ганарыўся як уплываваі, высокапрафэсійнай аналітычнай інстытуцыяй.

Марака можна было бачыць на ўсіх канфэрэнцыях, прысьвечаных Беларусі. Не адна шчырая размова адбылася ў нас на варшаўскай вуліцы Кошыковай, дзе месьціцца Цэнтар. Апошняя надарылася ў канцы траўня. Гэта ўжо быў не ягоны кабінэт, а маленькі пакойчык, ён распавядаў, як адсунулі яго ад справы ягонага жыцьця…

WWW.OSW.WAW.PL

Трымаўся нармальна, але было відаць, што яму баліць.

І вось балючая навіна — Марака няма. Дзьве фуры літаральна сьціснулі ягоную машыну. Больш за месяц ён змагаўся ў шпіталі на Валоскай, бо быў дужы, упарты і целам і духам. Нездарма амаль уласнымі рукамі пабудаваў цудоўную сядзібу на Падляшшы, сапраўдны ўзор сучаснай сялянскай гаспадаркі.

Яму было 52 гады. Незалежная Літва ўганаравала яго ордэнам Гедыміна. Летась вылучалі Марака на прэмію імя Гедройца.

Будзем спадзявацца, што ў ліку польскіх сяброў Беларусі застанецца імя Марака Карпа.

Сямён Букчын

Буш выбраў кандыдатаў ад дэмакратаў

Папулярнасьць лукашэнкаўцаў настолькі нізкая, раз ім прыходзіцца ўжываць такія маніпуляцыі? Улады не зарэгістравалі 100 дэмакратычных кандыдатаў. Народную артыстку Беларусі Зінаіду Бандарэнку, прыкладам, — за тое, што яна недадэкляравала 20 (дваццаць) рублёў. «Нават у такіх умовах — змагацца!» — мяркуюць дэмакраты.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Цэнтравыбаркам разглядае скаргі кандыдатаў.

Усяго да выбараў не дапусьцілі палову дэмакратычных прэтэндэнтаў. Прычыны нерэгістрацыі — самыя квяцістыя.

Актывіст АГП **Уладзімер Шанцаў** у Магілёве «забыўся паставіць асабісты подпіс пад заявай». **Генерал Грыб** дэкляраваў свае чэкі «Маёмасьць» (па якіх ніхто нікому ў нашай краіне ня плаціць), якія ён уклаў у Менскі гадзіньнікавы завод. А з заводу паведамілі, што чэкі ператварыліся ў акцыі, і гэта дало падставы акруговай камісіі абвінаваціць Грыба «ва ўтойваньні акцый». **Зінаіда Бандарэнка** ў Смургонях «утаіла» ад дэклярацыі… 20 рублёў. Старшыня акруговай камісіі, зачытваючы вэрдыкт, пачырванеў.

Найярчэйшым прыкладам бракаваньня подпісаў стала сытуацыя **Тадэвуша Гавіна** ў Гарадзенскай сельскай акрузе. Ініцыятыўная група з 80 чалавек сабрала за прэтэндэнта 6137 подпісаў. Аднак здалі, дзеля перастрахоўкі, толькі 1088. Практыка сьведчыць, што чым больш подпісаў прэтэндэнты здаюць, тым больш магчымасьцей у акруговае камісіі знайсьці недахопы. Што робіць акруговая камісія? Яна едзе да выбаршчыкаў, што падпісваліся за Гавіна, і «далікатна» прапануе адмовіцца ад подпісаў! У выніку ў гэтай акрузе кандыдатка ад настаўнікаў будзе змагацца за дэпутацтва з кандыдатам ад мэдыкаў — дырэктарка Путрыскай сярэдняй школы супраць галоўдоктара Гарадзенскага раённага шпіталю.

Не мінула «чаша сія» дзейных дэпутатаў палаты прадстаўнікоў з «Рэспублікі». У подпісах, сабраных за **Ўладзімера Парфяновіча**, акруговая камісія нібыта знайшла несапраўдныя. Самае пекнае ў гэтай гісторыі — пастанова аб адмове ў рэгістрацыі датаваная 16 жніўня (!). «За памылкі мусілі б адказваць усе», — вось і ўсё, што са скрухаю можа сказаць У.Парфяновіч.

У пастанове Лідзкай гарадзкой камісіі аб адмове ў рэгістрацыі **Сяргею Скрабцу** гаворыцца, што зноўдзены несапраўдныя 66 подпісаў з 1460, пададзеных ініцыятыўнай групай. Дэпутат прывёў такі факт: 11 подпісаў жыхароў дому на вул. Качана, 6, корпус 1 у Лідзе прызналі несапраўднымі, бо, паводле даведкі гарадзкога БТІ, такога дому нібыта няма. А дэпутат паказаў усім прысутным здымкі дому, на якім выразна відаць шыльда з гэтым адрасам, а ў пашпартах жыхароў дома пазначана менавіта такая прапіска. Нават гэтыя аргумэнты С.Скрабцу не дапамаглі. Цэнтравыбаркам са сьмешачкамі адмовіў яму ў ягонай скарзе. Дэпутат ня мае ілюзій наконт таго, што яго не «зарубяць» канчаткова. «Мяне будуць душыць да канца: мае шанцы перамагчы ў Лідзе складалі 90%». Тым ня менш, незарэгістраваныя кандыдаты ад Гарадзеншчыны падалі скаргі ў Вярхоўны суд.

Сытуацыя абсурдная: фактычна, улада сама сабе выбірае канкурэнтаў. Гэта калі б Буш, прыкладам, сам выбіраў, каму з Дэмакратычнае партыі балятавацца.

- Улады ўсё радзей прызнаюць права на палітычную альтэрнатыву. У выпадку пажыцьцёвага прэзыдэнцтва Лукашэнкі «канкурэнцыю» яму на выбарах будзе складаць толькі Гайдукевіч.

Лепш за ўсё сытуацыю ілюструюць сухія лічбы. З 63 кандыдатаў, падтрыманых АГП, зарэгістраваны толькі 31. Зь «першае трыццаткі» партсьпісу 70% прэтэндэнтаў адсеклі. І хаця кандыдатамі сталі вядомыя **Станіслаў Багданкевіч** (98-я Чкалаўская округа), **Людміла Гразнова** (110-я Партызанская округа), **Аляксандар Дабравольскі** (96-я Сьвіслацкая округа, усе — Менск) — гэта ня можа кампэнсаваць страты. «Акруговыя камісіі мэтанакіравана не рэгістравалі тых прэтэндэнтаў, якія мелі ўсе шанцы перамагчы», — канстатуе старшыня АГП **Анатоль Лябедзька**.

Супраць прэтэндэнтаў, што належаць да «паралельнага грамадзтва», выкарыстоўваліся зьвесткі, атрыманыя ад фінансавых органаў. Гэтак, **Юр'я Варонежцава** ў Гомелі не зарэгістравалі, бо задэкляраваны ім за год даход быў меншы, чым сума, якую ён за год вытраціў на аплату мабільнага тэлефона. **ЯўгенуЛабановічу** (таксама АГП) паставілі ў віну «нерэалістычна малыя» даходы за год — 360 тысяч рублёў.

З 55 прэтэндэнтаў ад Партыі БНФ зарэгістраваны толькі 34 чалавекі.

Працяг на старонцы 6.

Ня кожны бізнэсовец можа кіраваць дзяржавай

З 67 дэпутатаў палаты прадстаўнікоў, якія спрабавалі шчасьця зноў, зарэгістраваныя 55. Сярод адсунутых — Усевалад Янчэўскі і Надзея Цыркун.

Парлямэнтарам-прадпрымальнікам быў пастаўлены ўльтыматум: або бізнэс, або дэпутацтва. Не жадаючы губляць грашовае месца, многія прадстаўнікі бізнэсу вырашылі разьвітацца зь месцам у Авальнай залі. Да рэгістрацыі з дыстанцыі сышлі былы генэральны дырэктар СП «Лада-ОМС», «Форд-юніян», прэзыдэнт АТ «Банк рэканвэрсіі і разьвіцьця» **Аляксей Ваганаў**, які на час дэпутацтва прыпыніў сяброўства ў ЛДП; былы гендырэктар аграгандлёвай фірмы «Дняпро», цяпер — старшыня камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ **Валеры Ліпкін**; былы гендырэктар беларуска-расейскага СП «Трэвэлінк-інвэст» **Андрэй Нарэйка*** . Былы гендырэктар ЗП «Ітэра-Бел» і па сумяшчальніцтве старшыня Беларускай сацыяльна-спартовае партыі **Ўладзімер Александровіч** цягнуў з вылучэньнем уласнае кандыдатуры да апошняга і ўрэшце заручыўся падтрымкаю выгадных інвэстыцыйных праектаў з боку прэзыдэнта.

Толькі намесьнік старшыні камісіі па прамысловасьці **Мікалай Скутаў** — які да абраньня дэпутатам кіраваў беларуска-расейска-украінскім СП ЗАТ «БелРасУкрнафта» — праігнараваў загад зьверху. Аднак яшчэ 17 жніўня Цэнтравыбаркам пацьвердзіў адмову Пастаўскай акруговай камісіі №30, якая адмовілася зарэгістраваць ініцыятыўную групу дзейнага дэпутата.

Такі ж лёс напаткаў і **Юр'я Марозава**, які да абраньня дэпутатам меў дачыненьне да сеткі аўтазаправак і фармацэўтычнага бізнэсу ў Менску, а ў 2001 г. дапамагаў **Натальлі Машэравай** у яе спробе прэзыдэнцкай кампаніі 2001 г.

У Мастох не зарэгістравалі **Генадзя Дылеўскага**.

Пад пытаньнем заставаўся і лёс прэтэндэнта на дэпутацкі мандат **Кірылы Халопіка**, які вылучаўся па Шабаноўскай акрузе Менску, — камісія цягнула з разглядам пытаньня аб рэгістрацыі дэпутата-прэтэндэнта пяць дзён. Між тым, Кірыла Халопік мае сяброўскія стасункі з **Васілём Хролам**, які зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты ў райцэнтры Глыбокае (Віцебская вобласьць). Абодва — кіраўнікі Беларускай асацыяцыі «Нерухомасьць».

Усяго «пад нож» пайшлі 12 цяперашніх дэпутатаў, якія спрабавалі вылучыцца ў палату прадстаўнікоў паўторна. Неспадзеўкай сталася адмова ў рэгістрацыі для **Ўсевалада Янчэўскага**, які зьбіраўся паўторна паспытаць дэпутацкага шчасьця ў Слуцкай акрузе №89; змагацца за месца ў Авальнай залі там будуць прадстаўнік Народнай грамады **Анатоль Балакір** ды мэр Слуцку **Аляксандар Сайко**. Менавіта апошні стаў фаварытам партыі ўлады ў гэтым рэгіёне.

Не зарэгістравалі і **Надзеі Цыркун**. Гэтая дэпутатка-псыхалягіня праславілася ўсхваленьнем сэкс-харызмы ППРБ. Балятавацца яна спрабавала ў Менску. Дыягназ: больш не патрэбная.

Глеб Хмяльніцкі

НАВІНЫ

Па-беларуску на «Эўрабачаньні»

На міжнародным дзіцячым конкурсе «Эўрабачаньне-2004» Беларусь будзе рэпрэзэнтаваць 12-гадовы Ягор Ваўчок з Мазыра. 20 лістапада ў нарвэскім Лілехамэры ён выступіць зь песьняй «Сьпявайце са мной».

Скандал у лукашэнкаўцаў

Генпракурор узбудзіў крымінальную справу супраць Сяргея Стасюна, памочніка дэпутата Віктара Кучынскага, паведамляе «БДГ». За «вырашэньне праблемы» ён нібыта вымагаў хабар 80 тыс. даляраў. Іншы эпізод — ён быццам бы заміноваў машыну дырэктара ААТ «ВДВ» Вячаслава Дулевіча. Паводле зьвестак пракуратуры, бізнэсоўцы плацілі 15 тыс. даляраў толькі за тое, каб трапіць да С.Стасюна на прыём. В.Кучынскі — адзін з найбліжэйшых паплечнікаў Лукашэнкі, які зноў балятуецца ў дэпутаты ў Кобрыне.

Што натварылі журналісткі «СаўБеліі»?

Журналісткі «Советской Белоруссии» Вікторыя Папова і Ганна Шадрына падалі ў суд на газэту «Наблюдатель». Аўтарка «Наблюдателя» зьвінавацілі аўтарак разьдзелу сьвецкай хронікі «СБ» у тым, што іхныя паводзіны падчас «Эўрабачаньня» ў Стамбуле сталі «ганьбай для Беларусі». Журналісткі аспрэчваюць і меркаваньне, што яны зьезьдзілі ў Стамбул «на халяву». Яны даказваюць, што пабывалі на Басфоры за свае.

«Плянэта» з трыма зоркамі

Менскі гатэль «Плянэта» будзе цяпер пазначаны трыма зоркамі. Гэтак атэставаў узровень гатэльных паслуг Дзяржаўны інстытут мэтралёгіі.

АТС-200

Пры канцы верасьня ў Менску зьменяцца нумары тэлефонаў, якія пачынаюцца на 220. Заміж іх трэба будзе набіраць 200. Апроч таго, АТС-254 перайшла на нумар 204, а АТС 223 пераключылі на 203.

Velcom, МТС, РБ

Лукашэнка даручыў ураду падрыхтаваць праект апэратара сувязі GSM са 100-адсоткавым дзяржаўным капіталам. Дзеля гэтага тэндэр на трэцяга апэратара падоўжаны да 19 кастрычніка. Шанцы замежных фірмаў (швэдзкай кампаніі «Тэле-2» ды расейскай «Альфа-груп», кожная зь якіх купіла права ўдзелу за 5 тысяч эўра) блізкія да нуля.

Новы нунцый

Новым апостальскім нунцыем у Беларусі прызначаны Марцін Відовіч — харват, які ў 1983—1994 працаваў рэдактарам Харвацкай праграмы Радыё Ватыкану, а ў 1994—1999 г. быў сакратаром па Босьніі й Герцагавіне ў дзяржсакратарыяце Ватыкану, потым арганізоўваў паломніцтвы ў Сьвятую зямлю.

Нерухомасьць даражэе ў Польшчы

Сярэдняя цана жылплошчы падскочыла за апошнія 12 месяцаў на 500 злотых за кв.м. У сярэднім за Бугам кв.м жытла цяпер каштуе $730. Нерухомасьць, як чакаецца, і далей будзе даражэць — на 5—10% за год.

АШ; БелаПАН, svaboda.org, gazeta.pl

Чатырох палкаводцаў адсеялі

Супраць астатніх кіраўнікоў дэмакратычных сілаў улада выставіла па два супернікі: ад вэртыкалі і ад ЛДПБ на адцяжку галасоў.

Лідэры беларускае апазыцыі ўсе вылучаліся ў менскіх акругах. Старшыня Народнай грамады **Мікола Статкевіч** балятуецца ў дэпутаты па Каліноўскай акрузе №108 (як і на выбарах 2000 г., калі ён прайграў). Ініцыятыўная група здала за свайго лідэра больш за 1100 подпісаў і сутыкнулася зь неспадзяванкай: галоўным супернікам па акрузе выступаў намесьнік старшыні Партыі БНФ **Юры Хадыка**. Лукашэнкаўцы вырашылі спрэчку «Пяцёркі+» і «Эўрапейскай кааліцыі» ўласнай воляй: Ю.Хадыку з дыстанцыі зьнялі. Міколу Статкевічу давядзецца змагацца за мандат зь дзейным дэпутатам палаты прадстаўнікоў **Вольгай Абрамавай**, на якую робяць стаўкі ўлады. У дадатак па акрузе вылучаецца галоўны доктар першай клінічнай больніцы Менску **Мікалай Сердзючэнка**.

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Анатоль Лябедзька** таксама аддаў перавагу не Ашмяне, ад якой абіраўся ў Вярхоўны Савет XIII скліканьня, а Сухараўскай акрузе №102 сталіцы. Схема «адзін апазыцыянэр — два прадстаўнікі ўлады» скарыстаная і там. Апазыцыйнаму палітыку давядзецца сутыкнуцца з загадчыцай упраўленьня сацыяльнай дапамогі гарвыканкаму **Ірынай Аляксанавай**, за чыёй сьпінай — увесь адміністрацыйны рэсурс. Раскрутка прэтэндэнткі на канале СТВ пачалася ўжо раніцай 16 верасьня, хаця паводле закону агітацыю можна пачынаць толькі з 17 верасьня. Трэці ў акрузе — прадстаўнік лібэрал-дэмакратаў.

Старшыня Партыі БНФ **Вінцук Вячорка** зарэгістраваны па Ўсходняй акрузе №107 Менску. Галоўным супернікам В.Вячоркі зьяўляецца член савету рэспублікі бізнэсовец **Уладзімер Крук** і сябар ЛДП грузчык **Яўген Даронін**. Схема традыцыйная: «адзін апазыцыянэр — два кандыдаты ад улады». Прадстаўнікоў ЛДП многія камэнтатары схільныя разглядаць як прыхільнікаў цяперашняга рэжыму, што маюць адцягваць галасы выбарцаў, настроеных галасаваць за кандыдатаў ад партый. Акрамя таго, ня выключана, што менавіта рукамі кандыдатаў ад ЛДПБ будзе ажыцьцяўляцца «нэгатыўная піяр-кампанія» супраць дэмакратаў, каб яна не асацыявалася з Крукам і Аляксанавай.

Лідэр Партыі камуністаў **Сяргей Калякін**, як і астатнія апазыцыйныя лідэры, супернічае з двума кандыдатамі, абодва — выкладчыкі Нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту. У Коласаўскай акрузе №106 Менску акрамя С.Калякіна ідуць намесьнік старшыні БСДГ **Валер Арцішэўскі** і дэкан архітэктурна-будаўнічага факультэту БНТУ **Галіна Палянская**, якая называецца кандыдатам ад улады.

«Я добра расцэньваю свае шанцы — спадзяюся на адносную сумленнасьць выбараў пры ўжываньні адміністрацыйнага рэсурсу. Калі выбары адносна чэснымі ня будуць, то пра што мы гаворым? Улада мяне не прызнаючыць дэпутатам: я выступаю за дэмакратызацыю грамадзтва, за зьмены палітычныя і эканамічныя, я катэгарычна супраць трэцяга тэрміну і пажыцьцёвага праўленьня Аляксандра Лукашэнкі. Я ня ўпісваюся ва ўладную схему», — думае Сяргей Калякін.

Шкада, што непаразуменьні ў стане «Пяцёркі+» прывялі да таго, што лідэру камуністаў давядзецца канкураваць і з калегам па кааліцыі Валер'ем Арцішэўскім, палітыкам нашмат менш вядомым.

Нефармальная лідэра дэпутацкае групы «Рэспубліка» генэрала **Валера Фралова** ў Масюкоўшчынскай акрузе «разьвялі» на дэклярацыях. «Каб запоўніць дэклярацыю аб маёмасьці й даходах, я ўзяў даведкі ў палаце прадстаўнікоў і ваенкамаце пра заробак і пэнсію. Акруговая камісія, правяраючы зьвесткі пра мае даходы, накіравала запыты ў сакратарыят ПП і ваенкамат. Адказам сталі даведкі з абсалютна іншымі лічбамі. Я сабраў усе паперы і 17 верасьня падаў скаргу ў Цэнтравыбаркам. Я глыбока перакананы, што мяне ўсё ж зарэгіструюць кандыдатам у дэпутаты», — заявіў «НН» Валер Фралоў.

Па-за гульнёй апынуўся і кіраўнік Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады **Станіслаў Шушкевіч**. Падстава — у ягонай акрузе няма зарэгістраванае партыйнае суполкі.

Такі ж лёс напаткаў і старшыню ліквідаванае Партыі працы **Аляксандра Бухвостава**, які спрабаваў вылучыцца кандыдатам у дэпутаты па 95-й Васьняцоўскай акрузе. Палітыку адмоўлена ў рэгістрацыі з прычыны несапраўдных подпісаў: «графалягічная экспэртыза» выявіла сярод здадзеных у акруговую камісію подпісаў 36 «несапраўдных». Аляксандар Бухвостаў мае намер абскардзіць рашэньне акруговай камісіі ў Цэнтравыбаркаме, але асаблівых надзей на посьпех ня цешыць.

Тактыка, абраная ўладамі ў барацьбе з апазыцыйнымі лідэрамі, відавочная: адрэзаць адных, сутыкнуць другіх з двума прэтэндэнтамі ад вэртыкалі, каб на горшы для ўлады выпаў другі тур. А ў другім туры, разьлічваюць улады, апазыцыянэраў пераможа пасьлярэфэрэндумная дэпрэсія.

Глеб Хмяльніцкі

Вінцук Вячорка: Цяпер не 2001 год

Пытаньне стаіць «або — або»

Тром акругам улады надаюць асабліва пільную ўвагу. Гэта Коласаўская акруга сталіцы, дзе балятуецца лідэр ПКБ Сяргей Калякін, Сухараўская, дзе ідзе Анатоль Лябедзька, і Ўсходняя Вінцука Вячоркі — трох знакавых фігураў дэмакратычных партыяў. На пытаньні «НН» адказвае старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка.

«НН»: Першую частку перадвыбарнае кампаніі (вылучэньне й рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты) можна лічыць завершанай. Як бы Вы ацанілі гэты этап?

Вінцук Вячорка: З гледзішча задачаў, што мы перад сабою ставілі, — станоўча. Я асабіста абышоў каля сямісот кватэраў, а калі падсумаваць абыход кватэраў «франтаўскімі» прэтэндэнтамі й людзьмі зь іхных ініцыятыўных групаў, мы прыйшлі да сотні тысячаў чалавек. Сумарна дэмакратычныя сілы дайшлі бадай што да мільёнаў. Гэта было надзвычай важна — упершыню за доўгія гады прадэманстраваць людзям увасобленую альтэрнатыву існай уладзе. Альтэрнатыву, якая сама да іх прыходзіць, адказвае на балючыя пытаньні, прапануе пазытыўнае выйсьце.

«НН»: Але ж прыкрыя адмовы ў рэгістрацыі кандыдатаў ...

ВВ: Рэгістрацыя — гэта толькі адзін з этапаў фільтрацыі.

«НН»: Якая была лёгіка ўладаў у тармажэньні адных дэмакратычных кандыдатаў і спрыяньні іншым?..

ВВ: Пра «спрыяньне» ня ведаю. На добры лад, мусілі рэгістраваць, калі дакумэнты ў парадку. Але, напрыклад, не зарэгістравалі Юрася Губарэвіча ў Белаазерску, які сабраў каля 6 тысячаў подпісаў. «Адсеялі» праф. Юрыя Хадыку, папулярных у сваіх мясьцінах Сяргея Антусевіча (Гарадня), Валера Пуціцкага (Рэчыца), Івана Шэгу (Слонім). Прымусілі зьняцца праз пагрозу звольніць Зьмітра Шэвеля (Лагойск), Алеся Грыцаўца (Баранавічы). Пагражаюць Алесю Меху (Кобрынь), звольнілі Вольгу Лагвіновіч (Маладэчна). Тымчасам амаль усюды зарэгістравалі прэтэндэнтаў, якія не зьбіралі подпісаў, а былі вылучаныя зьездам Партыі БНФ, каб «закрыць» пэўныя акругі, дзе не было мясцовых кандыдатаў. Гэта магло б сьведчыць пра аналітычны падыход — каго прапускаць, каго не. У Менску знакавых постацяў, у тым ліку кіраўнікоў партыяў, рэгістравалі, каб станоўча зазначыцца перад сусьветнаю дэмакратычнаю грамадою. Каго яны таксама пераважна рэгістравалі — гэта кандыдатаў на прасторных сельскіх акругах: Рыгор Костусеў — Шклоўскі, Бялыніцкі, Круглянскі раёны, ці Андрэй Юркоў — Горацкі, Дрыбінскі, Мсьціслаўскі. У тых самых акругах парэгістравалі калегаў з АГП. Відавочна, спадзяюцца, што ня хопіць моцы й магчымасьцяў аб'ехаць вялікія абшары й забясьпечыць на іх назіраньне. Добра, што далі кандыдацкія пасьведчаньні Васілю Главацкіх у Наваполацку, Сяргею Салашу ў Барысаве. Відаць, наступная хваля адсеву наперадзе.

«НН»: Вы праводзіце сваю публічную палітычную дзейнасьць па-беларуску. Ці ўплывае моўны рэжым на хаду цяперашняе выбарчае кампаніі?

ВВ: Абсалютна не ўплывае. Усё гэта недарэчныя страхі, якімі нас спрабавалі зьбіць з тропу некаторыя «кансультанты»... У мяне былі толькі тры эпізоды з соцень, калі людзі нешта спыталіся пра мову. Адзін раз спыталіся, ці «могу я говорить по-русски», я сказаў, што магу, але працягваў па-беларуску, і подпіс мне паставілі ахвотна. Вайсковец спытаўся, ці не зьбіраемся мы гвалтам уводзіць беларускую мову. Я адказаў, што БНФ супраць любых формаў гвалту. І той паставіў свой подпіс. Мова ня ёсьць праблемаю ані ў камунікацыях, ані ў пазытыўным ці нэгатыўным вобразе чалавека, які прыходзіць на парог. Больш за тое, мова добра пазыцыянуе кандыдатаў ад БНФ, дазваляе іх адразу распазнаць сярод іншых прэтэндэнтаў.

«НН»: Зь якімі тэхнічнымі праблемамі Вы сутыкаліся падчас гэтае кампаніі?

ВВ: Існуюць абсалютна недарэчныя абмежаваньні вырабу інфармацыйнае прадукцыі. Калі зьбіральнікі подпісаў паведамляюць жыхарам пра меркаванага вылучэнца, тыя хочуць нешта атрымаць, спакойна пачытаць пасьля. Але паводле цяперашняга драпежнага заканадаўства няможна людзям нават кавалачак паперы пакінуць. Гэта складовая частка стратэгіі «пханьня ваты ў вушы». У вылучэнцаў ад улады ніякіх праблемаў з доступам да людзей няма.

У акруговай камісіі я асабіста пакуль не сутыкнуўся зь відочнымі праблемамі. Наадварот, там — сама карэктнасьць. Праблемы пачаліся, калі я зьвярнуўся, маючы заканадаўчыя гарантыі, у газэту «Рэспубліка», дзе маю намер разьмясьціць сваю праграму. Мне на гэта праз тэлефон было паведамлена, што «газета не резиновая».

Мая сытуацыя спэцыфічная: я лідэр партыі. І падзеі, зьвязаныя са мною, адразу набываюць палітычнае вымярэньне. Таму чакаю, што супраць мяне будуць ужытыя танчэйшыя й адначасова больш маштабныя формы процідзеяньня.

«НН»: Ці ня шкодзіць сёлетняй перадвыбарнай кампаніі падрыхтоўка да рэфэрэндуму?

ВВ: Лукашэнку выгадней было б правесьці рэфэрэндум пазьней. Але ён скарыстаў з трагедыі ў Бэслане, зразумеўшы, што гісторыя можа ня даць яму другога такога шанцу — схаваца ў інфармацыйны цень вялікае бяды. Пасьля гэтага рэфэрэндум прыцьмяць выбары ў Амэрыцы й Украіне. Кандыдаты, што стаяць на платформе «Пяці крокаў да лепшага жыцьця», змадыфікуюць свае праграмы, надаючы пытаньню, вынесенаму на рэфэрэндум, галоўнае месца: ці хочам мы самаўладзтва, якое будзе сябе рэпрадукаваць бясконца? Лукашэнка ж не разьлічвае на законны мэханізм свайго сыходу з улады. Ён праграмуе дэстабілізацыю. Мерымся выкарыстаць усе магчымасьці, якія нам дае нават куртаты выбарчы кодэкс, каб прапагандаваць нашае стаўленьне да рэфэрэндуму.

Добра, што зьнікае ніша для так званых «незалежных» кандыдатаў. Кожны павінен вызначыцца й наўпрост сказаць «за» ці «супраць». Грамадзтва імкліва палітызуецца. Уся тая твань, што зьліваецца з экранаў тэлевізараў, паміма волі ініцыятараў палярызуе грамадзтва й рэльефна высьвечвае яго свабодалюбную бальшыню. Цяпер нават не 2001 год. Шыла ў мяху не схаваеш.

Гутарыў Сяргей Харэўскі

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Вінцук Вячорка раіць:

Выбарнікам — ісьці й галасаваць «супраць» ламаньня Канстытуцыі, а таксама «за» тых кандыдатаў, якія падзяляюць «Пяцёрку плюс» — плятформу «Пяць крокаў да лепшага жыцьця». Ісьці ў сам дзень выбараў, не раней. Бо падчас г.зв. папярэдняга галасаваньня скрыня зь бюлетэнямі стаіць пяць начэй без нагляду, і ейны сон спараджае пачвараў. Міжнароднае непрызнаньне рэфэрэндуму ўжо ёсьць фактам. А значыць, трэба, каб пратэстная бальшыня зрабіла даступны ёй учынак, паставіўшы адпаведны знак у адпаведным квадраціку бюлетэню. Назіральнікам — нікога й нічога не баяцца. Імкнуцца спыняць парушэньні адразу, а не паціху рыхтаваць будучую справаздачу. І разумець: галоўнае — няўхільныя зьмены ў настроях нашых суграмадзянаў.

З УСЁЙ КРАІНЫ

Як любяць у Воршы лібэральных дэмакратаў

У аршанскай акрузе №26 пасьведчаньні кандыдатаў выдалі ўсім дэмакратам. За мандат тут будуць змагацца камуніст-калякінец Мікалай Дзямідаў (быў дэпутатам ВС XII скліканьня ды ўдзельнічаў ва ўсіх выбарчых кампаніях, якія праходзілі з таго часу), Генадзь Ананьеў (АГП), Канстанцін Анташковіч (БСДП-НГ). Ад улады ў парлямэнт ідзе начальніца гараддзелу адукацыі Людміла Анікеева. Подпісы за яе вылучэньне зьбіралі зьбольшага яе падначаленыя, для падстрахоўкі яе вылучылі ў кандыдаты працоўныя калектывы двух заводаў. Адзінага зьнялі зь перадвыбарнай гонкі вылучэнца ЛДПБ: няправільна афармілі дакумэнты. Гайдукевічаўцы ўдзельнічаюць ва ўсіх выбарах (у міжвыбарчы пэрыяд іх не відаць і не чуваць), але ніколі не выйгравалі, нават у другі тур не выходзілі.

Яўген Жарнасек, Ворша

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Вуліца 17 Кастрычніка

Працяг са старонкі 1.

Інфармацыя, што добрая палова дэмакратычных, незалежных і беларускамоўных кандыдатаў у дэпутаты парлямэнту — Хадыка ў Менску, Губарэвіч у Бярозе, Карніенка ў Гомелі, Шэін у Ракаве, Бандарэнка ў Смургонях — не зарэгістраваныя, прыйшла 16 верасьня, напярэдадні Дня ўзьяднаньня Заходняй і Ўсходняй Беларусі, ды абудзіла міжвольныя асацыяцыі з выбарамі ў панскай Польшчы.

Тады таксама сьпярша захоўваўся дэмакратычны фасад — але не падпускалі беларускіх кандыдатаў. Тады таксама ўлады лічылі сябе ўсясільнымі і выхваляліся, што праз дваццаць гадоў ніводнага сьведамага беларуса тут са сьвечкаю ня знойдзеш.

Выбары ня будуць свабоднымі — 16 верасьня гэта стала ясна. Наступныя навіны былі больш чым чаканымі. З тэлезваротаў і ўлётак кандыдатаў камісіі на свой густ выразаюць занадта крытычныя кавалкі. Агітацыя за пажыцьцёвае прэзыдэнцтва Лукашэнкі вядзецца так, нібы дзяржаўныя газэты і ТВ належаць не грамадзтву, якое мусіць узважваць і «за», і «супраць», а рэклямнаму УП «Лукашэнка».

Пры ўсіх зачыстках беларускае апазыцыі рэпрэсіі застаюцца дазаванымі. Газэты то зачыняць, то адчыняць, а арыштаванаму Леванеўскаму дазволена з астрогу вылучацца ў дэпутаты. Вось рыхтык так было і за Пілсудзкім. Той таксама навёў парадак і чысьціню. Дзяды на вёсках дагэтуль захоплена ўспамінаюць. Толькі паспрабуй падаткаў не заплаці ці плоту не паладзь — заробіш дубцом па пятах.

Усё скончылася зьнікненьнем панскай Польшчы з палітычнай сцэны пры першых геапалітычных трансфармацыях. Безь Пілсудзкага канструкцыя развалілася. Быў дах, былі платы — сьценаў не было.

Праціўнікі аўтарытарнага рэжыму пілсудчыкаў былі расколатыя. Пэрсанажы тагачаснае апазыцыі нібы сышлі з плошчы Якуба Коласа — творца беларускай граматыкі, дэпутат д-р Тарашкевіч; Радаслаў Астроўскі, якога ў сёньняшняй тэрміналёгіі мы б назвалі грантасосам — толькі бэрлінскіх спонсараў — і які паставіў кропку ў сваёй палітычнай кар'еры старшынствам у марыянэтачным урадзе БЦР; ідэоляг Антон Луцкевіч — рэвалюцыянэр, прэм'ер, масон і хто толькі ні… — усё дзеля незалежнасьці Беларусі; геройскія КПЗБоўцы; падманутыя і закатаваныя сталіністамі грамадоўцы; улюбёныя ў свой народ хадзкі…

Лукашэнка — не Пілсудзкі. Пілсудзкі душыў беларускі сэпаратызм, бо верыў у маналітную Польшчу і дзейнічаў у стылістыцы цэнтральнаэўрапейскіх лідэраў свайго часу. Рэжым Лукашэнкі — аўтарытарны аўтсайдэр Эўропы. Супольныя ў Лукашэнкі зь Пілсудзкім — ня мэты, а мэтады.

Толькі рабіць вайсковыя пераваротаі ўяжджаць у сталіцу на бронемашыне цяпер ня модна. Элегантныя перамогі дасягаюцца пры дапамозе маніпуляцыі грамадзкай думкай і падтасоўкі галасоў. Калі 23% галасоў ператвараюцца ў 73% — гэта і ёсьць пераварот, гаворачы пастарому, у тэрмінах эпохі, калі пераваротаі яшчэ называлі пераваротамі, паноў — панамі, а груцу — груцай. Што б Лукашэнка ні гаварыў на «Дажынках», але рыхтуецца ён зусім не падзякаваць сваім верным 23 працэнтам і пайсьці, а да нечага іншага. Фільтрацыя сотні кандыдатаў ад апазыцыі — таму доказ.

Былі б Прытыцкі, Танк, Луцкевіч і Гадлеўскі жывыя, яны падтрымалі б аб'яднаньне цяперашніх камуністаў, хадэкаў і сацыялістаў — «Пяцёрку-плюс». Радаслаў Астроўскі — мо і не. Але то быў дзяяч зь іншае гліны.

Андрэй Дынько

Самыя цікавыя акругі

Менск-Старавіленская
Уладзімер Колас, дырэктар Беларускага ліцэю, ПБНФ
Аляксандар Цынкевіч, АГП
Алег Волчак, праваабаронца, БСДГ
Аляксандар Лягчылаў, паэт-песеньнік, дырэктар гандлёвага каледжу

Менск-Усходняя
Вінцук Вячорка, лідэр ПБНФ
Уладзімер Крук, член савету рэспублікі

Менск-Сухараўская
Анатоль Лябедзька, лідэр АГП
Ірына Аляксанава, загадчыца ўпраўленьня сацыяльнай дапамогі гарвыканкаму

Менск-Коласаўская
Сяргей Калякін, лідэр ПКБ
Галіна Палянская, дэкан архітэктурна-будаўнічага факультэту БДПА

Менск-Каліноўская
Мікола Статкевіч, лідэр Народнай грамады
Вольга Абрамава, дэпутатка ПП

Менск-Купалаўская
Валянціна Палевікова, прафсаюзная лідэрка, АГП
Сяргей Мудрачэнка, ПБНФ
Генадзь Давыдзька, дырэктар тэатру імя Янкі Купалы

Менск-Уручанская
Алесь Міхалевіч, намесьнік старшыні ПБНФ
Віктар Марахін, палкоўнік, дэпутат ПП
Сусанна Фурсава, доктарка

Менская-раённая
Уладзімер Дзялендзік, былы заснавальнік прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Дарыда»
Юрась Зянковіч, дэпутат райсавету, ПБНФ

Шклоў-Бялынічы
Рыгор Костусеў, ПБНФ
Уладзімер Канаплёў, віцэ-сьпікер ПП

Клічаў
Людміла Гушча, Народная грамада
Вадзім Папоў, сьпікер ПП

Слуцак
Анатоль Балакір, Народная грамада
Аляксандар Сайко, старшыня Слуцкае гарадзкое адміністрацыі

Маладэчна
Вольга Лагвіновіч, ПБНФ
Эдуард Баланчук, экс-КХП-БНФ
Аляксей Кароль, намесьнік старшыні БСДГ
Мікалай Чурсін, кіраўнік Маладачанскай гарадзкой адміністрацыі
Станіслаў Гаварушкін, дэпутат ПП

Барысаў
Сяргей Салаш, ПБНФ
Віктар Гумінскі, дэпутат ПП

Масты
Алесь Зарамбюк, Малады аронт
Аляксандар Пудаўкін, ПКБ
Анатоль Белашэўскі, начальнік УУС па Гарадзеншчыне

Шчучын-Воранава
Алесь Мілінкевіч, незалежны, «Пяцёрка+»
Вінцэнт Казяк, прадстаўнік прэзыдэнта па Гарадзеншчыне

Віцебск-Горкаўская
Павал Севярынец, Маладая Беларусь
Уладзіслаў Токараў, ПБНФ
Уладзімер Арыстаў, АГП
Алена Фаміна, Народная грамада
Яўген Інц, ПКБ
Алена Ціханоўская, супрацоўніца ваенкамату
Зоя Крот, начальнік камітэту па працы і сацыяльнай дапамозе Віцебскага аблвыканкаму

Наваполацак
Васіль Главацкіх, ПБНФ
Аляксандар Цярэнцьеў, АГП
Леанід Турышчаў, загадчык катэдры Наваполацкага ўнівэрсытэту
Пятро Саламуха, гендырэктар ААТ «Нафтазаводмантаж»
Іна Антонава, галоўная доктарка дзіцячай паліклінікі Наваполацку

Лепель
Алег Тычына, прадпрымальнік, сябар прадпрымальніцкага аб'яднаньня «Пэрспэктыва», «Пяцёрка+»
Аляксей Габрыэль, Народная грамада
Раман Унучка, экс-банкір, экс-віцэ-прэм'ер, імаверны кандыдат на пасаду сьпікера ад лукашэнкаўцаў

Гомельшчына
12 кандыдатаў ад АГП не зарэгістравана.

СПОРТ

Паралімпіяда: прыклад для кожнага

Працяг са старонкі 1.

Найбольш прадстаўнічыя дэлегацыі сабралі: каманда ЗША (233 чалавекі), немцы (215) ды кітайцы (200). Беларусаў у Грэцыі — 33 атлеты. Бяром ня колькасьцю, а якасьцю. За першыя тры дні суайчыньнікі заваявалі шэсьць мэдалёў. Паклаў пачын узнагародам 51-гадовы гарадзенец Віктар Хільмончык. Ён заваяваў «срэбра» ў штурханьні ядра (13,19 мэтра) сярод спартоўцаў з парушэньнем апорна-рухальнага апарату, палепшыўшы асабісты рэкорд адразу на 67 см.

А першае золата беларусам прынёс на дыстанцыі 400 мэтраў вольным стылем сярод людзей са слабым зрокам 23-гадовы Сяргей Пунько. Ён палепшыў на 2,16 сэкунды ўласны сусьветны рэкорд (4 хвіліны 11,58 сэкунды). Пунько — сьціплы: «Залаты мэдаль — гэта ганарова, але нічога выдатнага я не паказаў». Трэцяе месца ў гэтай дысцыпліне заняў чэмпіён Паралімпіяды-2000 20-гадовы Раман Макараў. Дарэчы, Пунько заваяваў на наступны дзень «срэбра» на дыстанцыі 100 мэтраў брасам.

Паралімпійскія гульні — гэта і прага жыцьця, і трыюмф чалавечае волі. На цырымоніі адкрыцьця кіраўніца аргкамітэту Алімпійскіх і Паралімпійскіх гульняў Яна Ангелопулас-Даскалакі адзначыла, што ня ўсе спартоўцы атрымаюць мэдалі, але ўсе паедуць з Грэцыі чэмпіёнамі. «Мы захапляемся вашым духам, які дазваляе дабіцца, на першы погляд, немажлівага».

У пацьвярджэньне яе слоў падчас шэсьця туркмэнскай дэлегацыі Атаджан Бегніязаў зьдзейсьніў подзьвіг. Ён адкінуў мыліцы і прайшоў дыстанцыю на руках, несучы цела паралельна зямлі. Зрэшты, удзел кожнага паралімпійца ў такіх гульнях — подзьвіг.

У 1924 г. у Парыжы былі праведзены першыя Алімпійскія гульні для глухіх. Пасьля другой сусьветнай вайны да спорту сталі актыўна далучацца людзі з пашкоджаньнямі апорна-рухальнага апарату. У гэтым вялікая заслуга доктара Людвіка Гутмана, які ў ангельскім Сток-Мандэвілі, у Цэнтры рэабілітацыі хворых са сьпіннамазгавымі траўмамі, распрацаваў адмысловую праграму. У 1948 г. паралельна з Алімпіядай у Лёндане прайшлі і першыя Сток-Мандэвільскія гульні. З часам былі ўсталяваныя кантакты зь Міжнародным алімпійскім камітэтам. І ўжо ў 1960 г. у Рыме прайшла першая Паралімпіяда. У ёй узялі ўдзел 400 спартоўцаў з 23 краін. «Пара» — Алімпіяда, якая праходзіць паралельна Летняй. Паступова Паралімпіяды заваявалі інтарэс і прыцягнулі ўвагу людзей нават далёкіх ад спорту. Так, пасьля гульняў у Токіё ў 1964 г. амаль усе японскія атлеты былі працаўладкаваныя. Ад 1988 г. Паралімпіяды праходзяць у гарадах, дзе праводзілася летняя Алімпіяда. СССР упершыню ўзяў удзел у Паралімпіядзе ў 1988 г. у Сэуле. Лічылася ж, што і інвалідаў у Савецкім Саюзе таксама няма.

За перамогу на Паралімпійскіх гульнях беларускія спартоўцы атрымаюць 12 тысяч даляраў, за другое месца — 6 тыс., за трэцяе — 4 тыс. І яны таго сапраўды вартыя.

Алег Раявец

Хто дзе ідзе

Дэпутацкі мандат дае прадстаўніку вэртыкалі цяпло і надзейнасьць. Таму з 108 цяперашніх дэпутатаў палаты прадстаўнікоў бітым гасьцінцам у дэпутацтва пайшлі паўторна 67 чалавек. Аднак толькі 54 дэпутатам удалося прайсьці праз сіта рэгістрацыі.

Беспрацоўны Канаплёў

Сярод гэтых пяцідзесяці чатырох вылучаюцца гордыя постаці сьпікера палаты **Вадзіма Папова** ды ягонага намесьніка **Ўладзімера Канаплёва**. Больш уплывовым з двойкі зьяўляецца, зразумела, намесьнік — сябар дзяцінства прэзыдэнта У.Канаплёў.

Віцэ-сьпікер Уладзімер Канаплёў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты ў Шклоўскай выбарчай акрузе №75 і, насуперак чуткам, што хадзілі, ня мае супернікаў ад улады. Дзіўна толькі, што ў рэгістрацыйных дакумэнтах У.Канаплёў фігуруе як «беспрацоўны».

Галоўны супернік дэпутата — старшыня Магілёўскае абласное суполкі Партыі БНФ **Рыгор Костусеў**. Ён прапаноўваў У.Канаплёву распачаць сумесную агітацыйную кампанію, аднак апошні адмовіўся. Уласныя шанцы на перамогу Рыгор Костусеў ацэньвае як «50 на 50» — «калі будзе праведзена сумленная агітацыйная і выбарчая кампанія». Бялыніцкі раён — радзіма прадстаўніка БНФ, у Шклоўскім ён доўга працуе — тут асаблівых праблем з выбаршчыкамі кандыдат ня бачыць. А вось з Магілёўскім раёнам кандыдату прыйдзецца папрацаваць. Тым больш што Ўладзімер Канаплёў яшчэ да ўтварэньня акруговай выбарчай камісіі распаўсюдзіў у акрузе велізарным накладам справаздачу аб дэпутацкай дзейнасьці. Каляровыя ўлёткі-справаздачы, трэба сказаць, ня мелі выходных зьвестак. Кагосьці за такое зьнімаюць...

Астатнія два кандыдаты ў дэпутаты — прадстаўнік АГП **Аляксандар Булаўкін** ды спадар ад Лібэральна-дэмакратычнай партыі, асоба малавядомая. Зрэшты, як і большасьць кандыдатаў ЛДП.

Дэпутат супраць дэпутата

Яшчэ 14 красавіка ў пасланьні парлямэнту **Аляксандар Лукашэнка** дэ-факта забараніў удзел у выбарах прадстаўнікам бізнэсу, да якіх належыць (дакладней, належаў, але, бадай, «былых бізнэсоўцаў», як і КДБістаў, не бывае) былы заснавальнік прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Дарыда» **Ўладзімер Дзялендзік**. Апошні, аднак, бізнэс ужо пакінуў, перадаўшы права заснавальніка найбуйнейшага вытворцы мінэральнай вады дачцэ Натальлі Дзялендзік.

У.Дзялендзіку кінуў пальчатку малады папулярны дэпутат Ждановіцкага сельскага і Менскага райсавету **Юрась Зянковіч** (БНФ). Прадстаўніка ЛДП ні Ю.Зянковіч, ні У.Дзялендзік за суперніка ня лічаць: кандыдата ніхто ня ведае, дый нават на атрыманьне пасьведчаньня кандыдата прадстаўнік ЛДП не зьявіўся.

На пасяджэньні камісіі па рэгістрацыі кандыдатаў сябар камісіі ад ПКБ пацікавіўся ў дэпутата: ці праўда, што ён аказаў Менскаму раёну спонсарскай дапамогі на суму 1 мільярд 200 мільёнаў рублёў? «Я адказаў: ужо нават і больш, і ўсё гэта пацьвярджаецца дакумэнтальна», — кажа У.Дзялендзік.

«Сапраўдных канкурэнтаў, па шчырасьці, я ня бачу: Зянковіч для мяне не канкурэнт, народ яго ня прыме. Праграмы як такой у яго няма зусім, а тое, што ён гаворыць, — тое кажу і я, гэта мы ўсе ведаем і безь яго. Разьлічваць на дапамогу звонку, што нехта дапаможа нам фінансамі, — ніхто ніколі бясплатна нам не дапаможа. ЗША могуць толькі разбамбіць дзесьці нешта ды імкнуцца кантраляваць увесь сьвет, а грошай бясплатна не дадуць. Скажу больш: і Пуцін ужо пайшоў па беларускім шляху, пачаўшы ўзмацняць дысцыпліну ў Расеі. Пуцін пайшоў, і іншыя краіны пойдуць», — самаўпэўнена заяўляе У.Дзялендзік.

Дэпутат ад пратэстантаў

Трэці раз дамагаецца дэпутацкага мандату і дэпутат **Іван Пашкевіч**, які вылучаецца ў адной і той жа акрузе — Столінскай №16. І.Пашкевіч вылучаўся традыцыйным шляхам — праз збор подпісаў, хаця і зьяўляецца сябрам Народнай грамады. Супраць прадстаўніка «Рэспублікі» дзейнічаюць старшыня калгасу «Фядорскі» **Рыгор Дзямко** і хірург райбольніцы **сп. Прус**. Ад пачатку акруговая камісія не зарэгістравала дзьвюх ініцыятыўных груп, пазьней «выдаліла» з гульні двух партыйных вылучэнцаў.

Іван Пашкевіч разьлічвае «на перамогу ў першым туры». Століншчына славіцца сваімі рэлігійнымі традыцыямі, дзе пераважаюць пратэстанцкія суполкі. На іх і робіць стаўку ініцыятыўная група Івана Пашкевіча, якая сабрала звыш за 6 тысяч подпісаў.

«Рэгістрацыя кандыдатаў праходзіла ў самых жорсткіх умовах. У мяне гэтая кампанія — трэцяя па ліку, і больш жорсткага прэсынгу мне сустракаць не даводзілася», — гаворыць Іван Пашкевіч.

Насустрач рэваншу

Сутыкненьне інтарэсаў праўладных прэтэндэнтаў адбылося ў Бабруйскай Ленінскай акрузе №63. Выбарчы настрой члену савету рэспублікі **Тацяне Арцюшэнцы** сапсавала дэпутатка палаты прадстаўнікоў **Марыя Вінакурава**, якая ў апошняе імгненьне пайшла па гэтай акрузе.

Паводле чутак, на выбарах-2000 Тацяна Арцюшэнка апераджала тагачасную суперніцу па колькасьці набраных галасоў, аднак асабістае знаёмства Марыі Вінакуравай з прэзыдэнтам А.Лукашэнкам зрабіла сваю справу, і ў дэпутацкае крэсла села апошняя, а Т.Арцюшэнка мусіла зьняць уласную кандыдатуру і пагадзіцца на прывабную пасаду «сэнатаркі».

Праз чатыры гады Тацяна Арцюшэнка захацела даць бой сваёй суперніцы — за чатыры гады сэнатарства ня горшыя сувязі займела і яна. І Марыі Вінакуравай не было наканавана атрымаць ад камісіі пасьведчаньне кандыдаткі ад акруговай камісіі. Толькі Цэнтравыбаркам зарэгістраваў дэпутатку, якая сёлета ўступіла ў КПБ і з памылкай вылучалася ад зьезду.

Сацыялістка й сьпікер

Старшыня палаты прадстаўнікоў **Вадзім Папоў** не зьяўляецца самастойным палітычным гульцом, таму лічыўся намінальным сьпікерам. Канкурэнт у яго ў забытай богам Клічаўскай акрузе адзін — прадстаўніца Народнай грамады **Людміла Гушча**.

Дэмакраты сышліся

Старавіленская акруга №105 Менску сярод іншых сталічных округ вылучаецца сутыкненьнем трох дэмакратычных кандыдатаў. За мандат змагаюцца тры калегі па «Пяцёрцы+»: Партыю БНФ прадстаўляе дырэктар Беларускага ліцэю **Ўладзімер Колас**, Сацыялдэмакратычную грамаду рэпрэзэнтуе праваабаронца **Алег Волчак**, Аб'яднаную грамадзянскую партыю — **Аляксандар Цынкевіч**. У дадатак да «тройкі» дэмакратаў — прадстаўнік ЛДП сп.Зыкаў ды дырэктар гандлёвага каледжу паэт-песеньнік **Аляксандар Лягчылаў**.

Сытуацыя для дэмакратаў, з аднаго боку, нядрэнная: «тройка» мае шанцы праводзіць агітацыю супраць рэфэрэндуму і прывесьці як мага болей наглядальнікаў на ўчасткі. Зь іншага боку, ні адзін з кандыдатаў не зьбіраецца здымаць сваю кандыдатуру на карысьць іншага.

Зрэшты, мяркуе Ўладзімер Колас, можа, гэта й да лепшага. «Ніхто, вядома, ня будзе агітаваць адзін супраць другога, кампанія будзе неагрэсіўная. Але ўсе мы зоймем адзіную пазыцыю, а ў другім туры ў любым выпадку застанецца адзін дэмакратычны кандыдат», — перакананы Ўладзімер Колас.

Адмовіць нельга рэгістраваць

Адразу 9 прэтэндэнтаў вылецелі з выбарчай гонкі ва Ўручанскай акрузе Менску — з 12 прэтэндэнтаў зарэгістравалі двух. Сярод нешчасьліўцаў можна згадаць былога кандыдата ў прэзыдэнты **Ўладзімера Ганчарыка**, аднаго з кіраўнікоў БСДГ **Паўла Знаўца**, дэпутата Вярхоўнага Савету XIII скліканьня, былога міністра абароны **Аляксандра Чумакова**.

Ініцыятыўная група Ганчарыка сабрала 5800 подпісаў, у акруговую камісію здалі 1091 подпіс, 59 зь якіх былі прызнаны несапраўднымі. «У той жа дзень, 16 верасьня, я зь сябрамі маёй групы абышлі 58 з 59 указаных у акце выбаршчыкаў, і ўсе яны пацьвердзілі факт самастойнага прастаўленьня даты і подпісу ў падпісных лістах. Мая скарга разам зь пісьмовымі пацьвярджэньнямі 58 выбаршчыкаў знаходзіцца ў Цэнтравыбаркаме, 20 верасьня кіраўнік майго штабу адвёз скаргу і ў пракуратуру Першамайскага раёну. Дапушчана яўная падтасоўка выбарчых дакумэнтаў», — перакананы Ўладзімер Ганчарык.

Намесьніку старшыні БНФ Алесю Міхалевічу ў гэтай акрузе супрацьстаяць дзейны дэпутат ПП палкоўнік **Віктар Марахін** і доктарка **Сусанна Фурсава**. У акрузе з 38 участкаў 10 знаходзяцца ў вайсковых частках.

Асаблівая акруга

Купалаўская акруга №97 мае права называцца асаблівай. Менавіта да гэтай акругі Цэнтравыбаркам з МЗС прыпісалі ўсіх выбаршчыкаў, якія знаходзяцца і будуць галасаваць за межамі Беларусі, — а гэта 20 тысяч чалавек. Калі ў астатніх акругах сярэдняя колькасьць выбаршчыкаў складае прыкладна 60 тысяч чалавек, то ў Купалаўскай — 81 тысячу.

Кандыдатаў у акрузе зарэгістравана чатыры. Сярод іх **Валянціна Палевікова** ад АГП і актывіст БНФ **Сяргей Мудрачэнка**. Гэта адна з тых нешматлікіх акругаў, дзе ад улады выстаўлены беларускамоўны кандыдат — дырэктар Купалаўскага тэатру **Генадзь Давыдзька**. Яшчэ пяць прэтэндэнтаў акруговая камісія выкінула з гульні. Сярод іх — дзейны дэпутат Палаты прадстаўнікоў **Уладзімер Навасяд**, чыя рэгістрацыя спачатку была адкладзена на пяць дзён, і старшыня Таварыства беларускай мовы **Алег Трусаў**, незарэгістраваны зь незразумелых прычынаў.

«16 верасьня акруговая камісія не дала мне ніякіх тлумачэньняў, таму я сам ня ведаю прычынаў адмовы. Я 17 верасьня накіраваў скаргу ў Цэнтравыбаркам і чакаю рашэньня. У канцы скаргі я напісаў словы Васіля Быкава: «За вамі — перамога, за намі — ісьціна». Гэта ня першы выпадак зьняцьця маёй кандыдатуры на выбарах. У савецкія часы мяне, вылучанага кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савету БССР ад ТБМ, спачатку зьнялі з выбараў, а калі я напісаў велічэзны артыкул у «Известия», тут жа аднавілі кандыдатам, і ўрэшце я перамог», — прыгадвае былыя часы Алег Трусаў.

Трэці раз праз дзяржзаказ

Амаль стопрацэнтна прадвызначаны лёс парлямэнцкіх выбараў у Бабруйскай сельскай акрузе №65. Магутны адміністрацыйны рэсурс мае ў сваім распараджэньні **Юры Кулакоўскі**, дупат Вярхоўнага Савету XIII скліканьня, цяпер — памочнік прэзыдэнта па Магілёўскай вобласьці.

Затое адмоўлена ў рэгістрацыі на Магілёўшчыне былому паплечніку А.Лукашэнкі **Леаніду Сініцыну**, былому прэсаваму сакратару прэм-'ера **Мікалаю Тоўсьціку**, сябру алімпійскай зборнай Беларусі **Сяргею Літштвану**.

Інтарэсы ўладных кланаў

Намесьніку старшыні БСДГ **Аляксею Каралю** давядзецца вытрымаць у Маладачанскай гарадзкой акрузе №85 канкурэнцыю зь пяцьцю кандыдатамі ў дэпутаты. Гэта тая рэдкая акруга, у якой сутыкнуліся інтарэсы розных уладных кланаў.

Напачатку і цэнтральная ўлада, і мясцовая вэртыкаль рабілі стаўку на дэпутата палаты прадстаўнікоў **Станіслава Гаварушкіна** і падтрымлівалі яго ўсебакова. Аднак за тыдзень да заканчэньня рэгістрацыі кандыдатаў на гарызонце ўзьнікла фігура кіраўніка Маладачанскай гарадзкой адміністрацыі **Мікалая Чурсіна**, вылучанага ад працоўнага калектыву. Аляксей Кароль бачыць некалькі прычынаў гэтага раздраю: «Для ўлады найважнейшым зьяўляецца рэфэрэндум, і ня гэтак важна, хто пераможа: Гаварушкін ці Чурсін. Са сваімі неяк разьбяруцца. Барацьба ж кланаў дае мне дадатковыя шанцы на перамогу». Станіслава Гаварушкіна напачатку вылучаў працоўны калектыў Маладачанскай гарадзкой больніцы, аднак пасьля гэтае вылучэньне было ануляванае.

Партыю БНФ у акрузе прадстаўляе **Вольга Лагвіновіч**, а **Эдуард Баланчук**, які выйшаў з КХП-БНФ дзеля ўдзелу ў парлямэнцкай кампаніі, пазыцыянуецца як незалежны кандыдат.

Салаш будзе перамагаць

30-гадовы сябар Партыі БНФ **Сяргей Салаш** з Барысава настроены на безумоўную перамогу. Хаця маладому палітыку давядзецца нясоладка: у Барысаўскай гарадзкой выбарчай акрузе №77 балятуюцца дзейны дэпутат **Віктар Гумінскі**, дырэктарка СШ №13 **Людміла Гарнак** ды прадстаўнік АГП **Леў Марголін**. Увесь адміністрацыйны рэсурс працуе на Гумінскага. А сам С.Салаш, як і ягоныя калегі з каліцыі «Пяцёрка+», абяцае змагацца за перамогу да канца.

Глеб Хмяльніцкі

Буш выбраў кандыдатаў ад дэмакратаў

Працяг са старонкі 3.

З Народнай грамады праз сіта рэгістрацыі прапусьцілі толькі 28 прэтэндэнтаў з 56 вылучаных, вывеўшы з барацьбы **Міхаіла Ганчарыка** й **Вольгу Карач**.

З 38 прадстаўнікоў Партыі камуністаў беларускай кандыдатамі ў дэпутаты зарэгістраваны толькі 20.

Найбуйнейшы спэцыяліст у галіне выбарчага заканадаўства ў краіне **Міхаіл Пліска**, які прадстаўляе АГП у Цэнтравыбаркаме, катэгарычна заяўляе: «Большая частка адмоў ня мае пад сабою падстаў».

Улады ўсё радзей прызнаюць права на палітычную альтэрнатыву, а ў выпадку пажыцьцёвага прэзыдэнцтва **Лукашэнкі** «канкурэнцыю» яму на выбарах будзе складаць толькі **Гайдукевіч**.

Мо ўсё ж байкот? «Нават у такіх несправядлівых умовах трэба выкарыстоўваць кожны шанец ісьці да людзей і тлумачыць ім згубнасьць ідэі пажыцьцёвага прэзыдэнцтва — а кандыдаты маюць для гэтага болей магчымасьцяў. У 1989 г. на выбарах было нешта падобнае, толькі тады адсеў ажыцьцяўлялі сходы працоўных калектываў. Нягледзячы на гэта, тады мы лічылі патрэбным змагацца й прарывацца», — прыгадвае **Алесь Бяляцкі**, вылучаны прадстаўляць Партыю БНФ пры Цэнтравыбаркаме. Усяго ад партыяў «Пяцёркі+» з 227 прэтэндэнтаў зарэгістравана 127.

Увогуле, паводле словаў сакратара Цэнтравыбаркаму **Мікалая Лазавіка**, у гэтай кампаніі сярэднерэспубліканскі конкурс на адно дэпутацкае месца складае 3,26 чалавека. Гэта амаль у два разы менш, чым на байкатаваных апазыцыяй выбарах 2000 г. (тады пасьля рэгістрацыі кандыдатаў камісіямі было 5,3 чалавека на месца). Напрошваецца яшчэ адна выснова: камісіі вядуць ненатуральны адбор кандыдатаў, каб выканаць пажаданьне прэзыдэнта аб правядзеньні выбараў у адзін тур.

Мікола Бугай

Месца пад лямпачкай

Кампанія паступленьня ў ВНУ сёлета была гучнай. Такіх конкурсаў ды прахадных балаў нашы бацькі і ня сьнілі. Часам даходзіла да маразму — на адну са спэцыяльнасьцяў журфаку БДУ знаёмая набрала 29 балаў з 30 магчымых, здаўшы адпаведна на 10, 10 і 9, і не прайшла па конкурсе. Але абітурыенцкая кампанія скончылася, і ўдачлівыя паступанцы блукаюць у пошуках жыльля.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Акцыя «бяздомных студэнтаў», арганізаваная Задзіночаньнем беларускіх студэнтаў, адбылася ў Менску 16 верасьня. Былі затрыманыя тры чалавекі. Суды адбудуцца 28 верасьня — юнакоў вінавацяць у супраціве супрацоўнікам міліцыі пры затрыманьні.

Жыць ці ня жыць?

Сярод студэнтаў пэдунівэрсытэту ходзіць показка: «Каб засяліцца ў інтэрнат, трэба быць чарнобыльцам бяз рук і ног ды пабрацца шлюбам з інвалідам са свайго ж унівэру». Шчасьлівец сапраўды мусіць мець дзіўныя паказчыкі:

1) студэнт мусіць мець аднаго з бацькоў інвалідам 1-й ці 2-й групы;

2) студэнт мусіць мець брата (сястру) — студэнта(-ку) БДПУ імя М.Танка (а што рабіць бацькам, дзеці якіх навучаюцца ў розных ВНУ? Ці гэта мэтад заахвочваньня да паступленьня ў вышэйзгаданую alma mater?);

3) студэнт мусіць мець мужа (жонку) з пэду (людзі!!! Бярыце на ўвагу!), праўда, маладым сем'ям даецца адзін пакой у блёчным інтэрнаце. Таму — дзейнічайце!!!

«Платнікам» жа й марыць ня варта пра інтэрнат.

Сярод рэальных ахвяр гэтага правіла — Паша Б., трэці сын у сям'і. Вучыўся на платным аддзяленьні. Каб плаціць сыну адукацыю й кватэру, бацькі пяць гадоў мусілі трымаць шасьцёра сьвіней і начаваць зь імі ў хляве ў простым сэнсе слова, калі сьвінаматка зьбіралася стаць маці.

Апэрацыя «І»

Калі ўсё ж ты выбіў месца пад лямпачкай усімі праўдамі-сьлязьмі і няпраўдамі — штодзённымі паходамі ў дэканат са словамі «Мае бацькі бедныя, ня могуць здымаць апартамэнты, а бабкі мяне баяцца, і ўвогуле хаджу няголены трэція суткі, бо начую на вакзале», — не сьпяшайся скакаць пад неба. Апроч эшалёнаў плётак, жыхароў інтэрнатаў перасьледуе нечыстотны прывід, імя якому — адпрацоўкі. У большасьці інтэрнатаў кожны жыхар мусіць адпрацаваць на карысьць часовага прытулку 40 гадзін за год.

Фізычная праца жыхароў «сямёркі» і «шасьцёркі» БДУ заключаецца ў прыбіраньні сьнегу ды перасоўваньні мэблі ў сталоўцы пасьля дыскатэк. Жыхарам «пяцёркі» даставалася больш за ўсіх: апошнія гады беларускія студэнты тутака месьціліся пад адным дахам разам з замежнікамі. Таму праца адпаведная — мыцьцё калідорных сьцен пасьля суботніх баляваньняў кітайцаў.

У чацьвертым інтэрнаце жывуць больш заможныя студэнты — пераважна з факультэту міжнародных адносінаў і юрфаку, таму і адпрацоўкі ў іх спэцыфічныя: за 20 гадзінаў фізычнай працы яны аддаюць 20 тысячаў BLR, на якія пасьля камэндант ці загадчыца, «без сумневу», набудзе сродкі для мыцьця шыбаў.

У БДПУ ўсё нашмат прасьцей: адпрацоўкі заменены банальным дзяжурствам на кухні, што ўспрымаецца насельнікамі як сьвяты абавязак.

Калі лёс склаўся так...

А што ж з тымі, каму не пашчасьціла «прабіць» жытло?

Багацейшыя здымаюць кватэры, што зручна і заўжды прыемна з прычыны ўласнае незалежнасьці.

Аднапакаёўкі каштуюць ад 80—100 у.а. на месяц. З двухпакаёўкамі аптымальны варыянт — каля 120 у.а. на 4-х асоб. Трохпакаёвыя кватэры можна знайсьці за 170 у.а., і тады атрымліваецца сапраўдны інтэрнат з уласьцівай яму гамарняй — шэсьць хлопцаў ці дзяўчат.

Самы пашыраны варыянт сярод студэнцтва — здымаць пакой у бабкі. А апошнія бываюць розныя — ад клапатлівых «мамуль», якія ня выпусьцяць цябе галодным на заняткі, да шкадлівых сварлівых баб, якіх не задавальняе фасон тваёй бялізны, не задавальняе, што ты дакранаешся да шпалераў (запэцкаеш!), што сядзіш на канапе (праломіш!), чытаеш пасьля 23-й (чаму ж цябе Паца Ваца вучыў?!). З такой бабай трэба ня дыхаць і павісьнуць дзе-небудзь на жырандолі, каб, крый Божа, ня вытаптаць дывановую дарожку. З такімі патрабаваньнямі бабкі маглі б назначаць больш сьціплую цану. Але яны не сьпяшаюцца: пакойчык у цэнтры на дваіх каштуе 60 у.а., на ўскрайку — каля 25 у.а. з чалавека.

Я асабіста пасялілася разам з каляжанкай за горадам у Чорным замку Бараўлянскім. Балазе, не на вакзале.

Люда Асіпенка

Махлюем, але смак чуем

У вёсцы Яроміна, якая ўсутыч прылягае да Гомелю, кагадзе быў выкрыты пункт, дзе махляры падраблялі алькагольныя напоі. Міліцыя знайшла бутэлькі, стосы этыкетак, нават сапраўдныя акцызныя маркі. Муж і жонка чынілі справу спрытна і нават з пэўнай доляю сумленьня: сьпірт разьмешваўся не з абы-якой вадзіцаю, а толькі з дыстыляванай. У падманную пярцовачку не забывалі ўкінуць пярцовы стручок.

Равесьніца Багдановіча

Душой загавела Вера Рагавец — найстарэйшая жыхарка Гомельшчыны. Была яна раўналеткаю Максіма Багдановіча і мела за сваімі плячыма 113 гадочкаў.

Мінаманія

Зноўку гамельчукам няма спасу ад глузданутых дзядзькоў, якіх завуць «тэлефоннымі мінёрамі». Ледзь пасьпеў адзін такі «замінаваць» жылы дом на праспэкце Кастрычніка, як другі «падклаў бомбу» ў Інстытут радыялёгіі. Абодва затрыманы.

Сяргей Балахонаў, Гомель

Янку няма дзе вучыцца

Ужо 20 дзён сын Аляксея Лапіцкага з Жодзіна, 8-гадовы Янка, ня можа наведваць школу. Гарвыканкам зачыніў адзіную ў Жодзіне беларускую міні-клясу. Дзецям прапанавалі перайсьці на расейскамоўнае навучаньне, а статус адзінай у горадзе беларускай гімназіі (СШ №7), дзе навучаліся дзеці, скасаваны. Дзецям, якія ня хочуць пераводу на расейскую, застаецца прыходзіць на ўрокі расейскай і беларускай мовы, а астатнія прадметы вывучаць самастойна, за свой кошт наймаючы настаўнікаў і здаючы залікі пад канец году. Бацькі пратэстуюць і дабіваюцца адкрыцьця беларускае плыні.

Алесь Вольны, Жодзіна

Таксі да выцьвярэзьніка

Па баранавіцкіх вуліцах цяперака езьдзіць адмысловая машына «Спэцмэдслужба». Яна падпарадкавана выцьвярэзьніку, які адчыніўся наноў. На гэтай машыне працуе асаблівая група падбору. Зараз вызваляцца міліцыянты, якія раней «падвозілі» п'янтосаў да «вызьвярэзьніка». Супрацоўнікі гэтай установы паведамілі жыхарам гораду тэлефон, на які можна затэлефанаваць і «здаць» небараку-п'яніцу, якога хто ўбачыў на вуліцы.

30 тысяч улётак сабаку пад хвост

У баранавіцкі офіс партыі БНФ «Адраджэньне» зьявіліся 4 міліцыянты і, не паказаўшы ордэру на вобшук, канфіскавалі 30 тысяч улётак «Пяцёркі-плюс». У офісе знаходзіўся толькі старшыня мясцовай філіі АГП Сяргей Андрушчанка, якога таксама забралі ў пастарунак для тлумачэньняў. За пару гадзін да таго ў офіс заходзілі дзьве цётачкі з гарвыканкаму, каб тэрмінова атрымаць выпіску са сходу БНФ аб вылучэньні кандыдатамі сяброў партыі. Яны яшчэ падзівіліся са стосаў паперы…

Руслан Равяка, Баранавічы

Дзесяць званоў

Званіца Ільінскай царквы ў Воршы стала цяпер адной зь нямногіх у Віцебскай вобласьці, якія цалкам укамплектаваныя ўсімі патрэбнымі для службы званамі. 10 новых званоў былі адліты ў Менску на замову аршанцаў Натальлі ды Ўладзімера Панасенкаў. Гэткім чынам яны ўвекавечылі памяць аб адзіным сыне, які загінуў летась у аўтакатастрофе. Самы вялікі звон важыць 330 кг. Прыйшлося прыкласьці шмат намаганьняў і майстэрства, каб даставіць яго на званіцу, бо царква месьціцца на самым беразе Дняпра ды акружана магутнай мураванай агароджай з брамай, у якую кран ня мог праехаць. Першы агульны перазвон абыўся 18 верасьня, калі ўшаноўваўся цудадзейны абраз Аршанскай Божай Маці. Цяпер застаецца толькі займець уласнага прафэсійнага званара. На фэсьце з новымі званамі працаваў званар зь Віцебску.

Яўген Жарнасек, Ворша

Зьмены на мэдыярынку Бабруйску

Праіснаваўшы тры гады, зьнікла газэта «Крынічка Бабруйская», якую выдаваў дэпутат гарсавету Вячаслаў Сьвізуноў. Замяніла яе рэклямна-інфармацыйнае выданьне «Тэлеграф», якое распаўсюджваецца задарма ў крамах. Тым часам «Вечерний Бобруйск», заснаваны ў 2000 г., пачаў выходзіць двойчы на тыдзень і амаль у два разы павялічыў наклад. Карыстаецца попытам і першая недзяржаўная газэта «Коммерческий курьер», заснаваная ў 1991 г. Найбольш «апазыцыйнай» бабруйчане лічылі «Бобруйский курьер» — спадкаемцу традыцый выданьня, заснаванага ў 1911 г. партыяй эсэраў. На сёньня «БК» перажывае ня лепшыя часы і значна зьменшыў наклад.

Зь дзяржаўнай прэсы выходзяць орган гарвыканкаму «Бабруйскае жыццё» і райвыканкаму «Трыбуна працы». Раёнка ў шапіках не прадаецца, распаўсюджваецца толькі па падпісцы і мае наклад усяго 1441 ас.

Надзея Лісоўская, Бабруйск

«Рэформы» ў Магілёве

У Магілёве адбылася прэзэнтацыя кнігі «Беларусь: сцэнары рэформаў». Прысутныя на прэзэнтацыі прадстаўнікі навучальных устаноў і дэмакратычных арганізацый разам з аўтарамі кнігі Ўладзімерам Мацкевічам і Юрасём Ліхтаровічам правялі плённую дыскусію аб тым, калі будуць запатрабаваны лепшыя сцэнары рэфармаваньня.

Генадзь Суднік, Магілёў

Міс Беларусь каштуе 550 даляраў

Конкурс прыгажосьці 2004 г. стаў экспэрымэнтам па ўкараненьні дзяржуплыву ў мод-біз

Першы ўсеБССРаўскі конкурс прыгажосьці адбыўся ў 1988 г. Яго пераможцай стала Анжаліка Ялінская — вядомая ў свой час сьпявачка. Пазьней Ліка зрабілася «Міс фота СССР». Цяпер яна жыве ў Расеі і стала там пераможцай конкурсу «Місіс Расея».

У конкурсе «Міс СССР-90» перамогу атрымала беларуска Марыя Кежа. На радзіме дзяўчына пасьпела таксама заваяваць тытулы «Віцебская прыгажуня-88» і «Панна Беларусь-89». Цяпер яна жыве ў Францыі і працуе ў фірме «Лянсэль».

Цікава, што рэгіянальныя конкурсы прыгажосьці зьявіліся ў Беларусі раней за агульнадзяржаўныя. У Горадні абласныя конкурсы праводзяцца з 1987 г., спачатку як камэрцыйнае мерапрыемства, аднак цяпер гэта падкантрольны аблвыканкаму адборачны тур да «Міс Беларусь». Тыя, хто быў блізкі да правядзеньня такіх мерапрыемстваў у 80-я, прыгадваюць рэзкі супраціў з боку камсамольскай вярхушкі.

У сярэдзіне 90-х самымі буйнымі падзеямі айчыннага мод-бізу былі конкурсы «Супэрмадэль Беларусі» Аляксандра Варламава. Яны праводзіліся з 1992 г. Лічылася, што там значную ролю адыгрывалі грошы бізнэсоўцаў-спонсараў. І тут на самым высокім узроўні ўзьнікла пытаньне: а чаму б ня ўзяць у дзяржаўныя рукі гэтае прыбытковае і прафэсійнае мерапрыемства?

90 + 60 + 90 + маральныя якасьці

Як нам растлумачылі ў Нацыянальнай школе прыгажосьці, «Міс Беларусь» — прадстаўніца нашай краіны, якая валодае цэлым шэрагам якасьцяў. Апроч зьнешняй прывабнасьці і адпаведнасьці стандартам прыгажосьці, важныя «інтэлектуальныя і маральныя якасьці». Пераможца «Міс Беларусь» — гэта не звычайная супэрмадэль, а «прадстаўніца краіны на сусьветным узроўні». Супэрмадэлі дастаткова мець добрую фігуру і ўмець рухацца на сцэне. Гэта значыць, «фактычна іншы ўзровень арганізацыі і правядзеньня». А яшчэ сваю ролю адыграў выразна камэрцыйны характар мерапрыемства: важна было праводзіць сумленны і адкрыты выбар. Калі ж прызы ўручаліся ў капэртах, мажлівасьці для гэтага не было.

«Міс Беларусь» вырасла з конкурсу «Міс Нацыянальная мадэль Беларусі» — наступніка варламаўскай «Супэрмадэлі». Пасьля ўтварэньня Нацыянальнай школы прыгажосьці ў 1997-м пачаўся адбор удзельніц на І Нацыянальны конкурс прыгажосьці «Міс Беларусь-98». Пераможцай стала Сьвятлана Крук з Горадні. Аднак і яна, і яе наступніца «Міс Беларусь-2000» Ганна Стычынская не змаглі рэалізаваць свой патэнцыял у галіне мод-бізу. Конкурс праводзіўся пад патранажам дзяржавы, аднак тады «на высокім узроўні яшчэ не была ўсьвядомлена простая ісьціна: прыгажосьць стварае імідж краіны ня горш за спорт».

Адбіраў прэзыдэнт

За «Міс Беларусь-2002» узяліся як за падрыхтоўку да Алімпіяды. Акрамя кастынгаў, зрабілі вялікі прамоўшн конкурсу ўдзелам пераможцы ў «Міс Эўропа». Не абышлося без удзелу прэзыдэнта і тэлетрансьляцыі.

Вольга Неўдах стала першай беларускай мадэльлю, на якую працавалі ўсе СМІ. Праўда, і яна не пайшла далёка — на «Міс Эўропа» дабралася да паўфіналу, а на «Міс сьвету» не патрапіла ў дваццатку.

Канкурсанткам далі паступіць

Фінал сёлетняга конкурсу «Міс Беларусь» мусіў прайсьці яшчэ 29 чэрвеня. Аднак загадам Міністэрства культуры быў перанесены на 24 верасьня. Як меркавалі тады ў Нацыянальнай школе прыгажосьці, прычына заключалася ў паступленьні многіх канкурсантак у ВНУ. Насамрэч аказалася, што правілы конкурсу мусілі падагнаць да эўрастандартаў. «Цяпер на званьне «Міс Беларусь» можа прэтэндаваць дзяўчына 18—25 год і ростам не ніжэйшая за 176 сантымэтраў. Раней век удзельніц мог быць і 17 гадоў, а рост — 168 см», — кажа намесьніца дырэктара НШП. Праўда, праз замалы век некалькі першапачатковых фіналістак аказаліся «за бартом» конкурсу, а замянілі іх абласныя ўпраўленьні культуры без узгадненьня з НШП. «Праз гэта ды праз зьмены ў жыцьці ўжо адабраных канкурсантак, накшталт працы за мяжой, і адбыліся жнівеньскія кастынгі па ўсёй краіне», — кажуць у НШП.

Наагул, праз усе бясконцыя кастынгі, конкурс падаваўся бясконцым экспэрымэнтам па ўкараненьні дзяржуплыву ў мод-біз. Аднак апошняй кропкай тут стаў паўфінал 2 верасьня, пасьля якога экспэрты НШП адабралі 24 дзяўчыны з сотні запрошаных пасьля рэгіянальных конкурсаў для ўдзелу ў фінале. Сярод іх — тры прадстаўніцы Нацыянальнай школы прыгажосьці і па тры дзяўчыны ад вобласьці і Менску. У той жа дзень яны паехалі ў санаторыю «Юнацтва» пад Менскам, дзе зь імі правялі адпаведную падрыхтоўку і апошнія рэпэтыцыі. Дарэчы, у складзе мастацка-экспэртнай камісіі на кастынгах працавалі намесьнік міністра культуры Валер Гедройц, дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосьці Вольга Сярожнікава, харэограф-пастаноўшчык Сьвятлана Ермаловіч, стыліст Жанна Лявонава, тэлевядучы Сяргей Кухта.

Андрэй Янкевіч

Хто ў нас найлепш разьбіраецца ў дзеўках

Карэспандэнт «НН» запытаўся ў спэцыяліста НШП, ці дадуць гэтым жа асобам абіраць пераможцу «Міс Беларусь». Аказалася, што аргкамітэт конкурсу, які быў створаны ў сакавіку, падрыхтуе кампэтэнтнае журы. А ў Міністэрстве культуры зазначылі, што сябры камісіі, магчыма, далучацца да асноўнага складу судзьдзяў. Дарэчы, на «Міс Беларусь-2002» у такім кампэтэнтным журы не аказалася ніводнага прадстаўніка сьвету моды, акрамя пераможцы конкурсу 1998 г. Сьвятланы Крук. Затое прысутнічалі Іван Карэнда, на той час загадчык ідэалягічнага аддзелу Адміністрацыі прэзыдэнта, рэдактар «СаўБеліі» Павал Якубовіч, кіраўніца «Беларусбанку» Надзея Ермакова, Алена Скрыпко з тады яшчэ БПСМ, фрыстайліст Аляксей Грышын. Старшынём журы быў дырэктар Купалаўскага тэатру Генадзь Давыдзька.

У тагачасных газэтах ішла размова пра магчымы ўдзел у працы журы Аляксандра Варламава, аднак ён у фінальны склад ня трапіў. Прынамсі, запрашаць у журы вядомых асобаў — сусьветны вопыт, аднак, падаецца, мусяць удзельнічаць і прафэсіяналы мод-бізу. Паводле правілаў конкурсу, ацэньваюць канкурсантак за фотагенічнасьць, мастацтва дэфіле, узровень агульнай культуры.

550 «зялёных» замест «Опэля»

Пасьля таго як НШП стала дзяржаўнай установай і трапіла на балянс Менску, Мінкульт перадаў школе генэральныя правы на правядзеньне сёлетняга конкурсу «Міс Беларусь». Рэйтынгавая трансьляцыя застаецца за БТ.

Сярод спонсараў конкурсу ёсьць «Джэм-банк», які аплаціў галоўны прыз — Залатую карону. Яе зробяць на гомельскім ювэлірным заводзе. Інфармацыйны спонсар — «Альфарадыё». Але фундатараў у традыцыйным разуменьні конкурс ня мае. Прыярытэт на «Міс Беларусь» застаўся за дзяржавай. Яшчэ перад мінулай цырымоніяй «Міс Беларусь» А.Лукашэнка зазначыў, што конкурс «ня мусіць стаць спаборніцтвам грошай».

Гледзячы на леташнія прызы, верыцца ў словы прэзыдэнта з ахвотай. Летась грашовыя прэміі за першыя тры месцы раўняліся мільёну рублёў за першае месца (на тыя грошы 550 даляраў), 800 тысячам за другое (444 дал.) і 600 тысячам (333 «зялёных») за трэцяе. Для параўнаньня: на «Супэрмадэлі Беларусі'97» прызам быў новы аўтамабіль «Опэль». Інфармацыя пра сёлетнія сумы ў Мінкульце пакуль не распаўсюджваецца. «Аднак гэта будуць сапраўды грунтоўныя ўзнагароды», — адзначае галоўны спэцыяліст упраўленьня навучальных устаноў і кадраў Мінкультуры Валер Грамада. Праўда, у гэта ня надта верыцца. Аднак больш важкай бачыцца мажлівасьць прадставіць краіну на конкурсе «Міс Эўропа», які пройдзе ў Францыі ў лютым наступнага году.

Што ўбачым?

На конкурсе чакаецца вялікае пастановачнае шоў ад Вячаслава Паніна. Паказ будзе складацца з чатырох частак — дэманстрацый вячэрніх туалетаў, народных і купальных касьцюмаў, моладзевага (спартовага) адзеньня. Як сказалі «НН» у НШП, ва ўсіх намінацыях, апроч спартовага касьцюму, будзе паказана адзеньне беларускай вытворчасьці. «Адмыслова для дэманстрацыі моладзевага (спартовага) адзеньня адзін са спонсараў дасьць калекцыю ад «Adidas», — паведамілі ў НШП.

Пераможцаў вызначаць у намінацыях «Міс Беларусь», «І Віцэ-міс», «ІІ Віцэ-міс», «Міс чароўнасьць», «Міс фота». Даволі млява рэагавалі гледачы: 2/3 залі запоўнілі сіламі БРСМ, заўжды гатовымі назіраць за нагамі і таліямі. Сёлета, як кажа намесьніца дырэктара Нацыянальнай школы прыгажосьці, запрашальнікі на конкурс 24 верасьня ў Палац рэспублікі можна будзе атрымаць без асаблівых праблем: «Галоўнае — сачыць за рэклямай у СМІ».

Сяргей Трафілаў

Тайная і яўная ўлада

Хараство на гістарычным подыюме

20 год таму ў выкрывальніцкім фільме «Дакумэнт Р» жаночыя ножкі крочылі па экране і сымбалізавалі сабой разбэшчаны і варожы ўсяму прагрэсіўнаму чалавецтву буржуазны лад. Сёньня гэтыя ножкі шпацыруюць разам і заклікаюць — у рэклямным роліку тэлевізіі — да конкурсу на чарговую Міс. Паміж гэтымі падзеямі — тэктанічны зрух эпох. Многія кажуць, што хараство — гэта ўлада. Але чыя гэта ўлада, хто і калі яе скарыстоўваў?

Андрэй Расінскі

Антычныя філёзафы пагаджаліся, што з прыгожым чалавекам час бавіць прыямней і на яго зьвяртаюць болей увагі. Сучасныя дасьледчыкі толькі пацьвярджаюць, што пекным людзям прасьцей знайсьці працу, а ў судох да іх ставяцца памяркоўней.

Хараство Алены выклікала Траянскую вайну, а пекната гетэры Аспазіі была і прычынаю, і апраўданьнем скандалу з Пэрыклам.

Але ўлада жаночага хараства была выняткам у антычнай гіерархіі, дзе рэй ва ўсім вёў мужчына. Так што эталёнам прыгажосьці лічылася зусім не дзяўчына, а годны юнак. Алімпіяды былі тагачаснымі конкурсамі прыгажосьці. Целы былі мужчынскімі. Уваход на сьвяты жанчынам быў забаронены.

Атэнскі фарсун Альцыбіяд прыцягваў дзяўчатак, а мужчыны кідалі дзеля яго жонак. Але калі першы прыгажун вырашыў заляцацца да вірлавокага Сакрата, мудраца зь цельпукаватым тварам і вялізным ілбом, то атрымаў афронт. Стары і хітры Сакрат шанаваў уладу іншую — і аддаваў перавагу разумовым практыкаваньням.

А Юлі Цэзар, які й сам ня быў эталёнам цнатлівасьці, выводзіў сваё імпэрскае паходжаньне ад Вэнэры, што дадаткова ўзаконьвала ягоную ўладу. Але ўлада рымскіх багоў не пашыралася на ягоную каханку Клеапатру, якая і завяршыла сваё жыцьцё ў абдымках з кобраю.

Дзева Марыя, Рагнеда і Эўфрасіньня

Прыгажосьць Сярэднявечча — гэта цнатлівая пекната дзевы Марыі. Абразы падкрэсьліваюць духоўны пачатак, велізарныя вочы працінаюць верніка. Цела, агорнутае шатамі, не належыць гэтаму сьвету.

Экстаз сьвятой Тэрэзы Лярэнца Бэрніні ёсьць самым непрыхаваным і найлепшым аргазмам усіх часоў і народаў.

Мадам Рэкам'е, жонка апазыцыянэра.

У Беларусі жаночае хараство, якое ня здольны прысабечыць і скарыстаць сьвет, ператвараецца ва ўладу — духоўную і дзяржаўную.

Жыцьці падкрэсьліваюць пекнату князёўны Прадславы, якая не пажадала аддаць сваё хараство на абмен паміж тутэйшымі мужчынскімі родамі. У выніку нарадзілася Эўфрасіньня, нявеста Хрыстова, улада якой не зьнікае й сёньня.

Пра пекнату Рагнеды летапісы маўчаць, але можна меркаваць, што яна была даволі высока ацэненая Ўладзімерам (уверсе — карціна мастака XVIII ст. Антона Ласенкі «Ўладзімер перад Рагнедай»). Праўда, пекната гэтая так і не была ім напоўніцу прысабечаная, пра што сьведчыць і спроба забойства князя.

Некаторыя злыя языкі разглядаюць Рагнеду ў якасьці тагачаснай Лярэты Бабэт, жанчыны-мсьціўцы, якая зьбіралася пазбавіць мужа ня столькі жыцьця, колькі вельмі важнага органа, — але гэта сучасныя нізкія плёткі.

Ва ўсялякім разе, жаночая пекната Рагнеды ёсьць аўтаноміяй і адмысловым сьцьвярджэньнем дзяржаўнасьці, якая нараджалася й узмацнялася на беларускіх землях.

Але і Рагнеда, і Эўфрасіньня знаходзяцца ў засені дзевы Марыі, і нездарма паданьні кажуць, што Рагнеда пры канцы жыцьця сышла ў манастыр.

Адваротным бокам «мацярынскай цнатлівасьці» зьяўляецца ведзьма — але толькі ў часы Рэнэсансу ведзьма заняла сваё пачэснае месца.

Дэкамэрон, ведзьмы і Мона Ліза

Пад канец Сярэднявечча адбыўся выбух вядзьмарскіх працэсаў. Інквізытары Шпэнглер і Інсысторыс бачылі ведзьму ў кожнай пекнай жанчыне і ў вышукоўніку «Maleforum Magneficarum» давалі падрабязныя інструкцыі, як яе катаваць.

А ў рамане Бакача «Дэкамэрон» юнакі і дзяўчаты хаваліся ад пошасьці й распавядалі эратычныя гісторыі. Цела набыло плоць, пажаду, пачуцьці — і акрэсьленую індывідуальнасьць.

Выбух сыфілісу, абортаў, альхіміі — а на паверхні прапарцыйная пекната выявы.

Патаемная ўсьмешка Моны Лізы хавае ў сабе гармонію й усьмешку Прыроды, але пільны доктар Фройд заўважыў у ёй аўтапартрэт Леанарда і вычварны мужчынскі позірк.

Сьвятая Тэрэза ў экстазе

Царква не магла абмінуць плоцевай разьняволенасьці, але надала ёй характар рэлігійнага фанатызму. Экстаз сьвятой Тэрэзы Лярэнца Бэрніні, урачыста выстаўлены ў храме, ёсьць самым непрыхаваным і найлепшым аргазмам усіх часоў і народаў. Загрувашчанае скамечанымі шатамі цела лунае на воблаку, зробленым з каменю. Такое спалучэньне неспалучальнага звычайнае для барока.

У Беларусі была свая мадэль барочнай прыгажосьці: дзяўчынка павінна была быць бляндынкай, золатавалосай, але з чорнымі вачыма. Тонкая талія, у адрозьненьне ад рубэнсаўскіх мадэляў, абавязковая.

Мадам Рэкам'е і шляхецкія грудзі

Яна ляжыць на канапе ў клясычным антычным убраньні. Мадам Рэкам'е, заснавальніца ўплывовага салёну, на карціне Жана Люі Давіда ня столькі кіруе, колькі сьведчыць пра ўладу. І хаця Жулі Рэкам'е ў апазыцыі да Напалеона, яе ўлада таксама імпэрская. Пануюць завітушкі ампіру, які вырас з халоднага клясыцызму, заклапочанага абавязкамі перад аўтарытарнай дзяржавай.

Кабета й не павінна кіраваць. Але вочы яе ведаюць, што кажуць мужчыны: «Мы кіруем сьветам, а намі — жанчыны».

Польскі шляхціц распавядае, як у беларускім заціішшы сутыкнуўся зь дзяўчынай радзівілаўскага роду: «Застаўшы яе з цалкам адслоненымі грудзямі, якія закрыць пры маім уваходзе яна не захацела, я пачаў сумны кампліімэнт, аднак закончыць яго ня здолеў, бо ўся мая ўвага расьсейвалася тымі прыгожымі грудзямі».

Грудзі лепей схаваць пад антычнаю драпіроўкаю. Сьведчаньне пра ўладу — пакінуць.

Паміж каханкам і прывідам

Пекната эпохі рамантызму — гэта поўня, містычныя ўздыхі, бледны твар, шэпты, анэмія, наканаваньне. Пажадана бачыць і адчуваць здані, быць здольнай страціць прытомнасьць — і дачакацца выратавальніка. І ня тое каб дзяўчатам вельмі хацелася марынаваць сябе цёмнымі замкамі і хавацца на могілках. Абраньнікі абавязваюць.

Найлепшы сябра дзяўчыны — пачвара. Гарбун з Нотр-Даму, зроблены зь мёртвых целаў Франкенштэйн, падыдзе і лорд Байран, які прымярае на сябе маску дэмана і даводзіць сваіх каханак да шаленства.

Клясавы тэмпэрамэнт

Сухотная ахвяра любошчаў з прывідамі — гэта клясавы эталён аслабелай арыстакратыі. У іншых груп — свае мадэлі. Так, купчыха мусіць быць мажнай, тоўстай, круглатвараю, з пульхнымі пальцамі — і зь імбрычкам на стале.

У некаторых плямёнах найлепшая прыгажуня — гэта кабета настолькі тоўстая, што падняцца й хадзіць яна ня здольная. А вось сялянка XIX ст. — гарманічна складзеная,

Барбара Радзівіл, жонка караля.

Працяг на старонцы 10.

Беларускі тыпаж

Сяргей Харэўскі

Прыгажосьць — не зусім суб'ектыўны панятак. Прыгажосьць чалавечая — гэта крытэр, што выпрацоўваецца калектыўнай сьвядомасьцю. Найчасьцей зыходзячы з натуральных, цалкам матэрыялістычных меркаваньняў. Ад часоў палеаліту чалавек выяўляў, напрыклад, ідэальную жанчыну: ледзь прыкметныя рысы невялічкага твару, густыя валасы, вялізарныя грудзі й клубы, пукаты жывот і выразна падкрэсьленыя геніталіі. Прамінулі тысячы гадоў, а тыя ж мужчынскія ўяўленьні, зь невялікімі карэкцыямі, датрывалі да нашых часоў — жанчына як сымбаль плоднасьці. Менавіта такая яна выклікае пажаду.

Цікавасьць да этнічнага ідэалу жанчыны ўзьнікла ў беларускім мастацтве прыкладна ў сярэдзіне XIX ст. Варта згадаць «Жняю» Кнута Русецкага альбо жончыны партрэты Івана Хруцкага. Ідэальны вобраз лёгка пазнавальны — цёмна-русыя валасы, карыя вочы, чорныя бровы сярпом, «асіная» талія й тугі гарсэцік.

Гэты стэрэатыпны ідэал, роўна прыдатны і да вобразу мілай сялянкі, і да Маці Божае, датрываў да 10-х гадоў мінулага стагодзьдзя, калі на гістарычную й мастакоўскую арэну выйшаў «мужык-беларус». З пачаткам «беларусізацыі» ў нашым мастацтве ўзьнікае новы вобраз — здаровай крамянай сялянскай дзяўчыны з блакітнымі вачыма, дужымі нагамі і ў народным прасторным строі. Але гэты этап, запачаткаваны М.Станютам і М.Філіповічам, аказаўся даволі кароткім. На зьмену ідэалізацыі нацыянальна й сацыяльна разьняволенай беларускі прыйшло апяваньне новых рэаліяў. «Калгасьніцы» й «Камсамолкі» засьцілі сабою ўсё.

Вытанчаная жняя Канута Русецкага, заходнебеларускі нацыянальны ідэал Міхася Сеўрука і эратычна-імпульсіўная мроя Рыгора Паплаўскага.

Спробы вылучыць нацыянальны ідэал яшчэ трывалі ў Заходняй Беларусі ў Міхася Сеўрука й Пятра Сергіевіча.

Напрыканцы 1960-х гадоў вобраз беларускае жанчыны ўзяліся распрацоўваць самі жанчыны — Аляксандра Пасьлядовіч і Алена Лось. У Пасьлядовіч цэлая нізка гэтак і звалася — «Беларускія жанчыны». Да яе, бадай, ніхто не падыходзіў да гэтае тэмы так канцэптуальна.

Яшчэ адным прарывам у кірунку ўсталяваньня нацыянальнага ідэалу сталі «Купалінкі» Анікейчыка. Гэтая фантанная скульптура ў парку імя Янкі Купалы й сёньня ўражвае. Гэта быў першы твор эратычнага мастацтва ў жанры манумэнталізму ў XX ст. Гэты фантан акрэсьліў мяжу ў гісторыі беларускае скульптуры, падзяліўшы яе на постсталінскі, суворарэалістычны кшталт і, пасьля Анікейчыкавых дзяўчат, на рамантычны, з прыхаваным эратызмам, кшталт аптымістычны.

Цалкам новым этапам пошукаў беларускага этнічнага ідэалу сталі гады на сумежжы 1960-х і 70-х. Найперш гэта выявілася ў графіцы. У сьвет вялікага мастацтва прыйшла генэрацыя гадаванцаў уласна беларускае мастакоўскае школы — Кашкурэвіч, Шаранговіч, Кулік, Асецкі, браты Басалыгі, Паплаўскі… На зьмену статычным і дэкаратыўным кампазыцыям папярэднікаў гэтыя маладыя творцы прапанавалі сваё імпульсіўнае бачаньне. Варта, напрыклад, паглядзець на «Жняю» Паплаўскага альбо «Камвольшчыц» Дзямарына, у якіх вытворчы працэс нагадвае нейкую эратычную мрою: караценькія спаднічкі, аблягаючыя халацікі, голыя лыткі...

> Даўгатварыя, проставалосыя й сьмелыя. Высокія, велікавокія, пышнагрудыя. Пяшчотныя й трывалыя, летуценныя й рашучыя.

У 1970-я гады склаўся новы тыпаж беларускі — з пукатымі формамі, высокімі грудзямі, сьветлымі вялікімі вачыма й русымі валасамі. І чамусьці абавязкова ў хустачках, завязаных ззаду.

У 1980-я беларусы ўсё больш упарта шукалі нацыянальнай тоеснасьці. Варта толькі паглядзець на тыя тыпажы, што распрацоўвалі тады графікі Селяшчук ці Савіч, жывапісцы Вашчанка ці Рагалевіч, скульптары Гумілеўскі ці Слабодчыкаў, каб пераканацца, што перад імі, апроч іншага, стаяла задача і антрапалягічнай адпаведнасьці. Сапраўднай нардычнай адпаведнасьці. Менавіта іхныя даўгатварыя, проставалосыя й сьмелыя жанчыны сталіся стэрэатыпнымі. Вось яны якія — высокія, велікавокія, пышнагрудыя. Пяшчотныя й трывалыя, летуценныя й рашучыя.

Тайная і яўная ўлада

Працяг са старонкі 9.

бо працуе ў полі, мусіць нарадзіць і выхаваць дзяцей — і павінна быць ня толькі працаўніцаю, але й матуляй, якая сьпявае дзецям калыханкі.

Ад Паўлінкі да бабы зь вяслом

Паўлінка — тая ж сялянка, дасьціпная й імпэтная. Зь цягам часу клясава-працоўныя характарыстыкі выйшлі на першы плян. Бронзавая сялянка Мухінай — побач з рабочым. Цела — працоўны агрэгат на заводзе ці ў полі, зброя клясавага змаганьня, падкантрольная і зашыхтаваная адзінка.

Перадавыя даяркі, ткачыхі, ільнаводкі. У парках — ананімныя бабы зь вяслом і ў футарале арганізаванага адпачынку.

Найлепшыя калгасьніцы з трактарамі й мэдалямі. Серп лёгка замяніць на зброю — і атрымаецца клясавы партрэт партызанкі. «Радзіма-маці кліча!» вяртае да архаічных патрыярхальных мадэляў, калі жаночы вобраз энэргічна й пасьпяхова выкарыстоўваецца ў прапагандзе.

У фільме «Ўсходні калідор» жаночае хараство супрацьпастаўленае ананімнай сыстэме.

Але звычайна маці — таксама яшчэ працаўніца. Мэдалі за мацярынства, ордэн маці атаясамліваюць нараджэньне й выхаваньне дзяцей зь бітвай за ўраджай, з працоўнымі посьпехамі, з вытворчасьцю фабрыкі ці заводу. Пекната — у выкананьні пляну, у змаганьні за сьветлую будучыню ўсяго чалавецтва.

Як клясава-працоўная адзінка, жанчына траціць індывідуальныя характарыстыкі па-за межамі гаспадарчых паказчыкаў, а пра цела і казаць няма чаго. Дарэчы, адпаведна ніякавее й бялізна. Калекцыя жаночай бялізны, употайкі вывезеная з СССР, выклікала ў Францыі фурор сваёй непрыхаванай пачварнасьцю.

Але насамрэч ня ўсё было так змрочна. Непадкантрольная прыгажосьць прабівала сабе шлях, расчышчала тэрыторыю. У творах Шамякіна дзяўчаты ня толькі змагаліся за плян, але спрабавалі спалучаць гэты плян з правам на сваю пекнату. У межах дазволенага Шамякін нават дапускаў эратычныя сцэны.

У Беларусі квітнелі мэлядрамы Шульмана і Сплашнова з каханкамі, цешчамі, дочкамі. А Валянцін Вінаградаў у фільмах «Усходні калідор» і «Лісты да жывых» супрацьпаставіў жаночае хараство ананімнай сыстэме — што выклікала іх забарону.

Эталёны прыгажосьці, прапорцыі, прычоскі, твары зьмяняліся разам з часам. Любоў Арлова — узор і зорка 30-х гадоў, Тацяна Самойлава — 50-х, Тацяна Дароніна — 70-х. Марлен Дытрых, Мэрлін Манро, Брыджыт Бардо. У Беларусі народныя тыпажы Макаравай і Ржэцкай, танюткая, іншая пекната Любові Румянцавай у «Альпійскай балядзе».



АНАТОЛЬ КЛЯЦЧУК

Як клясава-працоўная адзінка, жанчына траціць індывідуальныя характарыстыкі па-за межамі гаспадарчых паказчыкаў.

Не зьмяняецца — і зьмяняецца — толькі Паўлінка.

Напрыканцы жыцьця сэкс-сымбалем абвяшчаюць Стэфанію Станюту.

Вялікі Дэфілятар

На конкурсе прыгажосьці — абавязковы выхад у купальніках. Кантраст з савецкай эпохай. Стандартныя працэдуры адбору й дрэсуры: спачатку з твару прыбіраецца асобнасьць, атрымліваецца ананімная абалонка — якую й фасуюць на пэўныя тыпы. Улада ананімнае пекнаты.

Але чыя гэта ўлада й чый гэта позірк? За кожным конкурсам прыгажосьці стаіць свой Вялікі Дэфілятар — улада грошай, улада групоўкі, улада палітыка, які жадае палепшыць свой імідж.

Гэта тайная, прыхаваная мужчынская ўлада, і так было заўжды і здаўна, бо мужчыны валодаюць грашыма, палітычнай і дзяржаўнай сілаю. Для мужчын — сур'ёзная палітычная барацьба, для жанчын — спакушальна-парадыйныя конкурсы прыгажосьці, якія ствараюць ілюзію ўлады.

Хаця гаворыцца пра «разумовыя здольнасьці», жаночага голасу не чуваць, бо галоўнае — «стандартныя парамэтры».

Хаця кожная жанчына ведае, што яна прыгожая, мусіць быць агульная форма для кантролю.

Пекната жанчыны — сымбалічны тавар, які фасуецца й прадаецца для позіркаў заклапочаных спажыўцоў. І калі саміх беларускіх жанчын прадаюць на Захад, ёсьць спакуса скарыстаць прыгажосьць для ўнутрыпалітычных рэйтынгаў. Але ў такім выпадку дзяўчаты толькі прышпілены да чарговага Вялікага Дэфілятара, які спадзяецца быць самым пекным, самым прыгожым, самым каранаваным.

За гэтым Дэфілятарам будзе другі, потым яшчэ адзін і яшчэ — пакуль яўная, несхаваная ўлада хараства не пачне гаварыць сваім голасам.

Сем Вэнэраў

Тысячагодзьдзі хаваюць ад нас гісторыю стварэньня Вэнэры Мілоскай. Невядома, ці існаваў у родным полісе скульптара якісьці худсавет, на які творца з трымценьнем сэрца выстаўляў свой шэдэўр, невядома, ці ацэньвалі яго на прадмет адпаведнасьці ідэалам дэмакратыі (а мо алігархіі ці тыраніі). Невядома, як рэагавала дзяржпрыёмка і з чыіх вуснаў прагучала прапанова: «А мо ёй рукі адбіць?..». Ва ўсе вякі чалавек пры ўладзе ня мог ігнараваць сілу прыгажосьці, імкнуўся скіраваць яе ў патрэбнае рэчышча, зь яе дапамогай кіраваць грамадзтвам. Як зьмяняўся афіцыйны ідэал жанчыны ў Беларусі за апошнія 60 гадоў? Лічым ад сканчэньня вайны — негалоснага «пункту адліку» дзяржаўнасьці для сёньняшняе ўлады. За эталён бяром выяву ў галоўнай дзяржаўнай газэце краіны ад 8 сакавіка.

1974

Позірк А.Вярышкі з-пад будаўніцкае каскі выклікае неадольнае жаданьне ўсё кінуць і паехаць за чароўнай ударніцай будаваць Лукомскую ДРЭС.

60 гадоў таму. Ваярка

Дакладней, не 60, а 59. Бо асобніка тады яшчэ партызанскай газэты «Звязда» за сакавік 1944 г. няма нават у сховах Нацыянальнай бібліятэкі. Давялося ўзяць за 1945-ы. Ідэальных жанчын на першай старонцы аж чатыры — тры лётчыцы гвардыі ды «адважная беларуская партызанка Анна Маслоўская» (правапіс арыгіналу) на фоне Спаскае вежы.

А ў сьвяточным тэксьце малюецца зусім не амазонка, але жанчына-маці, якая «з затоеным дыханьнем прыслухоўвалася да далёкіх раскатаў савецкай артылерыі, пасылала благаславеньне мужу і брату — байцам Чырвонай арміі, а сына малодшага выпраўляла ў лес, у партызаны, вучыла яго любіць і абараняць Радзіму як родную маці, літасьці ня мець да нямецкіх чужынцаў, сама праводзіла яго па сьцежках, што вядуць праз пушчы, нетры, балоты да перамогі». У рэчышчы канкурэнцыі добрага зь яшчэ лепшым згадваецца і трактарыстка Елена Чэркас, якая апрацавала 552 га замест 118 плянавых і зэканоміла 960 кг паліва.

50 гадоў таму. Камсамолка

8 сакавіка прыпала на панядзелак — дзень, калі «Звязда» не выходзіла. Таму Вэнэрай 1954-га будзем лічыць работніцу МАЗу, камсамолку Т.Кузьняцову, што напярэдадні выступала на сходзе «камсамольцаў і моладзі» «ад імя ад'яжджаючых у Казахстан на асваеньне цалінных і абложаных зямель». «Мы — камсамольцы! У нас гарачыя неспакойныя сэрцы. Мы змагаемся за шчасьце нашай краіны і не пашкадуем сіл для ажыцьцяўленьня вялікай мэты, пастаўленай перад намі». Сфатаграфавана Т.Кузьняцова шаблённа, не па-мастацку. Дый гэта не было галоўным. Галоўнае — каб «родная камуністычная партыя» натхняла. Адкрываў той сход будучых «камуністаў і беспартыйных» сакратар ЦК ЛКСМБ Машэраў.

40 гадоў таму. Даярка

У 1964-м першую старонку займаюць зварот ЦК КПСС «Да савецкіх жанчын» і даклад тав. М.С.Хрушчова, прысьвечаны інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасьці. Той самы даклад займае і наступныя дзьве старонкі. Вэнэры 1964-га — аж на апошняй. Усьмешлівыя дзяўчаты з Камвольнага. «А вясёлыя ўсьмешкі ў іх таму, што сёньня іх жаночае сьвята, і таму, што яны ўдарніцы камуністычнай працы», — тлумачыцца ў подпісе.

30 гадоў таму. Сяброўка

Самае душэўнае і прадуманае віншаваньне з усіх. Над лягатыпам «Звязды» гульлівае «Са сьвятам, дарагія сяброўкі!» з алюзіяй на «Беларусачку». Дый беларусачкі там якія! Позірк А.Вярышкі з-пад будаўніцкае каскі выклікае неадольнае жаданьне ўсё кінуць і паехаць за чароўнай ударніцай будаваць Лукомскую ДРЭС. Нават замшэлы ЦК КПСС у рытуальным звароце распусьціўся настолькі, што пажадаў сярод іншага «вялікага шчасьця і радасьцяў у жыцьці». І гвазьдзікоў на каляжы два — паводле беларускай традыцыі.

Яшчэ адна навіна — апытаньне жанчын на тэму «Самы шчасьлівы выпадак майго жыцьця». Сярод стандартных адказаў «Хіба ня шчасьце — у першы дзень самастойнай работы перавыканаць зьменнае заданьне?» упершыню гучыць голас беларускі-палітыка. Марыя Карпенка, рэдактарка часопісу «Работніца і сялянка», была ў складзе дэлегацыі ў ААН: «Было радасна бачыць, як пасланцы розных краін сьвету актыўна галасавалі за выбраньне нашай рэспублікі членам Савету Бясьпекі».

Усё нацыянальнае ў Вэнэры 84-га старанна зьнівэляванае.

1984

20 гадоў таму. Інтэрнацыяналістка

Тут маем ужо разьвіты вобраз палітычна заангажаванае жанчыны. Заміж таго каб прыслухоўвацца да далёкай кананады, кабета сама змагаецца за мір — у рабочым камбінэзоне на фоне памятнага па савецкім ТБ «міжнародна-панарамнага» глёбуса. Віншавальны зварот ЦК падкрэсьлівае, што краіна ў коле ворагаў: «Па віне агрэсіўных імпэрыялістычных колаў абстаноўка ў сьвеце рэзка абвастрылася». Усё нацыянальнае ў Вэнэры 84-га старанна зьнівэляванае. Да перамогі камунізму і ўліцьця беларусаў з братняю Русьсю ў савецкі народ заставалася ж так нямнога…

Сьвяточная менская кінаафіша таго году чытаецца як сюжэтнае апавяданьне: «Адзінокім даецца інтэрнат» — «Кахаю. Чакаю. Лена.» — «Рэцэпт яе маладосьці» — «Я цябе ніколі не забуду» — «Любоў Арлова» — «Прызнаць вінаватым».

10 гадоў таму. На выбар

У 94-м беларуская афіцыйная прэса мела ўжо іншага флягмана — «Народную газету», орган Вярхоўнага Савету з накладам у 612 тысяч.

Рыхтаваць чытачоў да Жаночага дня «НГ» пачала яшчэ 4 сакавіка публікацыяй «Мечыслаў Грыб сярод беларускіх жанчын». Кіраўнік дзяржавы наведаў Беларускі саюз жанчын: «Сустрэча прайшла, як сказалі б раней, у шчырай і сяброўскай атмасфэры, абодва бакі адзначылі супадзеньне поглядаў. Спрылі гэтаму і добрая кава на сталах, смачныя бутэрброды, цукеркі, прыгажосьць жанчын, пахі французкай парфумэрыі».

У наступным нумары жанчын павіншавалі прахадным трыптыхам «Не опадает цвет у женской красоты» і зваротам Прэзыдыюму ВС. «Трывожны час перажывае наша краіна. Нам неабходны ўзаемаразуменьне, разважлівасьць, мудрасьць у імя захаваньня грамадзянскай згоды і міру. Над плянэтай павінна быць чыстае неба і яснае сонца!» У стылістыцы адчуваецца яшчэ магутная савецкая інэрцыя. Нават у сёньняшняй «Саўбеліі» такой няма.

Крыху ніжэй «НГ» вітае з прафэсійным сьвятам міліцыю: «Віншаваньні і песьні вартавым правапарадку». Яшчэ адзін цікавы загаловак на той самай паласе — «Беларускія бізнэсмэны сьцьвярджаюць, што ў нас ёсьць шанец за год-два падняць нашы прыбыткі да 250—300 даляраў на чалавека». Гэта быў час разгубленасьці і ілюзій.

Сёлета. Суайчыньніца

Новая зьмена прэсавага флягмана. На першай паласе «Советской Белоруссии» — супэрмадэльнае фота і віншавальны зварот кіраўніка дзяржавы, які пачынаецца словамі: «Дарагія суайчыньніцы». Між радкоў чытаецца яшчэ ЦКоўская рытуальнасьць, але што тычыцца выявы — сапраўдная рэвалюцыя. Ад жанчыны не патрабуецца актыўнага суўдзелу ў будаўніцтве новага ладу, як у савецкі час. Сёньняшні ідэал жанчыны — супэрмадэлька для конкурсу. Бяздумная красунька на стале ў носьбітаў улады і грошай, якую турбуюць толькі спажываньне, сэкс і захаваньне ўласнага хараства.

Сяргей Мікулевіч

1994: Мечыслаў Грыб сярод беларускіх жанчын.

Беларускія прыгажуні і іхны лёс

АЛЕНА АДАМЧЫК

Першая «Міс БССР» **Анжаліка Ялінская** зьмяніла прозьвішча (Агурбаш) ды грамадзянства і стала пераможцай конкурсу «Місіс Расея». «Міс СССР-90» беларуска **Марыя Кежа** жыве ў Францыі і працуе дызайнэркай у фірме «Лянсэль». Яна распрацоўвае новыя мадэлі жаночых аксэсуараў.

WWW.DIVA.BY

Сьвятлана Крук з Горадні — «Міс Беларусь-97» — пабралася шлюбам і пераехала ў Маскву, дзе працуе мадэльлю ў агенцтве «Прэзыдэнт».

WWW.DIVA.BY

Яе наступніца «Міс Беларусь-2000» **Ганна Стычынская** скончыла сёлета з чырвоным дыплёмам пэдагагічны каледж, з чэрвеня 2004 г. працуе мэнэджэркай-мадэратаркай Агенцтва моды Сашы Варламава.

Вольга Неўдах стала першай беларускай мадэльлю, на якую працавалі ўсе СМІ. Аднак на «Міс Эўропа» яна дабралася толькі да паўфіналу, а на «Міс сьвету» нават ня трапіла ў дваццатку.

WWW.DIVA.BY

Новы крыжовы паход

Віталь Тарас

Бойня ў Бэслане шакавала расейскае грамадзтва. Ні гібель самалётаў перад тым, ні трагедыя «Норд-Осту» такога ўзрушэньня не выклікалі. Ня толькі расейцам, але й беларусам важна зразумець — чаму?

Справа ня толькі ў бесчалавечнасьці ваеўнікоў і гібелі дзяцей. Хіба захоп раддому быў больш гуманным актам? Хіба пры штурме тэатру на Дуброўцы загінула мала дзяцей? Прыйдзецца дапусьціць, што або іх колькасьці было тады недастаткова, каб шакаваць, або гібель ад рук «сваіх» спэцназаўцаў не ўспрымаецца ў Расеі як трагедыя. Дарэчы, успомнім: прыкладна год таму падчас пажараў у дзіцячых інтэрнатах Расеі цягам некалькіх дзён загінула дзяцей больш, чым на Дуброўцы. Расея тады нават брывом не павяла — прынамсі, калі меркаваць па эфіры маскоўскіх тэлеканалаў, перапоўненых забаўляльнымі перадачамі.

Цяпер, дарэчы, стала вядома, што ваеўнікі ў сьпіны дзяцей, якія пачалі ўцякаць пасьля выбуху ў школьнай спартзалі, не стралялі (што абсалютна не здымае з тэрарыстаў віны). Большасьць школьнікаў сталі ахвярамі шквальнага перакрыжаванага агню асэтынскіх апалчэнцаў, спэцназу й тэрарыстаў. Тут напрошваецца аналёгія з падзеямі расейскай гісторыі — гісторыі, зрэшты, не такой ужо і даўняй. У 1962-м у Новачркаску ўнутраныя войскі атрымалі загад страляць ва ўдзельнікаў мірнай дэманстрацыі рабочых, якія пратэставалі супраць павышэньня цэнаў (як у Менску ўвесну 91-га). Першы залп быў папераджальны — стралялі па вяршынях дрэў. І першымі ахвярамі сталі менавіта дзеці, якія залезьлі на дрэвы, каб было лепш відаць. Так што ў расейскіх спэцвойскаў ёсьць пэўныя традыцыі, якія ідуць ад НКВД і загараджальных атрадаў. І традыцыі гэтыя пры сучасным кіраўніцтве ў Расеі ніколькі не асуджаюцца, а ўсхваляюцца.

Шок быў выкліканы іншымі, далёкімі ад чалавекалюбства, прычынамі. ФСБ разам з усялякімі «Вымпэламі» прадэманстравала сваю поўную бездапаможнасьць і тапорнасьць у барацьбе з тэрарызмам. Як трапна выказалася паліталягіня Лілія Шаўцова ў «Московских новостях», спэцорганы ў Расеі стваралiся зусім не для гэтага, а выключна для аховы ржыму. І гэты рэжым захістаўся пад ударамі тэрарыстаў, колькасьць якіх непараўнальна меншая за колькасьць гітлераўскіх войскаў альбо войскаў НАТО — заўсёднага ворага пасьляваеннага СССР, а потым і Расеі. І зусім не тэрарысты (чытай — чачэнцы) абвясьцілі вайну Расеі, як заявіў Пуцін. Гэта Расея ўсчала вайну ў Чачэніі акурат дзесяць год таму. За гэты час выявілася, па-першае, што ўлада Масквы ня можа трываць інакш як у стане пэрманэнтнай вайны, а падругое, яна ня можа перамагчы, нават маючы тысячаразовую перавагу над праціўнікам. Трагедыя ў Бэслане стала сьведчаньнем чарговай паразы, Цусімай XXI ст. для крамлёўскага кіраўніцтва.

Натуральна, такая параза патрабуе нейкага апраўданьня — і ня толькі для ўладаў, але й для народу. Як сказаў адзін нямецкі паліталяг, Гітлер у 1933-м не падмануў свой народ, ён зачараваў яго. Зрэшты, тое самае можна сказаць і пра Лукашэнку ў 94-м, і пра Пуціна ў 2000-м. Апраўданьне павінна быць фундамэнтальным, заснаваным на сусьветнай ідэалёгіі — на меншае расейскі чалавек зь яго «шырынёй душы» ня згодны. І вось у «Известиях» (пасьля таго, як галоўны рэдактар Раф Шакіраў быў зьняты з пасады праз тое, што ў фотарэпартажы на старонках газэты паказаў чытачам, што адбывалася ў Бэслане) друкуецца свайго роду апраўдальны маніфэст праваслаўнага багаслова айца Кураева.

З адной тэзай Кураева можна згадзіцца. Бэслан стаў для Расеі тым рубяжом, за якім няма вяртаньня назад. Альбо яна паспрабуе застацца адносна дэмакратычнай, хай сабе карумпаванай дзяржавай, альбо гэта будзе краіна, дзе праваслаўныя сьвятары будуць бласлаўляць хрысьціянскіх ваяроў агнём і мячом вынішчаць «няверных».

Артыкул Кураева, прысьвечаны Бэслану й ролі ісламу ў сучасным сьвеце, паказвае абазнанасьць аўтара ня толькі ў эвангельскіх тэкстах, але і ў сурах Кур'ану. Пры гэтым увесь тэкст можна зьвесьці да некалькіх тэзаў. Зьверствы тэрарыстаў у Бэслане, на ягоную думку, засьведчылі той факт, што ў Расеі йдзе вайна радыкальнага ісламу супраць хрысьціянства. Фактычна іслам у цэлым, як рэлігія, а ня толькі яго радыкальныя адгалінаваньні, абвяшчаецца айцом Кураевым адказным за ўсе тэракты ў Расеі ды за яе межамі. Але ня толькі мусульманскі сьвет павінен несьці адказнасьць, працягвае багаслоў. На яго думку, тэракты плянуюцца й накіроўваюцца Захадам, у руках якога ісламскія фундамэнталісты сталіся ўсяго толькі лялькамі. У апошняй акалічнасьці, маўляў, і вінаваты мусульманскі сьвет.

У пачатку сьвятарнай вайны зь няверным Усходам і д'ябальскім Захадам бачыць а.Кураеў сэнс сучаснай эпохі ў Расеі, якая нарэшце, паводле яго слоў, зможа адмовіцца ад жавальнай гумкі на карысьць Духу. Пры гэтым акцэнт робіцца ня столькі на сьвятасьці, колькі на вайне. Аўтар прапануе, каб у адказ на шахідызм праваслаўная царква абвяшчала ўсіх загіблых у выніку тэрактаў ахвярамі, перад якімі адразу пасьля пакутніцкай сьмерці расчыняецца райская брама. Такім чынам, айцец Кураеў фактычна заклікае зьняць адказнасьць з уладаў і спэцназу за ўсе будучыя сьмяротныя ахвяры ў барацьбе з сусьветным тэрарызмам. Такім чынам, Расея становіцца духоўным лідэрам хрысьціянства, а Масква, адпаведна, Трэцім Рымам.

Варта падкрэсьліць, што аўтар гэтага «маніфэсту» — ня проста праваслаўны сьвятар, але адзін з найбольш адукаваных тэолягаў сучаснай Расейскай праваслаўнай царквы. Гэта не тэлекамэнтатар Лявонцьеў, якія дазваляе сабе разьвязна, іншы раз нападпітку, вучыць тэлегледачоў маралі й выкрываць амаральную палітыку ЗША. Кураеў карыстаецца аўтарытэтам ня толькі ў рэлігійных колах, але й у інтэлектуальным асяродку (гаварыць пра інтэлігенцыю ў традыцыйным значэньні гэтага слова сёньня ў Расеі наўрад ці выпадае). Гэта не азначае, вядома, што артыкул Кураева заўтра стане афіцыйным маніфэстам праваслаўна-дзяржаўнай ідэалёгіі Крамля. Але думкі, падобныя да выказаных прыхільнікам новага крыжовага паходу на старонках «Известий», усё часьцей сустракаюцца і на старонках іншых газэт, і ў Інтэрнэце, і на расейскіх тэлеканалах.

З адной тэзай Кураева можна згадзіцца. Бэслан сапраўды стаў для Расеі тым рубяжом, за якім няма вяртаньня назад. Альбо яна паспрабуе застацца сьвецкай, адносна дэмакратычнай, хай сабе карумпаванай і бюракратычнай дзяржавай, альбо… Гэта будзе краіна, дзе сьвятары з амбону царквы будуць бласлаўляць хрысьціянскіх ваяроў агнём і мячом вынішчаць «няверных» (ці нерасейцаў), не шкадуючы ні старых, ні малых.

Дык ці гарантуе Беларусі спакойнае, далёкае ад жахаў тэрарызму і войнаў жыцьцё яе цяперашняя дзяржаўная ідэалёгія?

ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

Адміністрацыйная камісія Ленінскага раёну Горадні 8 верасьня аштрафавала на 5 б.в. актывіста прафсаюзу РЭПАМ **Івана Романа** за распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных зьвестак (прафсаюзны бюлетэнь «Шабер»). 14 верасьня міліцыянты ўварваліся ў працоўны кабінэт дэпутата ПП НС **Сяргея Скрабца** ў Лідзе, дзе ён вёў прыём выбарцаў, і канфіскавалі каля 1000 асобнікаў справаздачы пра дэпутацкую дзейнасьць, кваліфікуючы іх як выбарчую агітацыю. У Віцебску 15 верасьня ў сябе дома быў затрыманы **Сьцяпан Цішуцін**: яго падазравалі ў надпісах на сьценах «Не — рэфэрэндуму» і «Галасуйце за Карач». Міліцыянты наладзілі ў яго дома ператрус. Сама дэпутатка Віцебскага гарсавету **Вольга Карач** з кастрычніка стане беспрацоўнай: яе звальняюць з СШ №27, бо скانчаецца абавязковы тэрмін яе працаўладкаваньня як маладой спэцыялісткі. Падчас раздачы бюлетэню «Беларусь: нераскрытыя злачынствы найноўшай гісторыі» каля Пракуратуры Беларусі 16 верасьня былі затрыманы сябар БХК **Гары Паганяйла** і незарэгістраванай «Вясны» **Тацяна Рэвяка**, а таксама рэпарцёр «Інтэрфаксу» **Аляксей Букчын** — на праваабаронцаў склалі пратакол за распаўсюджваньне друкаваных выданьняў без выходных зьвестак. **Валер Леванеўскі** 16 верасьня сьпіню галадоўку: адміністрацыя Гарадзенскага СІЗА выканала ягонае патрабаваньне і выдзеліла яму спальнае месца. На рэдактарку гарадзенскай газэты «Биржа информации» **Алену Раўбецкую** 16 верасьня распачалі адміністрацыйную справу за парушэньне арт.5 Закону аб друку — «распаўсюджваньне зьвестак, якія ганьбяць гонар і годнасьць прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі». Падчас «Шэсьця бяздомных студэнтаў» у Менску 16 верасьня былі затрыманы **Алесь Васілеўскі, Юры Сідун, Сяржук Семянюк**; суды маюць адбыцца 28 верасьня — юнакоў абвінавачваюць у супраціве супрацоўнікам міліцыі пры затрыманьні. Мінюст 16 верасьня накіраваў у Вярхоўны Суд пазоў пра ліквідацыю **Беларускага Хельсынскага камітэту**: падстава — зварот БХК наконт прызнаньня рэфэрэндуму незаконным. У Салігорску падчас акцыі «Хочам ведаць праўду» 16 верасьня былі затрыманы сябар АГП **Яўген Валодзька** і сябар ПБНФ **Уладзімер Пятровіч**. 17 верасьня ў судзе Пятровіча аштрафавалі на 20 б.в., Валодзьку — на 150 б.в., у абодвух у кошт штрафу апісалі маёмасьць бацькоў. Уначы з 16 на 17 верасьня падчас расклейкі самаробных улётак супраць рэфэрэндуму былі затрыманы **Аляксей Чарняеў** і **Алена Валынец-Чарняева** — на іх склалі пратаколы паводле арт.143 КаАП (антысанітарыя). Таварыства «Альянс-мэдыя» (уладальнік Сяргей Атрошчанка) зьвярнулася ў Ленінскі суд Менску з пазовам да газэты **«Народная воля»** наконт кампэнсацыі каля 836 тыс. руб. дадатковых судовых выдаткаў. У Магілёве 17 верасьня падчас распаўсюду газэты «Зубр» былі затрыманы **Мікалай Ільін** і **Яўген Суворaў**. ТБМ зьвярнулася да ўпраўленьня адукацыі Менгарвыканкаму з заклікам спыніць расіфікацыю школ: у беларускамоўных 10-х клясах СШ №168 па-расейску сталі выкладацца 7 прадметаў з 12, падобнае ж назіраецца ў беларускамоўнай гімназіі №17. Падчас канцэрту Вячаслава Бутусава ў Менску ў падтрымку беларускіх музыкаў затрыманы актывісты «Зубра» **Дар'я Малдаванава, Аляксандар Ушко, Мікіта Сасім, Максім Громаў, Тацяна Елавая**, якія ўзьнялі сьцягі арганізацыі, за распаўсюджваньне газэты «Зубр» затрыманы **Алена Корбач, Зінаіда Крыванос, Арцём Салаўёў**. 17 верасьня адміністрацыя РУП «Белаэранавігацыя» паведаміла былому віцэ-прэзыдэнту Беларускага прафсаюзу аэрадыспэтчараў **Алегу Долбіку**, што адмаўляецца працягваць зь ім працоўны кантракт пасьля 1 кастрычніка. У Барысаве падчас раздачы газэты «Зубр» затрымалі **Аляксандра Казакова** і непаўналетнюю **Вікторыю Вайцяховіч**. На калгасным рынку Ліды 19 верасьня падчас распаўсюду ўлётак і бюлетэню «Предприниматель» затрыманы **Зьміцер Леванеўскі**, Валераў сын. 20 верасьня **Вольга Завадзкая** падала заяву ў суд Цэнтральнага раёну Менску на Пракуратуру Беларусі: тая праігнаравала патрабаваньне ўзнавіць крымінальную справу па новаадкрытых акалічнасьцях зьнікненьня ейнага сына пасьля заявы А.Лукашэнкі на прэс-канфэрэнцыі 20 ліпеня. Салігорскі гарвыканкам 20 верасьня адмовіў **Незалежнаму прафсаюзу гарнякоў** РУП «ВА «Беларуськалій» праводзіць 23 верасьня ліквідацыю **Беларускага Хельсынскага камітэту**: падстава — зварот БХК наконт прызнаньня рэфэрэндуму незаконным. У Салігорску падчас акцыі «Хочам ведаць праўду» 16 верасьня былі затрыманы сябар АГП **Яўген Валодзька** і сябар ПБНФ **Уладзімер Пятровіч**. 17 верасьня ў судзе Пятровіча аштрафавалі на 20 б.в., Валодзьку — на

АШ

Беларускі калегіюм

Прапануе дадатковае навучаньне па спэцыяльнасьцях:
— журналістыка;
— найноўшая гісторыя;
— філязофія/літаратура.
Запрашаюцца студэнты старшых курсаў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй. У асобных выпадках прымаюцца й студэнты малодшых курсаў. Навучэнцам БК можа быць толькі той, хто на час навучаньня пражывае ў Менску.
Навучальныя праграмы БК арыентаваныя на выкладаньне найноўшых фрагмэнтаў сучасных ведаў і не дублююць існых праграм дзяржаўных і недзяржаўных унівэрсытэтаў. Сэртыфікат Калегіюму не замяняе дыплёму ад вышэйшай адукацыі. Навучаньне ў БК бясплатнае.
Пачатак заняткаў — з 1 кастрычніка 2004 г.
Запіс на сумоў'е — да 24 верасьня. Абавязковай умовай запрашэньня на сумоўе зьяўляецца падача да пазначанай вышэй даты аднаго альбо некалькіх уласных тэкстаў памерам ня меней як 5000 знакаў. Тэкстамі лічацца як друкаваныя, так і недрукаваныя матэрыялы (журналісцкія, паэтычныя ці празаічныя тэксты, тэксты дасьледчыцкага, рэфэратыўнага ці іншага характару, эсэ на вольна абраную тэму і г.д.). Фармуляваная ўмова ня тычыцца спэцыялізацыі «Найноўшая гісторыя».
Даведкі і запіс праз тэл. 220-29-75 з 14.00 да 18.00 штодня акрамя суботы і нядзелі. Дадатковую інфармацыю пра БК можна знайсьці на сайце http//bk.baj.ru.

Зорка Вэнэра

На сьвітанку над Крапівенскім Полем Бітвы ўзышла Зорка Вэнэра, маці Сусьвету. ...Толькі мы выйшлі з дубровенскага аўтобуса, як з машыны, што пільнавала дарогу на Гацькаўшчыну, высунуліся, пэўна ж, казённыя віжы і папыталіся: «А вы што, тожа бэнээфаўцы?» — «Не», — адказваем і шыбуем далей. Ужо відаць наш сьцяг і дым ад вогнішча. Правільна кіруемся! Пасьля выявілася, што дыміла звалка паблізу Поля, а Сьцяг і папраўдзе быў Нашым — хіба яго можна з чым зблытаць?! А во й першыя ваяры. Вітаюся: «Жыве Літва!» А яны мне: «Здрасьце». Пасьля, мусіць, спахапіліся і зусім ужо няўпэўнена мовілі, што жыве Беларусь. І я ціхенька адказала, што жыве. Ні Арлова, ні Пушкіна, ні Галічавых харыстаў. Адзін толькі Мельнікаў высунуўся з намёту і на маё вітаньне «Жыве Літва» змаўчаў.

І Кулікоўская, і Крапівенская бітвы, і Барадзіно адбыліся 8 верасьня. Добрыя рэчы казаў уніяцкі сьвятар зь Віцебску, чытаючы Эвангельле ля крыжа: хто прыніжаны на зямлі, на Небе ўзьвялічаны будзе. Ва ўсіх гэтых бітвах перамога была атрымана малым лікам, але вялікім паўсталым духам. Маці Сусьвету стаяла пры тых бітвах, бо вызначаўся там лёс нацыяў. Лёс нашай нацыі вызначаецца і цяпер. Ідзе Бітва Сьвятла і Цемры, і няма ні татараў, ні славянаў, ні маскалёў, ні ліцьвінаў, ні французаў, ні расейцаў — ёсьць Сьветлыя і Цёмныя, і Сьветлыя перамогуць.

Зорка Вэнэра ўзышла над зямлёю,
Сьветлыя згадкі з сабой прынясла...

Алеся Наркевіча доўга шукалі, каб уручыць прыз ад радыё «Свабода». Нарэшце знайшлі, папрасілі пасьпяваць яшчэ раз. І ён зноў засьпяваў.

Было шмат беларускай папсы, трохі расейскіх мацюкоў, аднойчы чула покліч «Жыве Літва!». А знэрваваны Андрусь Мельнікаў безнадзейна змагаўся зь ветранымі млынамі, наказваючы не раскідаць плястыкавыя бутэлькі ды іншае сьмецьце на Полі. Ня стаў сьпяваць са сцэны, колькі яго ні прасілі, «Гэта мы!». Казалі, ён сьпяваў пасьля пры вогнішчы.

Ранкам мы рушылі на аўтобус да Воршы, адтуль на электрычку да Менску, а над Крапівенскім полем, як і над усёй Зямлёю, зьзяла Зорка Вэнэра.

Ганна Матусэвіч, Койданава

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

На Першую сустрэчу беларусаў Эўропы 28—29 жніўня, сп.Пятро Краўчанка не «прыехаў з уласнай ініцыятывы», а быў афіцыйна запрошаны намесьнікам старшыні беларускай суполкі ў Празе імя Францішка Скарыны С.Скарулісам.

П-і

Галоўны рэфэрэндум

Сяржук Вінаградаў

З гістарычнае пэрспэктывы прызначэньне рэфэрэндуму 17 кастрычніка выглядае лягічным. Усе аўтарытарныя рэжымы разьвіваюцца гэтак. Спачатку канцэнтрацыя ўлады ў адных руках, потым разбурэньне структур грамадзянскае супольнасьці і, нарэшце, юрыдычнае замацаваньне надюрыдычнага статусу кіраўніка. У нацыянал-сацыялістычнай Нямеччыне такі рэфэрэндум быў праведзены ў 1934 г.

За год да рэфэрэндуму Адольф Гітлер прымусіў райхстаг прыняць «Закон аб паўнамоцтвах», які даў нацыянал-сацыялістычнаму ўраду права выдаваць законы без абмежаваньня парлямэнтам. Такім чынам, Гітлер зрабіўся выбраным дыктатарам. Аднак гэтага яму было мала, і навасьпечаны дыктатар сваімі далейшымі дзеяньнямі растаптаў прынятыя ім жа законы. У 1934 г. Гітлер выдаў дэкрэт аб правядзеньні ўсенароднага галасаваньня, якое насуперак Закону аб паўнамоцтвах мелася надаць асабіста Гітлеру статус адначасова кіраўніка ўраду (райхсканцлера) і кіраўніка дзяржавы (фюрэра). У рэфэрэндуме ўзялі ўдзел 95% выбарцаў, зь якіх нібыта 89% прагаласавалі «за». Вынікам сталася фармальная канцэнтрацыя заканадаўчае, выканаўчае і юрыдычнае ўлады ў руках фюрэра, а войска і чынавенства пачалі прысягаць у вернасьці асабіста Гітлеру.

Менавіта пасьля рэфэрэндуму 1934 г. Гітлер на шостым зьезьдзе НСДАП у Нюрнбэргу абвясьціў пра пасьпяховае завяршэньне нацыянал-сацыялістычнае рэвалюцыі і пачатак новае нямецкае імпэрыі — Трэцяга Райху. Зьезд быў адлюстраваны ў знакамітым кінаопусе Лені Рыфэншталь «Трыюмф волі». Пазьней нацысты праводзілі і іншыя плебісцыты, у прыватнасьці пра далучэньне да Трэцяга Райху Саару і Аўстрыі. Але ж менавіта плебісцыт 1934 г. стаўся тым Галоўным Рэфэрэндумам, які разбурыў прававую дзяржаву, пазбавіў немцаў магчымасьці кантраляваць уладу, зрабіў мажлівымі злачынствы другое сусьветнае вайны і прывёў Нямеччыну да катастрофы 1945 г.

На рэфэрэндуме 1934 г. за наданьне Гітлеру статусу незамяняльнага і надюрыдычнага кіраўніка прагаласавалі 89% выбарцаў, а ўзялі ўдзел у галасаваньні 95% грамадзянаў.

Сучасны аўтарытарызм усходнеэўрапейскага ўзору значна больш падступны і гнуткі за нахабны і безразважны аўтарытарызм мінулага стагодзьдзя. Дзеля выжываньня сёньняшнія аўтарытарныя лідэры выкарыстоўваюць бясьпечныя для іх элемэнты прававое дзяржавы і дэмакратыі накшталт кантраляваных выбараў і такім чынам умацоўваюць сваю спрэчную легітымнасьць. Аднак сутнасьці аўтарытарызму гэты «дэмакратычны фасад» не зьмяняе. Рана ці позна гэтая сутнасьць праяўляецца на Галоўным Рэфэрэндуме, які ўпершыню ставіць пытаньне пра незамяняльнасьць і надюрыдычны статус пэўнае палітычнае асобы.

Абгрунтаваньне тае незаменнасьці можа спасылацца або на патрэбу стабільнасьці, або на дасягненьні мінулых гадоў, або проста на гістарычную непазьбежнасьць. Вынікам заўсёды аказваецца разбурэньне прававое структуры грамадзтва, бо асоба ставіцца вышэй за ўнівэрсальнае права.

Слушна, што прадугледжаныя рэфэрэндумам зьмены ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі будуць дзейнічаць і для будучых кандыдатаў у прэзыдэнты. Але ж бясспрэчна, што канстытуцыйныя зьмяненьні робяцца пэрсанальна пад Лукашэнку, бо ягонае імя фігуруе ў фармулёўцы пытаньня, а прапагандысцкія аргумэнты на карысьць зьмен засяроджваюцца менавіта на асобе ППРБ. Нягледзячы на абмежаванасьць часу для прыняцьця агульнанацыянальных рашэньняў, беларуская грамадзянская супольнасьць мусіла б яшчэ раз узважыць магчымыя вынікі свайго ўдзелу ў рэфэрэндуме. Няўдзел значнае часткі грамадзтва ў Галоўным Рэфэрэндуме — адзіная магчымасьць паставіць пад сумнеў яго легітымнасьць.

siarzhuk.vinahradau@tut.by

Андрэй Лянкевіч

16 верасьня на Кастрычніцкай плошчы ланцугом памяці беларусы адзначылі пятую гадавіну зьнікненьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Людзі з партрэтамі стаялі з гадзіну.

Паверыць у сябе

«Дзень добры! Мабыць, вы ведаеце, што 17 кастрычніка адбудуцца выбары ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу. Па вашай акрузе ад партыі N будзе вылучацца такі і такі. Цяпер трэба сабраць 1000 подпісаў, каб яго зарэгістравалі ў якасьці кандыдата. Для гэтага патрэбны вашы пашпартныя дадзеныя».

Гэтыя словы, паўтораныя шмат разоў, яшчэ надоўга застануцца ў памяці чальцоў ініцыятыўных груп. Ад кватэры да кватэры, ад адных дзьвярэй да другіх, ад дому да дому. Трэба дык трэба. Закон такі. Скардзіцца не выпадае. Ды я й не зьбіраюся. Ня гэта зьнясільвае больш за ўсё. А зусім іншае.

« Вы ведаеце, што адбудуцца выбары?» — «Так, мы ўжо падпісаліся».

«…Ад партыі…» — «Я ў гэтыя гульні не гуляю».

«Па вашай акрузе ад партыі будзе вылучацца…» — «Толькі ўлада яму патрэбна. Больш нічога. Нікому з гэтых ня веру».

У хрушчобе прыблізна ад 60 да 80 кватэр. Няхай будзе 70. Амаль у палове, няхай у траціне кватэр ці дома нікога ня будзе, ці проста не адамкнуць. І калі з рэшты атрымаеш 10 подпісаў — гэта вялікая перамога. Пяць таксама добра. Мо таму з задавальненьнем ідуць у шматпавярховікі. Хоць ня так заўважна тое, чаго заўважаць ня хочаш. Страшна.

Потым, калі трохі супакоішся па дарозе дадому, галаву пачынае сьвідраваць думка, ад якой адмахваешся як можаш. А мо сапраўды ўсё добра? Усіх усё задавальняе. Людзі працуюць, зарабляюць, не шукаюць лішніх прыгод, назьбіраюць трохі грошай ды зьезьдзяць адпачываць на мора, вяртаюцца задаволеныя й сьвежыя. Мо гэта я гультай, шукаю нечага, насамрэч нікому непатрэбнага? Прыдумаў сабе нейкіх ідэй пра дэмакратыю, пра Беларусь і бегаю зь імі, марную свой час, сваё жыцьцё зямное. Навошта, калі большасьці гэта ня трэба? Калі яны ў гэта ня вераць. У што ж яны вераць? Сум.

Але назаўтра на рабоце, калі радыё аб'яўляе пачатак чарговае гадзіны, раптам чуеш нейкі шум. Гэта нездаволеная рэакцыя на навіны або абмеркаваньне ўсёкраіннай сэлектарнай нарады.

— Гэта ж усё падман. Дзе яны ўзялі гэтыя цэны? Як можна пражыць за гэтыя грошы, ці спрабавалі яны? За камунальныя паслугі колькі выходзіць. А паесьці? Добра, што дача ёсьць. А калі дзеці ёсьць? Носіш гадамі, старыя шмоткі даношваеш. Куды паехаць адпачываць, дык нават ня думаеш.

— А чулі гэтую нараду? Гэта ж сьмех. На ўсю краіну мужыкоў ганьбіць. Як дзеці ў школе.

Якое шматслоўе, якое абурэньне. Мімаволі падымаешся, падыходзіш бліжэй, каб падтрымаць, каб завесьці сваю старую песьню. Маўляў, усё правільна, трэба выбірацца з гэтае багны, выйсьце ёсьць, трэба імкнуцца да лепшага, няма чаго пазіраць на прыклады страшныя. Памятаць трэба, але глядзець на лепшых. Што да сэлектарнае нарады, дык тут ня дам згоды. Сьмешнага няма нічога. І ўжо даўно, ад самага пачатку. Брыдка слухаць, нават страшна, маразм.

Мы не злачынцы, якіх трэба кантраляваць і выхоўваць, каб чаго не нарабілі.

Але… Аблом. Размова вельмі хуценька сьціхае. Твары адварочваюцца ад цябе. І хтосьці яшчэ вымавіць: «А хто, калі ня ён?». Пачынаеш даводзіць, што выбар ёсьць, ёсьць праграмы, людзі, нават зь ягонага атачэньня выгнаныя. Называеш імёны, партыі… дый наагул, на трэба змагароў шукаць. Калі праўда за табой, калі бачыш, дзе праўда, дзе падман, і калі ёсьць за што змагацца — змагайся. Бо калі хочаш бачыць гэты сьвет цёмным і робіш яго такім (нават сваім бязьдзеяньнем, што зацягнулася), то цяжка давесьці, што магчымы й іншы варыянт. І не таму, што прыйдзе дзядзя з захаду ці ўсходу, аднекуль, а таму, што зьменімся мы. Бо ня ўсё, вядома, але шмат мы самі можам паспрабаваць зьмяніць да лепшага. Прынамсі, не рабіць дурнога, ня йсьці разам з дурнымі, зьмяняць сябе ў лепшы бок, шукаць лепшых, каб было да чаго імкнуцца. Бесьперапынку кантраляваць тых лепшых… І тут сутыкаешся зь першай паразай. Цяжка перамагчы самога сябе, страх унутры. Няўжо гэта страх? Зноў. Колькі яшчэ? Страх перад чалавекам. Ён страшны? Выходзіць, што так. Толькі што сьмяяліся з калгаснае нарады, а цяпер — ніякіх камэнтароў. І нібы апраўданьне: «А хто, калі ня ён? Мы тых ня ведаем. Дый усё роўна такія самыя — толькі ўлада патрэбна, а як апынуцца наверсе, адразу пазабываюць на свае абяцаньні. Нікому зь іх нельга верыць». Тады што? Даводзіш, што гэта палітыка і, зразумела, палітыкам, каб рабіць штосьці, патрэбна ўлада, так вось сталася, і верыць ня верыць, а выбіраць сярод іх кагосьці трэба. Цішыня.

— …Вы паставіце свой подпіс? Так? Толькі патрэбны вашы пашпартныя дадзеныя.

— Не, ведаеце, тады я… Я яшчэ падумаю.

— Ня варта баяцца гэтага. Наўрад ці хтосьці будзе вылічваць вас. Акрамя таго, усё паводле закону, вы маеце права.

— Не, я баюся.

— А што вам страшней — паставіць подпіс ці жыць яшчэ колькі гадоў пры гэтых… парадках?

І сапраўды, як мы прынізілі сябе. Нам кажуць, што калі б не адна асоба, то не было б тут нічога. Разруха і хаос толькі. Не сабралі б хлеба, ня вылезьлі б нашы прадпрыемствы з багны і нават болей — мы б тады, альбо пэўная частка (трэба разумець, меліся на ўвазе найбольш сьвядомыя «нацыяналісты»), ператварыліся ў тэрарыстаў, і пачалася б тут вайна. Няўжо гэта ўсё пра нас з вамі? Няўжо мы такія дурныя?

Краіна трывае. Але трывае яна хутчэй ня дзякуючы, а насуперак. Бо мы, беларусы (усе, незалежна ад этнічнае прыналежнасьці, усе грамадзяне гэтае краіны), народ годны. Нават мы занадта добрыя ў пэўным сэнсе, бо дазваляем рабіць з намі і казаць пра нас такое, што зусім ня кожны народ здолее трываць. А мы… Маўчым. Колькі яшчэ мы з вамі і кожны з нас паасобку будзем дазваляць? Ці не насьпеў час спытаць у сябе пра гэта? Прынамсі, задумацца над гэтым пытаньнем. Ці ня час нам паверыць у чыстае, сьветлае, каб не паглядаць з-пад ілба на гэты сьвет? Паверыць у тое, што мы здольныя жыць добра й без пастаяннага кантролю зьверху? Што мы не злачынцы, якіх трэба кантраляваць і выхоўваць, каб чаго не нарабілі. Паверыць у дабро. Паверыць у сябе. Паверыць у тое, што заўтра можа быць сонечны дзень. Што мы дастаткова дарослыя, каб рабіць выбар (і нават калі выбіраць няма сярод каго, выбар застаецца — супраць усіх) і каб не дазваляць «першаму-лепшаму» прэзыдэнту зьдзекавацца з нас, прыніжаць і яшчэ чакаць, каб мы яму ў ладкі пляскалі. Зрабіць выбар паміж мінулым і будучыняй. Гэта вельмі цяжка, але ж гэта й вельмі проста. Сумленна, а значыць сьмела зірнуць на гэты сьвет і зрабіць выбар.

Андрэй Ананьеў, Гомель

Пажыцьцёвае прэзыдэнцтва ў сьвеце: прэцэдэнты і вынікі

Туркмэнія. Сапармурат Ніязаў — Туркмэнбашы. Працягвае кіраваць.

Інданэзія. Ахмэд Сукарна. Пажыцьцёвае прэзыдэнцтва абвешчана ў 1963. Вынікі: развал эканомікі, ізаляцыя, вайсковы пераварот.

Намібія. Сэм Нуёма. Абмежаваньні прэзыдэнцкага тэрміну зьняты ў 1998 г. (у якім таксама ўсталявалі дыпляматычныя адносіны зь Беларусяй). Вынік: павелічэньне колькасьці злачынстваў, хабарніцтва, эканамічны рэгрэс.

СССР. Брэжнеў — Генсэк. Застой і маразм.

ВШ

Залесьсе

ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

25 верасьня ў музэі-сядзібе Агінскага ў Залесьсі — «Бэльвэдэр-2004», які адбываецца ў 15-ы раз. Пачатак а 12-й гадзіне. Рэй вядзе капэла Алеся Лася, будзе ладзіцца школа палянэзу ды іншых танцаў, таксама традыцыйны паўночна-афінскі пасьянс. Супольны стол.

Jazz

29 верасьня ў Тэатры юнага гледача выступае Давід Галашчокін і ягоны джаз-квінтэт. Квіткі: 12000—20000.

Выставы

Пах малака

У галерэі «Onik» (вул.Сьвярдлова, 4) **да 7 кастрычніка** экспануецца выстава жывапісу Пётры і Алены Шарыпаў, а галерэя «Мастацтва» (пр.Скарыны, 12) запрашае на выставу твораў Алеся Сушы «Пах малака».

Мартырос Сар'ян

У Мастацкім музэі **да 20 лістапада** працуе выстава твораў Мартыроса Сар'яна — знакавай фігуры армянскага жывапісу мінулага стагодзьдзя. З аграмаднай спадчыны мастака арганізатарамі адабрана 22 жывапісныя работы, 5 акварэляў і 5 малюнкаў з фондаў Дому-музэю М.Сар'яна, Нацыянальнай галерэі Арменіі і збору сям'і мастака. Працы створаны ў пэрыяд з 1902 да 1960-х гадоў. Выстава працуе **да 20 лістапада**.

Стыхія Рушчыца

Тамсама **да 20 лістапада** працуе фотавыстава «Беларуская стыхія Фэрдынанда Рушчыца», а таксама выстава «Графіка і польскі малюнак першай паловы XX ст.» — факсымільныя рэпрадукцыі са збору Нацыянальнага музэю ў Варшаве.

Бардаўская восень

25 верасьня — апошні дзень прыёму твораў і зьвестак пра сябе для ўдзелу ў фэстывалі «Бардаўская восень'2004», што адбудзеца ў Бельску. **1 кастрычніка** а 19-й гадзіне ў актавай залі Дому літаратара адбудзецца праслухоўваньне і адбор кандыдатаў. Зьвязацца з арганізатарамі можна праз тэл.: 642-60-24, Алесь (Менск), +4860-238-39-27, Ігар (Беласток) ці наведаўшы сайт www.sonca.org.

Паляваньне, рыбалоўства і ўпакоўка

З 23 да 26 верасьня выставачны павільён «Белэкспа» (Я.Купалы, 27) запрашае на выставу-кірмаш «Паляваньне і рыбалоўства». **З 28 верасьня да 1 кастрычніка** там жа адбудзецца VI спэцыялізаваная выстава «Сьвет упакоўкі». Упершыню адначасова з выставай праходзяць салёны «Сучасная этыкетка» і «Палімеры і шкло ва ўпакоўцы».

Фарбы каханьня і Шэксьпір

У Палацы мастацтваў **да 3 кастрычніка** працуе выстава «Фарбы каханьня», прысьвечаная 50-годзьдзю Натальлі Чорнагаловай. А **30 верасьня** ў канфэрэнц-залі адбудзецца лекцыя «Загадка аўтарства Шэксьпіра». Пачатак а 18.30. Квіткі: 600—1200.

Рэтраспэкцыя сноў Сяргея Ждановіча

У Музэі сучаснага мастацтва (пр.Ф.Скарыны, 47) **да 1 кастрычніка** працуе выстава фатаздымкаў Сяргея Ждановіча «Рэтраспэкцыя сноў». Квіткі — 2000.

Фотатэрыторыя колеру

У галерэі «Nova» (вул.В.Харужай, 16) **да 8 кастрычніка** працуе фотавыстава Алега Пятрова «Тэрыторыя колеру». Паводле слоў аўтара, «гэтая праца — спроба заняцца не «каляровай» фатаграфіяй, а фатаграфаваньнем колеру. Прычым у гарадзкім асяродзьдзі колеравыя спалучэньні мне ўяўляюцца найбольш цікавымі». Уваход вольны.

Надзея Лівенцава

У Шчамялёўскай галерэі (пр.Ракасоўскага, 49) **25 верасьня** а 16-й адбудзецца адкрыцьцё пэрсанальнай выставы Надзеі Лівенцавай. Акрамя партрэтаў, на выставе будуць экспанавацца натурморты, тэматычныя кампазыцыі, у тым ліку створаныя пад уражаньнем ад экзатычных афрыканскіх падарожжаў. Выстава працуе **да 25 кастрычніка**.

Лес і дрэваапрацоўка

З 28 верасьня да 1 кастрычніка ў выставачным павільёне на Машэрава, 14, адбудуцца дзьве выставы: X Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Дрэваапрацоўка-2004» і X Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Лес. Лесапрадукцыя-2004».

Тэатры

Купалаўскі тэатар

Галоўная сцэна

23 (чц) — «Згублены рай».
24 (пт) — «Я не пакіну цябе».
25 (сб) — «Дзіўная місіс Сэвіджа».
26 (ндз) — «Чорная панна Нясьвіжу».
27 (пн) — «Смак яблыка».

Малая сцэна

23 (чц) — «Балада пра каханьне».
24 (пт) — «Муж для паэтэсы».

Дзённыя спэктаклі

26 (ндз) — «Чорная панна Нясьвіжу».

Опэра

30 (чц) — «Хаваншчына».
2 (сб) — «Мадам Батэрфляй».

Балет

24 (пт) — «Шчаўкунок».
26 (ндз) — «Страсьці (Рагнеда)».
29 (ср) — «Спартак».

Моладзевы тэатар

24 (пт) — «Позьняе каханьне».
25 (сб) — «Жарсьці ў Віндзоры».
26 (ндз) — «На вачох у жаночай берагавой аховы».
28 (аўт) — «Хітрыкі Скапэна».
29 (ср) — «Тойбэле і яе дэман».
30 (чц) — «Хітрамудрая закаханая».

Тэатар імя Горкага

23 (чц) — «Дэтэктар хлусьні».
24 (пт) — «Вольны шлюб».
25 (сб) — «Суцяшальнік удоваў».
26 (ндз) — «Ад'ютант-Ша яго Вялікасьці».
28 (аўт) — «Раскіданае гняздо».
29 (ср) — «Перад захадам сонца».
30 (чц) — «Анджэла і іншыя».

Сучасны мастацкі тэатар

25 (сб), **26** (ндз) — «Мяшчанскае вясельле» .

«Беларускія сэзоны»

27 (пн) — «Карусэль».

«Дзе-я?»

23 (чц) — «Ня бойся быць шчасьлівым».
24 (пт) — «Дазвольце спадзявацца».

Тэатар эстрады

23 (чц) — «Данс-гумар-шоў».
29 (ср) — «Эстрадны кактэйль».

Тэатар беларускай драматургіі

23 (чц) — «Адвечная песьня».
24 (пт) — «Містэр розыгрыш».
25 (сб) — «Адэль».
30 (чц) — «П'емонцкі зьвер».

Віртуозы сцэны

На сцэне ДК прафсаюзаў

28 (аўт) — «Амэрыканскі мадэрн-балет».

Для дзетак

Тэатар юнага гледача

24 (пт) — «Апошняя дуэль». З 15 гадоў.
24 (пт), **29** (ср),14.00 — «Дзень нараджэньня ката Леапольда». З 6 гадоў.
25 (сб), 11.00, 14.00 — «Сястра мая Русалачка». З 10 гадоў.
27 (пн) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сэньярыты Ластаўкі». З 15 гадоў.
30 (чц), 14.00 — «Дарога на Бэтлеем». З 7 гадоў.
1 (пт), 18.00 — «Тарас на Парнасе». З 14 гадоў.
2 (сб), **3** (ндз),15.00 — «Залатое сэрцайка». З 5 гадоў.

Опэра

3 (ндз) — «Пітэр Пэн».

Маладзёжны тэатар

26 (ндз) — «Брыдкае качаня».

Тэатар беларускай драматургіі

25 (сб), **26** (ндз) — «Хрустальны туфлік».

Клюбнае жыцьцё

Наша музыка ў «Алькатрасе»

24 верасьня ў клюбе «Алькатрас», што ў Доме прафсаюзаў, мае адбыцца прэзэнтацыя складанкі «Наша музыка-2». Выступяць «Індыга», «J-Морс», «Iq-48». Пачатак а 19-й. Квіток 7000, у дзень канцэрту — 9000.

Bronx (288-10-61, velcom: 103 і 105)
23 (чц), 22.00 — «Клюбны FUNK чацьвер»: dj Supacide (Denmark).
24 (пт), 22.00 — «Live Jazz»: «Cinema String Quartet».
25 (сб), 23.00 — «Baltic Connection»: djs Benua & Andrius Alien (Happyendless, LT).

Белая Вежа (284-69-22, 239-16-00)
23 (чц), 24.00 — «White Tower Party»: dj Top, dj Bergamo.
24 (пт), 24.00 — дыскатэка «Euroclub»: dj Mixell, go-go.
25 (сб), 23.00 — «Лёндан—Масква—Менск»: dj Bell Brown, dj Тим КустOFF.
26 (ндз), 22.00 — дыскатэка «Europop»: dj Alex.

Гудвін (226-13-06)
23 (чц), 21.00 — жывая музыка: Аркадзь Эскін і яго джаз-квартэт.
24 (пт), 21.00 — жывая музыка: джаз-трыё «N.C.».
25 (сб), 23.00 — «Танцпляцоўка СССР»: dj Basic (Масква).
26 (ндз), 20.00 — жывая музыка. Бліндаж (219-00-10, 671-58-65)
23 (чц), 23.00 — dj Egor.
24 (пт), 23.00 — «Верасьнёўскі абвал»: dj Дуброўская (Масква), dance-show «Дынаміт».
25 (сб), 23.00 — dj Top. Прэзэнтацыя новых верасьнёўскіх кактэйляў, майстар-кляса бармэнаў.

X-Ray (223-93-55)
24 (пт), 22.00 — «Dj-bar» with dj Top.
25 (сб), 22.00 — «Dj-bar» with dj Noche.

Ямайка (252-07-26)
24 (пт), 2.00 — «The Aferparty To Be Continued».
25 (сб), 2.00 — «The Afterparty To Be Continued».

Менская кінаафіша з 24 да 26 верасьня

«Аўрора» (253-33-60)
«Модная мамачка»: **24** (пт) 16.50, 19.00, 21.10; **25, 26** (сб, ндз) 14.40, 16.50, 19.00, 21.10.
«Шрэк-2»: **24** (пт) 16.30, 18.30, 20.30; **25, 26** (сб, ндз) 14.30, 16.30, 18.30, 20.30.

«Берасьце» (272-87-91)
«Эўратур»***: **24** (пт) 14.30, 16.30, 19.00, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 14.30 (іл), 16.30, 19.00, 21.00.

«Дружба» (240-90-13)
«Стэпфардзкія жонкі»: **24** (пт) 18.00 (іл); **25, 26** (сб, ндз) 18.00.
«Модная мамачка»: **24, 25** (пт, сб) 20.00; **26** (ндз) 20.00 (іл).

«Кастрычнік» (232-93-25)
«Шырокім крокам»*** (прэм'ера): **24** (пт) 15.10, 17.00, 18.50, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 15.10 (іл), 17.00, 18.50, 21.00.

«Масква» (223-27-10)
«Шырока крокам»*** (прэм'ера): **24** (пт) 17.40, 19.20, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 14.20 (іл), 16.00, 17.40, 19.20, 21.00.

«Мір» (284-37-71)
«Эўратур»***: **24—26** (пт—ндз) 16.00, 18.00, 20.00.
«Стэпфардзкія жонкі»: **24—26** (пт—ндз) 16.40, 21.00.
«Гульні матылькоў» (прэм'ера): **24—26** (пт—ндз) 19.00.

«Перамога» (223-77-66)
«Шрэк-2»: **24** (пт) 15.20, 17.00; **25, 26** (сб, ндз) 13.40, 15.20 (іл).
«Таемныя агенты»*** (эксклюзіўны паказ): **24** (пт) 19.00, 21.00; **25, 26** (сб, ндз) 17.00, 19.00, 21.00.

«Піянер» (227-64-87)
«Дзяўчына з Джэрсы»: **24—26** (пт—ндз) 15.00, 17.00, 21.00.
«Ліля назаўсёды»***: **24—26** (пт—ндз) 19.00.

«Цэнтральны» (220-34-16)
«Гульні матылькоў» (прэм'ера): **24** (пт) 11.00, 15.00, 19.00; **25, 26** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.00, 19.00.
«Наталі»***: **24—26** (пт—ндз) 13.00, 17.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

Юнаму гледачу

«Аўрора»
«Браток медзьведзяня» (прэм'ера): **24** (пт) 14.30; **25, 26** (сб, ндз) 12.30.

«Берасьце»
«Зачараваная Эла»: **25, 26** (сб, ндз) 12.00.

«Дружба»
«Блізард»: **24** (пт) 12.00; **25, 26** (сб, ндз) 11.00, 13.00.

«Мір»
«Шрэк»: **25, 26** (сб, ндз) 14.00.

«Піянер»
«Кніга джунгляў-2»: **24** (пт) 12.00; **25, 26** (сб, ндз) 10.30, 13.30.
«Эліна, нібы мяне і не было»: **24** (пт) 13.30; **25, 26** (сб, ндз) 12.00.

КІНО Ў МЕНСКУ

Маркота з таемнымі агентамі

Сакрэтныя агенты францускага ўраду (Вэнсан Касэль і Моніка Бэлючы) мусяць патапіць у Марока карабель, які належыць расейскаму гандляру зброяй. Апэрацыя праходзіць пасьпяхова, але дзеяньне робіць круты паварот і агенты ўсьведамляюць, што яны — толькі марыянэткі ў складанай гульні.

Касэль і Бэлючы, якія ў рэальным жыцьці разышліся, у кіно разыгрываюць фіктыўную сямейную пару з адмысловым заданьнем. Бэлючы не баіцца паказацца стомленай, разгубленай, непрыгожай, а Вэнсан Касэль, хаця й выглядае дзейсным і мужным, зусім ня звышчалавек.

Чалавечая прыязнасьць бярэ верх над халоднымі законамі сыстэмы, але адбываецца гэта неяк няўцямна і вяла.

Як і ў іншай францускай карціне «Дэман-палюбоўнік», ствараецца адчуваньне ананімнай карпарацыі спэцслужбаў, ветліва-варожых да чалавека, якія высмоктваюць у людзей жыцьцё і энэргію. Так што карціна адрозьніваецца ад звычайнага трылеру пра падстаўленых агентаў, якія з імпэтам наводзяць шораху ў родных арганізацыях. Пасьля прыгодаў героі Вэнсана Касэля і Монікі Бэлючы проста пакідаюць сыстэму.

«Таемныя агенты» («Agents secrets»)

Францыя—Італія—Гішпанія, 2004, каляровы, 109 хв.

Жанр: Шпіёнскі трылер, драма

Адзнака: 4,5 (з 10)

Карціна пакінула нішу якасна зробленага баевіка, але да аўтарскага кіно так і не дапяла.

Андрэй Расінскі

Белнэт галасуе за любоў

Сакрэт папулярнасьці песьні «Люблю» палягае ў яе аптымізьме.

Адзіны на абсягах Белнэту віртуальны гіт-парад «Тузін гітоў» (http://music.fromby.net) падвёў рысу пад сэзонам 2003—2004. Наведнікі штодзень маглі абіраць найлепшыя творы беларускіх музыкаў. З 60 прапанаваных песень праз два месяцы галасаваньняў засталася дзясятка пераможцаў.

Вынікі «Шалёнага параду» не зьдзівілі. Рытарычнае пытаньне «Калі ня ён, дык хто?» актуальнае ня толькі ў дачыненьні да беларускай палітыкі, але і да рок-сцэны. У дзясятку гітоў трапілі аж чатыры песьні Лявона Вольскага: «Калі ідуць на абардаж» на верш У.Караткевіча — 6-е месца, «Рок-н-рол не ўратуе» (сьвежы гіт «N.R.M.») — 5-е, на трэцяй пазыцыі — навюткая песьня «Турысты» ад «Крамбамбулі», ну, і абсалютны лідэр — «Люблю» з «Крамбамбулі» «Каралёў раёну».

«Люблю» назьбірала 1801 голас (другое месца — за Зьмітром Вайцюшкевічам зь «Я ішоў да цябе» — агулам 1592 галасы). Паводле статыстыкі, яе больш за ўсё і пампавалі з сайту www.music.fromby.net у фармаце .mp3 — 1960 разоў (за пэрыяд «Шалёнага параду»).

Сакрэт папулярнасьці песьні «Люблю» палягае ў яе аптымізьме. Безвыходнасьць і цямрэча ўжо абрыдла. Прынамсі, інтэрнэт-грамадзкасьці дык дакладна, бо ў лідэрах — пераважна песьні вясёлыя і неназойлівыя: «Люблю» і «Турысты» Вольскага, «Rap not dead» праекту «Please, Mr.Schtal», «Баба Лена» ў выкананьні Ігара Варашкевіча (праект «Цмок і малое»), «Дзень без гарэлкі» Аляксандра Памідорава.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Тое, што на першых пазыцыях у асноўным прадстаўнікі альтэрнатыўнай музыкі (тая ж «Крамбамбуля» — альтэрнатыўная эстрада), таксама ня дзівіць, калі ўлічыць, што сярэдні карыстальнік у айчынным сеціве маладзейшы за 25 год. Гэтым можна патлумачыць і 19-е месца Дарафеевай ці 49-е «Беларускіх песьняроў».

Песьня пра Галілея з прэтэнзіяй на «гіт сэзону» ад дуэту «Аляксандра і Канстанцін» чаканьняў не апраўдала і заняла ўсяго 43-е месца. Яшчэ зь нечаканасьцяў — Сярогава «Лялька», беларускамоўны варыянт гіта, што мае цяпер шалёную папулярнасьць ва Ўкраіне, у сябе на Радзіме ня надта папулярная — толькі 23-е месца.

Сяргей Будкін

У ПАВЕТРЫ

Лепшае з таго, што прапануецца пражыць

Восень. Пара, якую чакаю, каб апрануць сваю старую парэпаную замшавую куртку і адшараваныя да бляску чаравікі, адзеньнем канчаткова падкрэсьліць надыход новага сэзону і заняцца адпаведнымі справамі — раскласьці па паліцах разам зь летняй вопраткай яшчэ цёплыя ўспаміны лета, якое канула ў лету. Гэта добра рабіць менавіта цяпер, калі зьнікла сьпёка пачуцьцяў і верасьнёўскі вецер халодным дотыкам цалуе ў твар, пакідаючы на шчацэ сваю срэбную павуцінку. Калі навакольле губляе ненатуральную стракатасьць ды набывае шляхетную стрыманасьць і горад супакойваецца, гатовы да восені.

Улетку жывём, нібы робім кадры на стужцы, якая набыта і запраўлена ў апарат напярэдадні адпачынку. Напачатку, як у ашалелых турыстаў, яна забіваецца процьмай вартых і ня дужа ўрыўкаў бачанага. Пасьля жаданьне схапіць як мага болей патрохі сьцішваецца, рука стамляецца ціскаць кнопку, губляецца ўспамін пра тое, што было на першых кадрах. Гэта значыць, надышоў жнівень.

Восень — час праяўляць нэгатывы лета. У лябараторыі памяці пры мяккім сьвятле лямпы ў сьвядомасці зьяўляюцца фатаздымкі сустрэч, сьвятаў, вандровак, новых і старых знаёмых. Нешта з гэтага мае глянец весялосьці і штучнасьці — такія здымкі-ўзгадкі падобныя да паштовак зь відамі мясцовасьцяў, дзе адпачываў. На іх цікава зірнуць раз-другі і пасьля паставіць за шкло на паліцу, каб час ад часу дэманстраваць іншым у адказ на гэткія ж кідкія фота з чыйгосці чужога лета. Ёсьць і іншыя, з рэтушаванай шчымлівай тугой паверхняй, якія хаваеш асобна ў шуфлядзе і не ўкладаеш разам з астатнімі ў альбом «Вакацыі-2004».

Такія рэчы трапляюцца на стужцы зрэдку, але ўсё ўрэшце робіцца менавіта дзеля іх. Яны праглядаюцца ўвечары, калі ў суседзяў гучна ідзе вечаровы выпуск навін, а ты стаіш на бальконе цёмнае кватэры і, расчыніўшы раму, дыхаеш шэрым небам, зь якога імжыць драбнюсенькі верасьнёўскі дождж. Найлепшыя зь лепшых тыя, якіх ужо ніколі не прадублюеш, — звычайна гэта здымкі тых, з кім ніколі зноў не сустрэнешся. Іх каштоўнасьць невымерная.

У гэтым сэзоне я маю такія рарытэты. Буду праглядаць іх зрэдку і хаваць далей, каб успаміны ня выцьвілі да часу і *яе* вочы на іх даўжэй захоўвалі свой колер…

Восень. Ізноў буду шукаць ня ведаю дакладна што, але зь непахіснай упэўненасьцю, што гэтага ня маю і што мне гэта неабходна. Буду жыць і зьбіраць сілы ў чаканьні чарговае фатасэсіі.

Усевалад Сьцебурака

Мінкульт супраць Быкава

Ужо год Міністэрства культуры не выплачвае рэстарацыі Дому літаратара 2 млн руб. У такую суму абышлася ў чэрвені 2003 г. памінальная вячэра па Васілю Быкаву. Папярэдне міністэрства ўзяло на сябе грашовыя забавязаньні: на адрас рэстарацыі быў накіраваны гарантыйны ліст за подпісам намесьніка міністра Ўладзімера Рылаткі. Аднак пазьней міністэрства затрымала грошы. Дырэктар рэстарацыі Генадзь Збароўскі кажа, што ў міністэрстве яму назвалі прычыну гэткае затрымкі: маўляў, на вячэру пайшла апазыцыя. «Але ж гэта народны пісьменьнік, заслужаны чалавек! А яны паабяцалі і не заплацілі», — абураецца Г.Збароўскі. Г.Збароўскі зьбіраецца падаваць справу ў суд.

Аркадзь Шанскі

НАВІНЫ

«Літара» закансэрвавалася

Спыніў абнаўленьне літаратурны сайт «Litara.net». Апошняя навіна на сайце датуецца 4 жніўня, апошні запіс на форумах — 10 жніўня. Тэхнічны рэдактар сайту Янук Латушка спасылаецца на тэхнічную памылку, якую пакуль немагчыма выправіць. Аўтарка сайту журналістка Аліса Бізяева ад камэнтароў адмовілася. Чытаць жа старыя запісы можна.

Кулінарная гісторыя

Выдавецтва «БелЭн» пачало падрыхтоўку энцыкляпэдычнага выданьня, прысьвечанага гісторыі беларускай кулінарыі: стравы, прадукты, традыцыі спажываньня, культурны кантэкст. Меркаваны час выхаду кнігі — канец 2005 г. Каардынатары выданьня запрашаюць далучацца ўсіх зацікаўленых аўтараў (Алесь Белы — bely@infonet.by, тэл.613-70-85, Валер Пазьнякоў — 284-10-95).

Юбілей Эпімах-Шыпілы

У гонар 145-годзьдзя Браніслава Эпімах-Шыпілы ў Музэі Янкі Купалы адбылася вечарына. Вядзецца падрыхтоўка да выданьня, у якое ўвойдуць ягоная «Хрэстаматыя беларускай літаратуры» (факсымільныя фрагмэнты і поўны адаптаваны варыянт), мастацкія творы й лісты.

Магілёўская «Анімаёўка»

У Магілёве прайшоў VII Фэстываль мультфільмаў «Анімаёўка». У конкурсе ўдзельнічалі 150 стужак зь Беларусі, Украіны, Расеі, Казахстану, Францыі, Літвы й Польшчы. Гран-пры фэстывалю атрымаў расейскі рэжысэр Алег Ужынаў за стужку «Нядобры хлопчык». Узнагароду за ўнёсак у разьвіцьцё беларускай анімацыі атрымала рэжысэрка Ірына Кадзюкова за фільм «Легенда пра лэдзі Гадзіву». Прыз за найлепшы мультфільм для дзяцей атрымала Натальля Хаткевіч («Беларусьфільм»). Упершыню на фэстывалі дэманстраваўся беларускамоўны мультфільм — праца Ігара Волчака «Як Несьцерка знайшоў скарб».

Мілаш он-лайн

Творы Чэслава Мілаша, ягоная карэспандэнцыя і архіў будуць даступныя праз Інтэрнэт — на сайце www.miloszinstitute.com. Гэтым займаецца фонд «Інстытут Мілаша. Архівы й бібліятэкі» («The Milosz Institute. Archives and Library»). Дырэктарка Інстытуту Мілаша, шматгадовая асыстэнтка паэта Агнешка Касіньска паведаміла, што будзе створаны і традыцыйны архіў польскага набэліянта — найхутчэй у Кракаве. Фонд прысьвечаны дзейнасьці ня толькі Чэслава Мілаша, але і ягонага брата Анджэя — кінадакумэнталіста.

Кніга пра армію Андэрса

У Вялікабрытаніі выйшаў раман Клары Фрэнсыс «Бацькаўшчына» («Homeland») пра лёс дэмабілізаваных жаўнераў польскай арміі Андэрса пасьля другой сусьветнай. Дзея адбываецца ўзімку 1946 г. Перайсьці да цывільнага жыцьця вайскоўцам замінаюць ня толькі праблемы з асыміляцыяй у чужой краіне, але і непрыязнасьць да іх з боку ангельцаў, пра якую, як кажа Клара Фрэнсыс, ужо мала хто памятае. Як вядома, у арміі Андэрса было шмат беларусаў.

Новы раман Маркеса

Калюмбійскі пісьменьнік Габрыель Гарсія Маркес пасьля 10-гадовага маўчаньня выпускае новы раман — «Успаміны пра маіх сумных шлюх». Кніга выйдзе мільённым накладам у Гішпаніі. Паводле чутак, галоўны герой раману — стары, які на свой 90-ы дзень нараджэньня замовіў гаспадыні бардэлю прыслаць яму цнатліўку. Падчас сустрэчы стары закахаўся ў дзяўчыну і пачаў прыгадваць іншых прастытутак, у якіх ён быў закаханы.

АВ; БелаПАН, Gazeta.pl

Аляксандар Ворвуль

Слоўнік скептыка

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Абавязак — пераканананасьць навакольных у тым, што толькі вы вартыя вырашаць іх клопаты.

Абраза — словы, якія вы знаходзіце для ворага, які ня можа знайсьці вас.

Абстракцыянізм — мастацтва, якое не выражае анічога самымі выразнымі сродкамі.

Абяцаньне — ветліва адтэрмінаваная адмова.

Аванс — асязальны давер.

Адвакат — чалавек, які можа растлумачыць вам, як зрабіць тое, што забаронена законам.

Адмова — прапанова падняць цану.

Аднадумец — чалавек, які падзяляе вашы забабоны.

Адналюб — чалавек, які абманвае толькі тую жанчыну, якую любіць.

Адпачынак — зьмена прычын стомленасьці.

Адукаванасьць — уменьне выдаваць чужыя думкі за свае.

Адукацыя — сродак набыць забабоны больш высокага кшталту.

Алібі найлепшае — быць ахвярай.

Алімэнты — штраф, які за памылку дваіх плаціць адзін.

Амністыя — велікадушнасьць ураду ў дачыненьні да тых злачынцаў, пакараць якіх яму не па кішэні.

Анэкдот — досьціп тых, у каго няма свайго.

Апэляцыя — гэта калі вы просіце адзін суд праявіць непавагу да іншага.

Аптымізм — доўгатэрміновы недахоп інфармацыі.

Армія — інструмэнт ператварэньня глупства валадароў у пакуты народаў.

Асоба службовая — асоба, якой павінны служыць наведвальнікі.

Асфальт — матэрыял, якім пакрываюць дарогі перад тым, як пачаць земляныя работы.

Атэізм — вынаходка багоў для тых людзей, даць веры якім у іх не хапіла сілы.

Аўтаматызацыя — імкненьне мужчын спрасьціць працу так, каб яе маглі рабіць і жанчыны.

Аўтамэханік — адмысловец, які можа адрамантаваць аўто і ня страціць пры гэтым кліента.

Афарызм — дасканала адрэдагаванае апавяданьне.

Гістарычная фаналёгія беларускай мовы

Выйшла фундамэнтальная праца амэрыканска-ізраільскага лінгвіста Пола Вэксьлера «Гістарычная фаналёгія беларускай мовы» ў беларускім перакладзе. Арыгінальны варыянт зьявіўся яшчэ ў 1977 г. у выдавецтве Гайдэльбэрскага ўнівэрсытэту. Вэксьлерава манаграфія — пакуль адзінае грунтоўнае дасьледаваньне, прысьвечанае гістарычнаму разьвіцьцю гукаў беларускае мовы.

Пераклад ажыцьцявілі Алеся Літвіноўская й Мікола Раманоўскі, навуковым рэдактарам перакладу выступіў праф. Генадзь Цыхун.

Для набыцьця кнігі тэлефануйце 233-44-58.

з пачутага ад настаўнікаў

Я ж думаў, што я разумны...

Ідзе сэмінар сацыяльных пэдагогаў на тэму здаровага ладу жыцьця. Лектарка доўга і нудна гаворыць аб уплыве алькаголю на арганізм чалавека. Урэшце, скончыўшы свой выступ, просіць задаваць пытаньні. Усе маўчаць. Толькі адзін пэдагог-пэнсіянэр цягне руку:

— От вы, Валянціна Іванаўна, казалі: алькаголь і для пячонкі шкодны, і для сэрца. Дык чаму ж, як вып'еш, так добра робіцца?

* * *

Лектарка:

— Усе дзеці, якія кураць, павінны быць на ўнутрышкольным уліку.

Пэдагогі бяруцца за галаву: ізноў трэба сьпісы складаць. Марная праца. Толькі два лысаватыя дзядзькі не сумуюць. Пасьміхаючыся, перамаўляюцца на ўсю аудыторыю:

— Гэта каб ведаць, у каго папяросы страляць.

* * *

Настаўнік у школе заўжды злачынца.

* * *

Чалавек да ўсяго прывыкае, і да пятлі таксама.

* * *

— А чым я ад бамжа адрозьніваюся? Толькі чыстай вопраткай. Дзесяць гадоў у школе працую, а ўласнага жытла няма.

* * *

Жнівень 2000 году. У Бабруйску ня першую ўжо гадзіну цягнецца раённая настаўніцкая канфэрэнцыя. У прэзыдыюме — дэпутат нацыянальнага сходу, прадстаўнікі вобласьці і міністэрства. Напярэдадні настаўнікаў папярэдзілі, каб паводзілі сябе прыстойна.

Вядучая:

— За дасягненьні ў прафэсійнай дзейнасьці грамата ад Бабруйскага райвыканкаму і прэмія ў памеры адной мінімальнай зарплаты ўручаецца...

Настаўнік з залі:

— Вы не ў мінімалках, а ў грашах называйце!

Вядучая:

— Паўтары тысячы рублёў.

Настаўнік:

— Адна бутэлька гарэлкі!

Гучныя воплескі ў залі. Пляшка на той час прыкладна столькі ж і каштавала. Настаўнікам ход канфэрэнцыі відавочна пачынае падабацца.

Вядучая:

— Грамата ад аблвыканкаму і прэмія ў памеры трох тысяч рублёў уручаецца...

Настаўнік:

— Дзьве бутэлькі!

Вядучая ў бок актыўнага пэдагога:

— А таму, хто больш за ўсіх тут выступае, грамата ад Савету Міністраў!

Настаўнік:

— І ні капейкі грошай!

Пад нязмоўкныя воплескі калегаў ён ідзе па сваю ўзнагароду да прэзыдыюму.

Далей ідзе гаворка аб недахопе сродкаў дзяржаўнай датацыі на харчаваньне школьнікаў. А між тым, шмат хто зь дзяцей ходзіць у школу толькі дзеля ежы. Слова бярэ дэпутат і даводзіць адміністрацыям школ, што вучняў трэба смачней карміць, наладзіць санаторнае харчаваньне. Цярпеньне настаўнікаў не бязьмежнае, з залі чуюцца галасы:

— Сядзіць у сваім Менску, а што тут робіцца, ня бачыць!

— Ты, мабыць, на Месяцы жывеш!

Праз некаторы час адна з супрацоўніц аддзелу адукацыі дзеліцца сваімі ўражаньнямі аб канфэрэнцыі:

— Я пакрыўджана на ўсё настаўніцтва раёну.

* * *

У 80-я гады настаўнік вясковай школы выйшаў на пэнсію, уладзіўся вартаўніком на фэрму і гаворыць з сумам:

— Я ж думаў, што я разумны. У школе языком етым лапатаў да вечара. А тут я ля грубкі пагрэюся, пасяджу спакойна, малачка пап'ю, з сабою налью ў слоік. Камбікорму насыплю торбачку. Я ж думаў, што я разумны, а я, аказваецца...

Тацяна Барысік, Магілёў

КАІСА

Пра кампазыцыю і кампазытараў

Нават у часы, калі шахматы прапагандаваліся «зьверху», а на спаборніцтвы прадаваліся квіткі, гэтую галіну трактавалі як Папялушку. Шахматных кампазытараў вінавацілі ў «фармалізьме» сам Міхаіл Бацьвіньнік — першы савецкі чэмпіён сьвету па шахматах. Дык чаго ж чакаць цяпер, у эпоху зацыкленасьці на спартовых выніках... Аўтарам шахматных задач цяжка паставіць задачу накштальт заваёвы 25 мэдалёў. Беларускія творы яшчэ трапляюць у «Альбом ФІДЭ» — найбольш аўтарытэтнае кампазыцыйнае выданьне сьвету, — але ня *дзякуючы*, а *насуперак*.

У краіне рэдка знойдзеш газэту, якая не абвяшчала конкурсу рашэньняў задач і эцюдаў. «НН» не выключэньне; праўда, конкурс у дадатку «Інфарматар» ладзіўся даўнавата, гадоў 8 таму... Скласьці простую задачку на мат за 2 хады можа кожны, хто знаёмы з правіламі гульні. Аднак людзей, якія пастаянна і прафэсійна ствараюць новыя задачы, нямнога — бадай, сотня ва ўсёй Беларусі. Эцюдыстаў на парадак менш: эцюды і складаць, і разьвязваць цяжэй, чым задачы. Творцы й рашальнікі думаюць пра яднаньне, а пакуль гуртуюцца пераважна вакол самвыдавецкага бюлетэню «Альбіна». Бюлетэнь гэты з пачатку 1990-х нястомна памнажае на ксэраксе супрацоўнік Лунінецкага музэю, шахматны трэнэр Вадзім Жылко.

У кампазыцыі, у адрозьненьне ад практычнай гульні, менская прапіска значэньня ня мае. Віктар Волчак, 38-гадовы селянін зь вёскі Касоўшчына Лідзкага раёну, які абыходзіцца без хатняга тэлефона, перамог у трох разьдзелах 8-га чэмпіянату Беларусі па складаньні. Разьдзелы ж гэта такія: задачы на мат за 3 хады, шматхадовыя і на зваротны мат. Якасьць твораў ацэньвалі арбітры з Украіны, Славакіі, Расеі і Польшчы, а таксама слынны беларускі кампазытар Мікалай Бельчыкаў, што жыве ў Барысаве. Вынікі падведзены кагадзе і апублікаваны ў спэцвыпуску «Альбіны» (№ 41—42). Нам застаецца далучыцца да віншаваньняў на адрас Віктара Волчака. Ён перавыканаў норму майстра спорту па шахматнай кампазыцыі — званьне для Беларусі нетрывіяльнае.

ВР

Рашыце задачу



В.Волчак, С.Цырулік. «Springaren», 2001. Мат за 3 хады.

Рашэньне. 1. Фh8! і на кожны рух слана ёсьць выдатны адказ: 1...Сс2 2. Фb2! 1...Сd3 2. Фс3! 1...Се4 2. Фе5! 1...Сf5 2. Фf6! 1...Сg6 2. Фg7!



22 верасьня ў Менску адбыўся Кубак асілкаў СНД і краін Балтыі па паўэрліфтынгу. Усе прызавыя месцы ўзялі латышы. На здымку: бярэ сваю вагу беларус Антон Семчанка.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«НН» дзякуе Кастусю Лашкевічу зь Менску за ўчасную падтрымку.

Кошты на платныя прыватныя абвесткі:

Рэклямныя расцэнкі:
— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.
За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб.
Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.
Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.
Даведкі праз т. (017) 284-73-29

СКРЫНКА

Станіславу А. са Слоніму. Дзякуй за допіс. Друкаваць яго пакуль няма нагоды. Ці маглі б Вы расказаць пра апошнія шахматныя падзеі ў Вашым горадзе?

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

КАНТАКТЫ

Ладзіцца паездка на канцэрт легендарнага гурту «Deep Purple» 21 кастрычніка. Зьвяртайцеся: т.5022143, 2564607, 4006774; электронны адрас w1979@tut.by

Ствараецца фан-клюб беларускай музыкі. Ахвотныя далучыцца і тыя, хто мае прапановы, зьвяртайцеся: 241-24-74 (Янак), w1979@tut.by

Талькоўскі фэст зьбірае сяброў 2 кастрычніка а 13-й гадзіне ў Талькоўскім клюбе

КНІГІ, МУЗЫКА

У клюбе філяфаністаў у ДК МТЗ (ст.м. «Трактарны завод») штосуботу з 11.00 да 15.00 працуе абменна-гандлёвы пункт беларускай музыкі. Вас чакаюць сустрэчы зь вядомымі айчыннымі музыкамі, знаёмства з аднадумцамі, музычныя навінкі, прадукцыя па самых нізкіх цэнах, квіткі на канцэрты. Даведкі: т. 649-08-88, 766-24-25

Куплю «Беларускую энцыкляпэдыю», т.1—3, 6, 7; «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», т.4, 5. Т.: 613-70-85, Алесь

Прадам кнігі: «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», т.1, 2, «Археалёгія Беларусі» ў 4 т., «Беларускія пісьменнікі» ў 6 т., часопіс «pARTisan» 1/2—2. Т.: 283-37-45

Прадам кніжку Аляксандра Афанасьева «Мифы, поверья и суеверья Славян» (3 тамы). Т. 205-97-72. Аляксандар

Новыя кніжныя паступленьні на Румянцава, 13 (Таварыства беларускай мовы). Прыходзьце з панядзелка па пятніцу (12.30—18.30). Т.: 8-029-707-40-01

Прадам кнігі: В.Ластоўскі «Расійска-крыўскі (беларускі) слўнік» (Коўна, 1924), Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска-расейскі слоўнік», В.Ластоўскі «Творы» («Беларускі кнігазбор»), збор твораў В.Быкава ў 6 тамах, 1994, ды інш. Т.: 236-02-15

Прадам кнігі: «Археалёгія і нумізматыка Беларусі» (энцыкляпэдыя), «Этнаграфія Беларусі» (энцыкляпэдыя), «Архітэктура Беларусі» (энцыкляпэдыя), «Кампазытары Беларусі» (энцыкляпэдыя) ды інш. Т.: 236-02-15

Прадам кнігі: «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», т.4, 5, Л.Юрэвіч «Камэнтары», А.Цьвікевіч «Западно-русизм», творы У.Галубка, Я.Дылы, паэзія, пераклад на мову: Гайнэ, Шэксьпір, Уітмэн, Элюар ды інш. Т.: 236-02-15

ПАСЛУГІ, ПРАЦА

Вазьму на рэалізацыю ў Віцебску альбо гуртам беларускае сувэнірнае ганчарства: вазачкі, падсьвечнікі, лепку etc. Электронны адрас: vjasna@tut.by. Т.: 710-54-20, (0212) 24-18-57 (хатні) Міхал

Вырашэньне кампутарных праблем. Т: 264-68-90, 767-03-15

Ангельская і швэдзкая мовы зь беларускамоўнай рэпэтытаркай! Вопыт выкладаньня, замежныя стажаваньні. Т.: 202-97-20, Наста

Якасна выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72, Юры

ПРАДАЮ

Туфлі жаночыя, памер 35, мадэльныя, чорныя, лякаваныя, натуральная скура, абцас 7 см. Б/а адзін раз. Т.: 227-96-24, 551-59-45 (МТС).

ФЭСТ

Парахвіяльная рада й сястрынства катэдральнага сабору сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне заклікаюць вас на Божую службу ў нашай роднай царкве напярэдадні Ўзьвіжаньня ў нядзелю, 26 верасьня 2004 ды шчыра запрашаюць вас на беларускі фэстываль, што адбудзецца ў той самы дзень у рамках міжнароднага кірмашу «Atlantic Antic» у залі й перад будынкам сабору сьв.Кірылы Тураўскага (401, Atlantic Avenue, Brooklyn, NY). Пачатак пасьля сьвятое літургіі, а 12-й гадзіне ўдзень.

У праграме — выступы ведамых беларускіх сьпявачак і музыкаў, беларуская музыка з кружэлак, агульныя танцы для ахвочых, беларускія стравы на продаж у залі й перад будынкам.

Ахвяры пры ўваходзе — 10 даляраў, плата за ежу асобна.

Наведайце, калі ласка, гэтую прыгожую беларускую імпрэзу ды паклічце іншых! Калі ж прыйсьці на фэстываль вам ня выпадзе, падтрымайце яго вашай ласкавай ахвярай, выпісаўшы чэк на St.Cyril of Turau Cathedral з адзнакай «Festival» ды даслаўшы яго на адрас сабору: 401, Atlantic Avenue, Brooklyn, NY, 11217.

Запрашаем на падарожжы
26 верасьня (нядзеля) па маршруце:
Менск—Ішкалдзь—Война—Паланэчка—Завосьсе—Сталовічы—Новая Мыш—Крошын—Менск. Цана 17000.
3 кастрычніка (нядзеля):
Далгінава—Крывічы—Будслаў—Княгінін—Касьцяневічы—Куранец—Вязынь—Краснае—Радашкавічы. Цана 17000.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

26 верасьня запрашаем у вандроўку
«Таямнічая Поўнач»

Будслаў: касьцёл XVI—XVIII ст. з абразом Маці Божай;
Глыбокае: царква і касьцёл, краязнаўчы музэй, старыя могілкі з калёнаю, дэндра-парк;
Удзела: касьцёл XVIII ст, музычная фэерыя;
Мосар: касьцёл XVIII ст., батанічны сад духоўнасьці, кальварыя на могілках.
Кошт вандроўкі — 25000 рублёў.
Т.: 222-88-76, 551-30-75

НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фота-рэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3402. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 22.09.2004.
Замова № .
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а